Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ВЕРАСНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 168 (29537)

## Дзень ведаў прайшоў учора ў Беларусі

**Сістэма адукацыі да пачатку навучальнага года гатова. У краіне будуць дзейнічаць 2940 дзяржаўных установ агульнай сярэдняй адукацыі. Да 1 верасня ўведзена сем новых школ на 6095 месцаў (па адной школе ў Баранавічах, Гомелі, Бабруйску, Стоўбцах, Калодзішчах і дзве ў Мінску). Школы аснашчаны неабходным абсталяваннем, метадычнымі рэкамендацыямі, падручнікамі. Да заняткаў прыступіла каля 1 млн 85 тыс. вучняў, з іх 118 тысяч першакласнікаў. Першы ўрок, які прайшоў 1 верасня ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, прысвечаны тэме «У адзінстве беларускага народа — аснова незалежнай краіны», прымеркаваны да Года народнага адзінства.**

### ЛІЧБА ДНЯ

**На 21,1 %**

*у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас сёлета экспарт беларускіх камп'ютарных паслуг у першым паўгоддзі, склаўшы амаль $1,5 млрд. Такая інфармацыя прыводзіцца ў бюлетэні «Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў студзені — ліпені 2021 года». Доля камп'ютарных паслуг у агульным аб'ёме экспарту за студзень — чэрвень склала 29,9 %. Гэты від паслуг займае другое месца па аб'ёме экспарту пасля транспартных. Экспарт беларускіх паслуг у цэлым павялічыўся за першае паўгоддзе на 17,6 % — да $4,833 млрд. Імпарт склаў $2,671 млрд (павелічэнне на 21 %). Сальда знешняга гандлю паслугамі склалася дадатнае ў памеры $2,162 млрд (у студзені — чэрвені 2020 года дадатнае сальда складала $1,903 млрд).*



### КОРАТКА

**У беларускіх школах уводзіцца факультатыў па правах чалавека. Праграма прызначана для вучняў 3—8 класаў.**

Беларусы заваявалі дзевяць узнагарод па выніках конкурсу «Воін свету» на АрМІ-2021.



З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Дзеці — гэта галоўнае»

## У Дзень ведаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка адкрыў у Бабруйску новую школу




Фота БелТА.

**У школе № 35, што знаходзіцца ў мікрараёне Маладзёжны Бабруйска, учора пачаліся першыя ўрокі. Установа адукацыі можа прыняць у адну змену каля 1020 вучняў, але 1 верасня за парты селі амаль 1100 дзяцей — настолькі запатрабаваная і чаканая гэтая «абноўка» для горада.**

Школу можна назваць сапраўдным адукацыйным цэнтрам. Яна шматфункцыянальная, з сучаснай матэрыяльна-тэхнічнай базай. Як сцвярджае дырэктар Таццяна Васілеўская, такімі ж будуць і падыходы да навучання. Школа мае басейн, трэнажорную залу, лыжную базу, чатыры лінгафонныя кабінеты, два кабінеты інфармацыйных тэхналогій, памяшканне псіхалагічнай разгрузкі для педагогаў, будуць створаны лабараторыі біялогіі, хіміі, фізікі. Для дзяцей з псіхафізіялагічнымі асаблівасцямі развіцця створана безбар'ернае асяроддзе. Усё гэта будаўнікі здолелі асіліць крыху больш чым за год. Зразумела, рабілі ж для сябе, для сваіх дзяцей.

### КЛЮЧЫ ДА ВЕДАЎ

«Для меня асабіста 1 верасня — гэта асаблівы дзень. Я заўсёды прыходжу на такую святочную лінейку з вялікім хваляваннем, дзе б яна ні праходзіла — у самай старой ці новай школе, тэхнікуме, ВНУ, у вёсцы, раённым цэнтры ці сталіцы. Таму што памятаю сябе і вучнем, і настаўнікам. Ведаю, што адчуваюць у гэтыя хвіліны бацькі», — сказаў Прэзідэнт на першай лінейцы ў новай школе Бабруйска.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, для кожнага, ды і для яго, як Прэзідэнта краіны, пачынаецца чарговы перыяд у жыцці са сваімі задачамі, планамі і чаканнямі. ***«І ўся Беларусь цяпер настройваецца на новы працоўны рытм. Таму што дзеці — гэта галоўнае.*** Менавіта вы, якія першы раз ступілі на плошчу гэтага храма ведаў, і тыя, хто рыхтуецца сёння да самастойнага жыцця, задаяце тэмп жыцця ўсёй нашай краіны. Таму што вы — аснова, будучыня любой дзяржавы», — дадаў кіраўнік краіны.

На будаўніцтва ўстановы адукацыі ў маладым мікрараёне Бабруйска патрацілі менш чым год, і яе адкрыццё, паведаміў Прэзідэнт, планавалі толькі зімой. «Мы ж планавалі адкрыць гэтую школу толькі ў снежні. Але і будаўнікі, і мясцовыя ўлады вельмі стараліся завяршыць работы менавіта да 1 верасня. Таму што, як кажуць у народзе, дарагая лыжка да абеду. І вам, вядома, таксама было важна пачаць новы навучальны год у новым будынку. Бо ўсё пачынаецца тут, у школе. Усё наша свядомае жыццё і жыццё горада таксама. Ён жыве, развіваецца, калі, перш за ўсё, створаны ўмовы для нараджэння, выхавання і развіцця дзяцей», — падкрэсліў Прэзідэнт.

СТАР. 2

Педагагічная майстэрня

# НЕРАЎНАДУШНЫЯ, СУЧАСНЫЯ І КРЭАТЫЎНЫЯ

## Як апантаныя настаўнікі ствараюць для сельскіх дзяцей унікальныя магчымасці

**«Кажуць, што ў жыцці чалавека ёсць два шчаслівыя дні: дзень, калі ён нарадзіўся, і дзень, калі зразумеў, навошта. Дык вось, я вельмі спадзяюся, што другі дзень для мяне ўжо наступіў!» — свецціца ад шчасця Вольга ЦЯПКІНА, удзельніца трэцяга набору праграмы «Настаўнік для Беларусі!»**



СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# «Дзеці — гэта галоўнае»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: удасканаленне інфраструктуры раённых дамоў, паліклінік і ўстаноў адукацыі, дзіцячых пляцовак і спартыўных стадыёнаў — галоўнае, на што накіраваны дзяржаўныя праграмы па развіцці малых і сярэдніх гарадоў.

«І сёння ў гэтыя хвіліны ў розных кутках Беларусі сем школ адкрываюць свае дзверы для дзяцей і педагагічных калектываў упершыню. Мы на падыходзе да вашай школы казалі пра тое, ці патрэбна нам яшчэ ў краіне будаваць школы. Мы ўжо пабудавалі колькі трэба. Галоўнае зараз — іх запоўніць. Калі застануцца адзінкі, дзе ў дзве змены займаюцца дзеці, — там мы ў гэтай пяцігодцы вырашым праблемы», — канстатаваў Прэзідэнт.

Ён заўважыў, што ў той жа час некаторыя школы, напрыклад, у цэнтры Мінска, дзе насельніцтва сталее, пустуюць. Таму да будаўніцтва новых устаноў адукацыі неабходна падыходзіць рацыянальна.

***«Я даручыў ураду і міністру, каб грошы патрацілі не на будаўніцтва новых школ, а запаўненне тых, што ёсць. Гэта не на вёсцы, дзе кіламетры неабходна пешшу хадзіць. Гэтыя школы неабходна запоўніць, а сэканомленыя сродкі — і ў адукацыю, і ў ахову здароўя, і ў павышэнне заробкаў настаўнікаў, удасканаленыя базы існуючых школ»,*** — акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы звярнуўся да вучняў, іх бацькоў і педагогаў з просьбай прыходзіць у школу як у храм. «Праходзьце гэты шлях годна. Таму што гэта ваш падмурак на ўсё жыццё. Будзеце вучыцца нармальна, атрымаеце веды — значыць, будзеце канкурэнтныя ў гэтым жыцці, зможаце атрымаць нармальнае працоўнае месца, а значыць, і нармальную зарплату. Калі вы проста пройдзеце школу ўлегцы, у будучыні ні на ўладу, ні на бацькоў не крыўдуйце», — заявіў Прэзідэнт.

Паводле яго слоў, для вучняў 35-й школы не толькі пачынаецца вучэбны год, а закладваюцца традыцыі новай навучальнай установы. «Гэтыя традыцыі застануцца пасля вас і будуць ствараць непаўторную атмасферу школьных будняў. І гэтая атмасфера будзе фарміраваць асобу кожнага дзіцяці, закладзе фундамент яго будучыні», — дадаў Прэзідэнт.

Ён пажадаў настаўнікам знайсці ўнікальны стыль у арганізацыі вучэбнага і адукацыйнага працэсаў, стварыць праекты, якія ўцягнуць у школьны працэс бацькоў, бо ў нейкім сэнсе яны таксама ідуць вучыцца разам са сваім дзіцем. Прэзідэнт заўважыў: «Зрабіце так, каб арганізаваны тут для бацькоў, дзяцей і педагогаў вольны час стаў, як я ўжо сказаў, традыцыяй. Традыцыяй, якая, я спадзяюся, будзе ствараць моду на здаровы лад жыцця. Сёння гэта вельмі актуальна».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што дзецям трэба прышчапіць любоў да спорту, навучыць з маладосці берагчы сваё здароўе. «Бо яно — гарант іх бяспечнай і шчаслівай будучыні», — звярнуў Аляксандр Лукашэнка ўвагу.

Прэзідэнт пажадаў вучням, педагогам і бацькам паспяховага, цікавага і запамінальнага вучэбнага года. Малым, якім толькі трэба адкрыць для сябе свет школьнай навукі, ён параіў знайсці сапраўднага сябра ў асобе настаўніка. «Шукайце гэтага аднаго ў сваім настаўніку. Гэта будзе ваш самы надзейны і адданы сябар. Старшакласнікам і выпускнікам — разумення важнасці ведаў, атрыманых у школе, для дасягнення мэтаў, да якіх яны імкнуцца. Цярпення, сіл, творчага натхнення вашым педагогам. Толькі той, хто ўмее трываць і пераадольваць цяжкасці, зможа дамагчыся поспехаў у гэтым жыцці, у гэтым шалёным свеце, абсалютна незразумелым сёння», — завяршыў Аляксандр Лукашэнка.

Падчас цырымоніі Прэзідэнту перадалі сімвалічны ключ ад школы. Ён у сваю чаргу ўручыў ключ «галоўнаму захавальніку» — дырэктару школы Таццяне Васілеўскай.

Нават у Дзень ведаў пасля прыбыцця ў Бабруйск Прэзідэнт пацікавіўся ў мясцовай улады ходам уборачнай кампаніі і восеньскіх палявых работ. Кіраўнік дзяржавы заслухаў даклад старшыні Магілёўскага аблвыканкама Леаніда Зайца. Уборка каласавых збожжавых ужо завершана. Цяпер галоўная задача аграрыяў — падрыхтавацца да ўборкі кукурузы.

«Наша галоўная цяпер задача — падрыхтавацца да збору кукурузы, каб пазбегнуць дэфіцыту збожжа ў гэтым годзе і не закупляць на баку. Не праблема закупіць, але для гэтага ж грошы патрэбныя», — паставіў задачу Аляксандр Лукашэнка.

Ён пацікавіўся сяўбой азімых, забяспечанасцю мінеральнымі ўгнаеннямі, палівам. Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў таксама рупліва падыходзіць да расходавання сродкаў, што выдзяляюцца на сацыяльную сферу, аддаючы прыярытэт павышэнню дабрабыту работнікаў адукацыі і аховы здароўя.

«Таму трэба думаць, перш чым будаваць (сацыяльныя аб'екты. — **«Зв.»**). Калі трэба, значыць, трэба. Але калі ў нас месцаў дастаткова (сувязь у нас добрая, аўтобусы працуюць), трэба абыходзіцца тымі месцамі, якія ёсць. Гэта датычыцца і аховы здароўя. Трэба паварочваць гэтыя грошы на заработную плату настаўнікам і лекарам. Гэта важна», — заўважыў Прэзідэнт.

## МЯЧ І САЛАМЯНЫ БАБЁР — НА ПАМЯЦЬ

Пасля ўрачыстай лінейкі Прэзідэнт азнаёміўся з матэрыяльна-тэхнічнай базай установы, умовамі для навучання і выхавання школьнікаў. Кіраўнік дзяржавы агледзеў школьную бібліятэку. Кніжны фонд змяшчае 40 тысяч экзэмпляраў, удзел у яго фарміраванні прыняла Нацыянальная бібліятэка. Прэзідэнт спытаў, ці ўпэўненыя спецыялісты, што ў сучасных школьнікаў гэтае месца будзе карыстацца папулярнасцю. Маладыя ўсё часцей аддаюць перавагу рознага роду гаджэтам. У бібліятэцы запэўнілі, што зробяць для заахвочвання вучняў да чытання ўсё магчымае.

Аляксандр Лукашэнка перакананы, што камп'ютары і гаджэты могуць нашкодзіць зроку дзяцей. Акрамя таго, падлеткі да іх прывыкаюць і становяцца псіхалагічна залежнымі.

«Беражыце сваіх дзяцей і старайцеся іх адцягнуць на спорт, яшчэ што-небудзь», — даў параду Аляксандр Лукашэнка.

Затым Прэзідэнт пабываў на ўроку першакласнікаў на тэму «У адзінстве беларускага народа — аснова незалежнай краіны». Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на маладога настаўніка-мужчыну, адзначыўшы, што хлопца з першакласнікамі бачыць упершыню.

Далей Аляксандр Лукашэнка ў спартыўнай зале пазнаёміўся з дзявочай валейбольнай камандай Бабруйска. Дзяўчынкі расказалі пра свае спартыўныя дасягненні і запэўнілі: неўзабаве будуць прадстаўляць сваю краіну на міжнародных спаборніцтвах. «Мы вас чакаем у нацыянальнай камандзе», — пажадаў спартсменкам Прэзідэнт і падпісаў ім мяч.

Падарожжа па школе працягнулася ў медпункце, які абсталяваны працэдурным, стаматалагічным кабінетамі.

Паказалі кіраўніку краіны актавую залу, заняткі па барацьбе ў гімнастычнай зале. Аляксандр Лукашэнка згадаў, як у свой час пачынаў займацца самба. «Вось дзе трэба іх (*здольных спартсменаў*. — **«Зв.»**) адбіраць. Яны ўжо тэхнічны тут», — заўважыў беларускі лідар.

Кіраўніку дзяржавы таксама паказалі клас працоўнага навучання для дзяўчат, сталовую з разнастайным меню для школьнікаў. Закончылася падарожжа ў холе, дзе Аляксандр Лукашэнка пакінуў запіс у Кнізе ганаровых гасцей. На развітанне дзеці падарылі Прэзідэнту сувенір — саламянага бабра. У сваю чаргу кіраўнік краіны ў падарунак пакінуў сертыфікат на мультыборд і 3D-прынтар.

## «ВУЧЫМСЯ АБАРАНЯЦЬ СВАЁ»

Пасля знаёмства са школай Прэзідэнт знайшоў час пагутарыць з журналістамі. Пытанні як звычайна — ад найважнейшых палітычных да жыццёвых.

Адказваючы на пытанне пра патрыятычнае выхаванне, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ўпэўнены ў яго неабходнасці ў школах.

«Мы ведаем, што трэба, і мы гэта будзем рабіць. Мы бачылі, што недапрацоўваем у гэтым плане. Аказалася, не ўсім зразумела», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама дадаў, што ваенрукі ў школах павінны дапамагаць забяспечваць бяспеку ва ўстановах адукацыі. «Галоўнае — бяспека ў школе. Дзеці павінны адчуваць сябе ў бяспецы. Бацькі не павінны перажываць, ці ўсё будзе нармальна ў школе. Ваенрук павінен дапамагчы дырэктару забяспечыць бяспеку ў школе і выхоўваць дзяцей у духу гэтай бяспекі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Ваенна-патрыятычнае выхаванне — гэта сям'я, дырэктар школы, кіраўніцтва школы і ўвесь педагагічны калектыў. Ні адзін ваенны патрыёта не выхавае. Для гэтага павінна быць створана асяроддзе, а ваенныя — як асноўны вінцік у гэтым асяроддзі», — дадаў кіраўнік краіны.

Цікавіліся журналісты і планамі на будучую сустрэчу 9 верасня з Прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным і падпісаннем там саюзных праграм.

«Перш за ўсё хачу падкрэсліць (цяпер жа будуць «вякаць», што здаём суверэнітэт і незалежнасць і гэтак далей): мы больш за тры гады таму, яшчэ ў Сочы, паставілі перад урадамі задачу — зрабіць чарговы крок у нашым саюзным будаўніцтве», — нагадаў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што пэўны час у саюзным фармаце не было прарыўных рухаў, і тады, рэагуючы на патрабаванні народаў, прэзідэнты прынялі рашэнне зрабіць нейкія крокі. Пасля гэтага было выпрацавана больш за 30 дарожных карт для ўзаемадзеяння па розных кірунках.

«Зараз яны ператварыліся ў саюзныя праграмы. Гэта ўжо будуць падпісаныя да выканання дагаворы, а не проста карты. Даручым урадам, калі дамовімся канчаткова з Прэзідэнтам Расіі 9-га, то 10—11 (*верасня*. — **«Зв.»**) урады збяруцца, разгледзяць, прымуць гэтыя праграмы. Потым мы іх зацвердзім на Вышэйшым дзяржсавеце», — патлумачыў кіраўнік краіны.

Прэзідэнт заявіў, што гэтыя саюзныя праграмы вельмі выгадныя для Беларусі і Расіі ва ўсіх адносінах. ***«Ніякай гаворкі пра страту суверэнітэту няма. Мы бачым недахопы ў Савецкім Саюзе, у Еўрасаюзе. Гэта значыць, выбудоўваючы адносіны ў нашым саюзе, мы можам гэтага пазбегнуць. Сёння мы настолькі адукаваныя і разумныя, што, не губляючы суверэнітэту ні Расіі, ні Беларусі, можам выбудаваць такія адносіны, якіх няма ні ў федэратыўных, ні ўва ўнітарных дзяржавах»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены, каб усталяваць цесныя адносіны, краінам не трэба ўключаць у свой склад іншыя дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка расказаў пра саюзныя праграмы на прыкладзе ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва. «У нас, лічы, адзіная армія, аснову якой на заходнім напрамку складае беларуская армія. Не дай Бог вайна, Беларусь уступае ў бойку першая, і адразу ж падключаецца ўся заходняя частка Узброеных сіл Расіі, і мы разам будуем абарону і супрацьленне ворагу», — адзначыў беларускі Прэзідэнт.

Запыталі журналісты і пра Афганістан. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ЗША пацярпелі ў Афганістане фіяска, якое ператварылася ў ганебныя ўцёкі.

У той жа час Прэзідэнт адзначыў, што глабальныя высновы з падзей у Афганістане рабіць рана. Па яго словах, яшчэ няма такой сілы, якая паставіла б Афганістан на калені.

Па яго словах, праблемы Афганістана амерыканцы выкарыстоўваюць для ціску на Кітай, Расію. Таму Прэзідэнт перасцерагае ад папярэдніх вынікаў наконт амерыканскай палітыкі ў Афганістане.

«Нам трэба акуратна ацэньваць сітуацыю ў Афганістане і думаць пра тое, як зрабіць так, каб афганцам было добра. Мы ваяваць там не будзем — ні Расія, ні цэнтральнаазіяцкія рэспублікі. Ніхто не хоча гэтай вайны», — заяўляе кіраўнік краіны.

Ён прыводзіць у прыклад прагматычную палітыку Кітая наконт Афганістана. Па яго словах, кітайцы адразу прапанавалі дапамогу багатай на рэсурсы краіне.

Беларускі лідар расказаў таксама, што беларуска-расійскія вучэнні «Захад-2021» праводзяцца выключна для трэніроўкі ўласных Узброеных Сіл. Ён нагадаў, што ў мінулым годзе прыйшлося фактычна палову арміі прыводзіць у баявую гатоўнасць і выводзіць на заходнія рубяжы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: на гэтым напрамку Беларусь і Расія дзейнічаюць разам. «У нас саюзная армія ў гэтым напрамку з Расійскай Федэрацыяй. Узброеныя сілы дзвюх краін вельмі падобныя, але зладжванне павінна быць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Таму мы і разам павінны вучыцца. Таму што ваяваць нам давядзецца разам. Калі ёсць армія, узброеныя сілы, іх трэба рыхтаваць, аб'ядноўваць разам».

Паводле яго слоў, на тэрыторыі дзвюх краін ад Калінінграда да Уладзівастока будзе задзейнічана вялікая колькасць войскаў. «На ўсіх палігонах. Мы з Пуціным дамовіліся, што я бяру пад кантроль асноўную частку вучэнняў. Яна будзе ў нас у Беларусі. У іх на некалькіх палігонах — да дзясятка палігонаў будзе задзейнічана. Ён пабудзе на сваім палігоне, я — на сваім. І мы паглядзім, наколькі гатовыя і зладжаныя нашы Узброеныя Сілы. У нас адзіная сістэма СПА, адзіная абаронная палітыка», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўнівае: ні на каго не збіраемся нападаць. «Нам чужое не трэба. Але мы вучымся абараняць сваё», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У тэму Прэзідэнт расказаў пра планаваныя пастаўкі ў нашу краіну ўзбраення і тэхнікі расійскай вытворчасці.

«У найбліжэйшы час (я падпісаў пазаўчора распараджэнне) з Расійскай Федэрацыі паставяць нам (не буду казаць, якія грошы і што) дзясяткі самалётаў, дзясяткі верталётаў, самага важнага ўзбраення СПА. Можа быць, нават С-400 купім у іх. Нам яны вельмі патрэбныя, я ўжо пра гэта казаў», — заявіў кіраўнік краіны.

Аляксандр Лукашэнка падзяліўся з журналістамі сваім меркаваннем наконт святкавання дня нараджэння. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, ён спакойна ставіцца да гэтага пытання і не бачыць сэнсу асабліва адзначаць чарговую дату.

Але нават на інтэрв'ю не скончылася рабочая паездка Прэзідэнта ў Бабруйск. На дарозе да ўзлётнай пляцоўкі яго чакалі мясцовыя віхары. Аляксандр Лукашэнка падышоў да натоўпу, павітаўся і крыху пагутарыў з бабруйчанамі.

**Марыя ДАДАЛКА,**
*г. Бабруйск.*

## Каментарый у тэму

**Таццяна ВАСІЛЕЎСКАЯ, дырэктар школы № 35 горада Бабруйска, у размове з журналістамі адзначыла, што ў новую ўстанову прыйшло шмат маладых спецыялістаў і ўжо сёння педкалектыў працуе як адна каманда.**

«Усе гатовыя прыступіць да работы. Чакаем рабят у нашых класах. Школа вельмі сучасная. Усталявана вялікая колькасць прылад, у нас выдатныя майстэрні, спартыўная база, таму мы гатовы сустрэць сваіх першых вучняў», — кажа дырэктар.

Самая вялікая паралель — першыя класы, дзе будуць вучыцца 236 дзяцей. Ад іншых устаноў адукацыі новую школу, па словах яе кіраўніка, адрознівае выдатная матэрыяльна-тэхнічная забяспечанасць.

«Усе класы абсталяваны мультымедыйнымі ўстаноўкамі. У гэтым годзе мы адкрываем спецыялізаваны клас па вольнай і грэка-рымскай барацьбе. Будзем намагацца ўкараняць усе новыя формы і метады ў адукацыйны працэс. Самая галоўная наша «фішка», я лічу, — супрацоўніцтва з Нацыянальнай бібліятэкай. Мы першая школа ў Бабруйску, якая мае доступ да віртуальнай чытальнай залы Нацыянальнай бібліятэкі», — абагульняе Таццяна Васілеўская.

### Наталля КАЧАНАВА — выпускнікам:

# «ВЫ ПАТРЭБНЫЯ СВАЁЙ РАДЗІМЕ»

**Учора пасля рэканструкцыі адкрылася сталічная гімназія № 25. У гаонаровай цырымоніі адкрыцця ўзяла ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.**

Разам з ёй у свяце ўдзельнічалі старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў, старшыня Нацыянальнай акадэміі навук Уладзімір Гусакоў, кіраўнікі Заводскага раёна Мінска розных гадоў, дэпутаты і іншыя пачэсныя госці.



## СВЯТА, ЯКОЕ АБ'ЯДНОЎВАЕ

У сваім прывітальным слове Наталля Качанава адзначыла ролю і значнасць адукацыі ў жыцці кожнага чалавека.

— Дзень ведаў аб'ядноўвае ўсіх нас, бо ўсім, чаго мы дасягнулі ў жыцці, мы абавязаныя сваім настаўнікам, менавіта са школы пачынаецца наш жыццёвы шлях, — падкрэсліла яна.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на тым, што ў нашай краіне створана выдатная сістэма адукацыі, кожны год абнаўляецца яе матэрыяльна-тэхнічная база, будуюцца новыя школы, рэканструююцца і мадэрнізуюцца існуючыя, ствараюцца ўсе ўмовы, для таго каб дзецям было камфортна вучыцца, а настаўнікам — працаваць.

— Паважаныя дзеці, гэтае свята — для вас, першакласнікаў, хто ўпершыню пераступіць парог сваёй роднай гімназіі, — звярнулася яна да самых маленькіх школьнікаў.

Спікер Савета Рэспублікі упэўненая, што гэтая ўстанова адукацыі стане для сённяшніх першакласнікаў роднай, бо ў гімназіі працуе выдатны педагагічны калектыў. Тут малыя знойдуць новых сяброў і таварышаў.

— Ганарыцеся сваёй краінай, любіце яе і любіце сваю родную школу, — пажадала Наталля Качанава.

Акрамя таго, яна звярнулася на адрас будучых выпускнікоў:

— Мне хацелася б сказаць добрыя словы тым, хто сёлета будзе завяршаць свой вучэбны працэс і заканчваць школу. Вызначайцеся са сваёй прафесіяй, спецыяльнасцю, але памятайце: вы патрэбныя сваёй Радзіме, сваёй краіне, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі.

Словы ўдзячнасці ад спікера верхняй палаты парламента прагучалі і ў адрас педагогаў, якім у жыцці сённяшняга грамадства адводзіцца цэнтральная роля:

— Нізкі вам паклон за вашу нялёгкую і няпростую працу, якая патрэбная нашай краіне, любой дзяржаве. Вы ствараеце яе будучае, — падкрэсліла яна. — І зусім нядаўна — на рэспубліканскім педсавеце — Прэзідэнт краіны вельмі дакладна сказаў аб тым, што сістэма адукацыі — гэта апора дзяржаўнасці, а настаўнік — апора дзяржаўнай улады.

Наталля Качанава звярнулася і да бацькоў:

— Вельмі важна, што сёння сям'я актыўна падключаецца да адукацыйнага і выхаваўчага працэсаў, — пераканаая спікер Савета Рэспублікі. — Толькі сумеснымі намаганнямі можна зрабіць усё, каб нашы дзеці выраслі дастойнымі грамадзянамі нашай любімай Беларусі.

І, вядома, якое ж свята абыходзіцца без падарункаў? Наталля Качанава перадала кіраўніцтву гімназіі сертыфікат на набыццё мультыборда, які абавязкова спатрэбіцца ў навучальным працэсе.

## УСЁ САМАЕ ЛЕПШАЕ!

Пасля цырымоніі адкрыцця рэканструяванай установы адукацыі Старшыня Савета Рэспублікі завітала на ўрок да першакласнікаў, кожнаму з якіх падарыла кнігу ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Беларусь — наша Радзіма».

Для пачэснай госці адміністрацыя правяла экскурсію па абноўленай установе адукацыі. Арганізацыя навучальнага працэсу, безумоўна, не можа не ўразіць — тут усё на самым высокім узроўні і з выкарыстаннем найноўшых тэхналогій: мультыборды для інтэрактыўнага навучання, лінгафонныя кабінеты для вывучэння замежных моў, найноўшае спартыўнае абсталяванне ў спартзале і нават інтэрактыўная падлога (з дапамогай яе на занятках па робататэхніцы школьнікі могуць змяніць від дзейнасці і крыху адпачыць).

Як пазней прызналася ў гутарцы з журналістамі Наталля Качанава, умовы, якія створаны ў гэтай школе для навучання, адпавядаюць усім патрабаванням часу:

— Кожны раз, калі я наведваю школы, захапляюся тымі ўмовамі, якія створаны для дзяцей: для таго каб, атрымліваючы веды, яны маглі знаходзіцца ў камфортных умовах, тут ёсць літаральна ўсё, — падкрэсліла яна.

## АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ

Адным з пунктаў падчас наведвання дадзенай установы адукацыі стаў удзел Старшыні Савета Рэспублікі ў дыялогавай пляцоўцы «Навуковы свет Беларусі для маладога пакалення», на якой адбывалася сустрэча з прадстаўнікамі Савета маладых навукоўцаў НАН Беларусі са старшакласнікамі сталічнай гімназіі. Размова атрымалася дружалюбная і вельмі цёплая, бо школьнікі мелі магчымасць задаць Наталлі Качанавай абсалютна любое пытанне і атрымаць на яго шчыры адказ. На жаль, часу на працягліая зносіны было малавата, таму спікер Савета Рэспублікі запрасіла гімназістаў наведаць верхнюю палату парламента, каб пазнаёміць іх з дзейнасцю гэтага інстытута ўлады, яго функцыямі і роляй, а таксама каб мець магчымасць працягнуць цікавую размову.

Акрамя таго, Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала ўзяць удзел у выхаваўча-патрыятычным праекце «ШАГ» (Школа актыўнага грамадзяніна) і прыйсці яшчэ раз у гімназію № 25.

Дарэчы, што датычыцца выхавання грамадзянскасці, у гэтай установе адукацыі паспяхова дзейнічае некалькі музейных пакояў: «Беларуская хатка», гісторыка-краязнаўчы (функцыянуе з 1987 года) і гісторыі адукацыі Заводскага раёна сталіцы (які займеў сваё сталае месца ў абноўленай гімназіі). Усе яны існуюць дзякуючы намаганням няўрымслівай настаўніцы беларускай мовы і літаратуры Аліны Пахвалёнай, якая з'яўляецца кіраўніком усіх гэтых музеяў.

— Усё гэта выхоўвае нашых дзяцей, выхоўвае маладое пакаленне, — падкрэсліла Наталля Качанава пасля знаёмства з экспазіцыямі.

На завяршэнне сенатар пакінула запіс у кнізе пачэсных гасцей, дзе пажадала навучэнцам і педагогам міру, дабра, дабрабыту, высокіх вынікаў на карысць роднай Беларусі.

**Вольга АНУФРЫЕВА,**
**фота БелТА.**

### Пётр Міклашэвіч:

## «ВАЖНА, КАБ ПАКАЛЕННЕ XXI СТАГОДДЗЯ ВАЛОДАЛА ВЫСОКІМ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫМ ПАТЭНЦЫЯЛАМ»

**Пра гэта Старшыня Канстытуцыйнага Суда заявіў на адкрыцці новай школы ў Гомелі. Пётр Міклашэвіч дадаў, што важна, каб яно, гэтае пакаленне, было духоўна і маральна развітым.**

Па словах старшыні КС, дзяржава ўдзяляе асаблівую ўвагу дзецям, падрастаючаму пакаленню, іх інтэлектуальнаму, духоўнаму, фізічнаму і творчаму развіццю. «Органы мясцовай улады прымаюць для гэтага ўсе неабходныя меры. Будуюцца новыя школы, аснашчаюцца сучасным абсталяваннем, мадэрнізуюцца дзеючыя ўстановы. Сёння ў Гомелі адкрылі новую школу, абсталяваную па апошнім слове. Гэта дазваляе на больш высокім узроўні даваць вучням глыбокія веды. Таму што галоўная дзяржаўная задача — каб пакаленне XXI стагоддзя валодала высокім інтэлектуальным патэнцыялам, было духоўна і маральна развітым. Задача выкладчыкаў — выхоўваць сапраўдных патрыётаў, дастойных грамадзян краіны на нацыянальных каштоўнасцях і традыцыях», — падкрэсліў ён.

Старшыня Канстытуцыйнага Суда высока ацаніў аснашчэнне і маштаб новай школы ў Гомелі. «Сустракаючыся з дзецьмі і выкладчыкамі, бачу, што тут сапраўды імкнуцца даць пабольш ведаў вучням і вырасціць дастойных грамадзян краіны», — сказаў ён. На наваселле школы Пётр Міклашэвіч перадаў калектыву мультыборд.

### Аляксандр Вальфовіч:

## «ГЭТЫ ВУЧЭБНЫ ГОД СТАНЕ ДЛЯ СІСТЭМЫ АДУКАЦЫІ ПРАРЫЎНЫМ»

**Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі Аляксандр Вальфовіч прыняў удзел у цырымоніі ўрачыстага адкрыцця новай школы ў Стоўбцах.**

«Ні ў адной краіне, якая па памерах і колькасці насельніцтва падобная да Беларусі, няма такой колькасці ўстаноў адукацыі, як у нас. Дзяржава імкнецца ствараць дзецям у школах такія ўмовы, каб яны адчувалі сябе камфортна; робіць многае, каб развіваць сферу адукацыі, бо маладое пакаленне — залаты фонд Беларусі, — сказаў Аляксандр Вальфовіч. — Гэты вучэбны год стане для сістэмы адукацыі прарыўным. У прыватнасці, у школе з'явіліся кіраўнікі па ваенна-патрыятычным выхаванні, якія будуць выконваць масу функцый: даваць веды дзецям і выхоўваць іх, арганізоўваць спаборніцтвы і экскурсіі па гістарычных мясцінах. Успамінаю свайго настаўніка па ваеннай падрыхтоўцы. Менавіта ён даў мне пуцёўку ў жыццё як афіцэра. Думаю, што такія педагогі ёсць, і яны падрыхтуюць не адно пакаленне патрыётаў».

Дзяржсакратар Савета бяспекі таксама ацаніў новую ўстанову адукацыі ў Стоўбцах. Ён адзначыў, што ў школе ёсць усё, каб выраслі сапраўдных грамадзян. У будынку школы маюцца навучальныя кабінеты і лабараторыі, памяшканні для працоўнага навучання, вучэбна-спартыўныя залы, цір, лыжная база, пакоі для медыцынскага абслугоўвання, рэсурсныя цэнтры, басейн. «З улікам трагічнай падзеі, якая адбылася раней у адной з гарадскіх школ, асаблівая ўвага тут аддадзена сістэме бяспекі», — дадаў Аляксандр Вальфовіч.

### З адкрыццём!

# У вучэбны год — са спартыўным настроем

**Першага верасня — яшчэ адзін дзень у календары, калі можна абазначыць новыя планы і мэты на будучыню. У тым ліку і спартыўныя, для дасягнення якіх у сталіцы з'явіліся новыя пляцоўкі.**

У Мінску адкрыўся абноўлены стадыён Рэспубліканскага дзяржаўнага вучылішча алімпійскага рэзерву. Гэта адзін з падарункаў вучылішчу на 55-гадовы юбілей, які адзначаецца сёлета. З пачаткам новага вучэбнага года педагогаў і навучэнцаў вучылішча віншавалі кіраўнік Нацыянальнага алімпійскага камітэта Віктар Лукашэнка, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі, міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук, кіраўнік АБФФ Уладзімір Базанаў, выпускніца установы алімпійская чэмпіёнка Антаніна Кошаль.

**Ігар ЛУЦКІ** перадаў віншавальныя словы ад Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі працоўнаму калектыву вучылішча. У прывітанні падкрэслена, што за гады працы ўстановы вырасла цэлая плеяда выдатных спартсменаў. «Галоўнае, што вы не толькі выхоўваеце чэмпіёнаў, але і вучыце моладзь любіць Радзіму, даяце сваім выхаванцам пуцёўку ў жыццё», — сказана ў віншаванні ад кіраўніка краіны.

**Сяргей КАВАЛЬЧУК, міністр спорту і турызму,** падкрэсліў, што вучылішча алімпійскага рэзерву — кузня кадраў для ўсяго беларускага спорту: «Жадаю, каб са сцен вашай альма-матар выходзілі новыя чэмпіёны Еўропы, свету, Алімпійскіх гульняў. У вас усё для гэтага ёсць». Актыўны ўдзел у рэканструкцыі стадыёна прыняла Асацыяцыя «Беларуская федэрацыя футбола». Старшыня арганізацыі Уладзімір Базанаў перадаў вучылішчу камплекты формы і мячы.

Новыя спартыўныя пляцоўкі з гэтага вучэбнага года будуць працаваць і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце фізічнай культуры. У дзень ведаў тут адкрылі па адной пляцоўцы для міні-футбола, хакея на траве, валейбола, дзве баскетбольныя пляцоўкі і два тэнісныя корты. Урачыстая перадача сімвалічнага ключа адбылася падчас святочнай універсітэцкай лінейкі, удзел у якой прыняў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Луцкі.

«Я ўжо з першых хвілін адчуў, як наш універсітэт ажывае. Мяне ў гэтым годзе парадаваў прахадны бал на нашы спартыўна-педагагічныя факультэты. І сёлета мы змаглі ажыццявіць ідэю, якую пачалі два гады таму, мы адкрылі спецыяльныя класы па фізічнай культуры. І сёння 17 выпускнікоў гэтых класаў пачнуць сваё навучанне ў нашым універсітэце. Спадзяюся, у будучыні яны стануць выдатнымі трэнерамі», — падкрэсліў **рэктар БДУФК Сяргей РЭПКІН.**

З пачаткам новага вучэбнага года будучых спартыўных спецыялістаў павіншаваў міністр спорту і турызму Сяргей Кавальчук. «Я 46 гадоў назад прыйшоў першы раз у першы клас. І кожны год, наведваючы 1 верасня нашы навучальныя ўстановы, адчуваю асаблівае хваляванне. Хтосьці робіць першы крок у школе, хтосьці — ва ўніверсітэце пачынае паход па веды. І сёння першы крок да прафесіі робяць студэнты БДУФК. І мы з асаблівым нецярпеннем чакаем у нашых спартыўных установах выпускнікоў універсітэта, якія будуць перадаваць свае веды», — падзяліўся міністр. Па словах Сяргея Кавальчука, для першакурснікаў будзе вельмі карысна і цікава вучыцца разам з алімпійскімі чэмпіёнамі і прызёрамі. «Кожны павінен зразумець, што немагчымае магчыма на прыкладзе Івана Літвіновіча, які яшчэ студэнт, але ўжо пакарае алімпійскія вяршыні», — упэўнены ён.

Разам са спортам новы вучэбны год пачалі і сталічныя школьнікі. У штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта прайшоў традыцыйны алімпійскі ўрок. Удзел у ім узялі пераможцы школьнай алімпіяды па вучэбным прадмеце «Фізічная культура». Яны праверылі свае веды ў гісторыі сусветнага алімпійскага руху і беларускага спорту. Падчас урока Беларуская алімпійская акадэмія прэзентавала новы адукацыйны праект — анлайн-школу, дзе кожны школьнік можа атрымаць цікавую інфармацыю пра алімпійскі рух і сусветны спорт. Удачы школьнікам пажадалі ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў. А значыць, вучэбны год будзе паспяховым.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі сакратарыята Савета Рэспублікі выказваюць глыбокія спачуванні Уладзіміру Рыгоравічу Жаўняку, намесніку кіраўніка Прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў г. Мінску, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БРАТА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Жанне Віктараўне Казачонак, старшыні камітэта па ахове здароўя Мінскага гарвыканкама, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# НЕРАЎНАДУШНЫЯ, СУЧАСНЫЯ І КРЭАТЫЎНЫЯ



Летні інтэнсіў стаў для ўдзельнікаў трэцяга набору магутнай эмацыянальнай і інтэлектуальнай перазагрузкай.

## МОЙ ШАНЦ!

Як высветлілася, дзяўчына даўно марыла пра работу педагога. Неаднойчы спрабавала летам уладкавацца ў аздараўленчы лагер у сваім раёне, але туды бралі толькі студэнтаў педагагічных спецыяльнасцяў. А ў Вольгі — эканамічная адукацыя: яна скончыла Фінансава-эканамічны каледж і Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Пяць гадоў працавала бухгалтарам. Прызнаецца, калі рабіла свой прафесійны выбар у 17 гадоў, знаходзілася пад уплывам пэўных стэрэатыпаў, таму каштоўны час быў упушчаны. Здаровы сэнс падказваў, што з марай трэба развітацца, але дзяўчына працягвала шукаць магчымасці, розныя курсы для самаразвіцця. І раптам...

— Мне трапіла на вочы абвестка ў адным з тэлеграм-каналаў пра набор у праект «Настаўнік для Беларусі». Там згадвалася, што стаць яго ўдзельнікамі могуць не толькі выпускнікі педагагічных спецыяльнасцяў і вопытныя настаўнікі — праграма даступная для ўсіх уладальнікаў дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, — трэба толькі прайсці перападрыхтоўку ў магістратуры БДПУ. Я падумала — гэта мой шанц! Так я стала магістранткай, дарэчы, сур'ёзна рыхтавалася да экзамену, на якім атрымала «васьмёрку», — расказвае 24-гадовая Вольга. — Прайшла ўсе этапы адбору. Адным з патрабаванняў было правесці сяміхвілінны ўрок. Давялося імправізаваць і крэатывіць, бо я ж не педагог (*смяецца* — **Аўт.**). Прапанавала на суд экспертаў урок па фінансавай адукаванасці. Потым быў Летні інтэнсіў для ўдзельнікаў трэцяга набору. Для мяне, чалавека, які прызвычаіўся жыць па інструкцыі, бо такая спецыфіка бухгалтарскай работы, усё было дзіўна. У галаве адбываўся кагнітыўны дысананс, калі табе кажуць: самі вырашайце, што будзеце рабіць далей. Можна было выбіраць любы навучальны ці развіццёвы блок, які зацікавіў. А мне, шчыра кажучы, было цікава ўсё. І ў любы момант можна было пайсці з аднаго занятку туды, дзе табе цікавей. У пэўным сэнсе выпрабаваннем для мяне стала работа ў групе. Адной камунікабельнасці і ўмення чуць іншага аказалася недастаткова. Трэба было яшчэ і асабістыя інтарэсы падпарадкоўваць калектыўным. Таму для мяне інтэнсіў стаў сапраўдным скачком уверх. Магчымасцю пазнаць сябе і свае магчымасці...

Сама Вольга родам з Вілейкі. Кажа, што для яе было прынцыповым момантам пайсці працаваць настаўніцай менавіта ў сельскую школу — туды, дзе больш за ўсё патрабуюцца педагогі, і дзе, на жаль, не затрымліваецца моладзь. Школа для яе знайшлася ў Чэрвеньскім раёне.

— І вось з 1 верасня я — настаўніца пачатковых класаў, буду працаваць у вучэбна-педагагічным комплексе «Грабёнкаўскі дзіцячы сад — сярэдняя школа», — усміхаецца шчаслівая Вольга. — Мае вучні — 13 другакласнікаў. Я веру, што гэта менавіта той узрост, калі можна даць штуршок развіццю асобы. Калі дзеці павераць, што яны могуць усё, калі яны вырастуць упэўненымі ў сабе людзьмі, калі не будуць сумнявацца ў сваіх сілах і магчымасцях, то праз колькі гадоў наш свет абавязкова зменіцца ў лепшы бок.

У сваім выбары яна ніколькі не сумняваецца. Кажа: «Я ведаю, што іду туды, дзе павінна быць, і дзе мяне, спадзяюся, вельмі чакаюць. Ведаю таксама людзей з дыпломам аб педагагічнай адукацыі і шчырым нежаданнем працаваць у школе. Мне здаецца, наяўнасць дыплома ў рабоце з дзецьмі — не галоўнае...» Дарэчы, летам яна нарэшце ўсё ж такі атрымала першы педагагічны вопыт: спачатку ў анлайн-летніку, які ўдзельнікі трэцяга набору арганізоўвалі для дзяцей у рамках Летняга інтэнсіву, а ў жніўні працавала выхавальнікам у аздараўленчым летніку афлайн.

— У Чэрвеньскі раён я пераязджаю з мужам. Мы разам ужо сем гадоў, хоць вяселле зладзілі толькі ў студзені бягучага года. Мой каханы чалавек мяне ва ўсім падтрымлівае. Ён па прафесіі — прамысловы альпініст, таму на месцы не сядзіць, ездзіць па Беларусі. Сказаў: «Мой дом там, дзе ты». Праўда, ён яшчэ не ведае, што яму давядзецца ўдзельнічаць ва ўвасабленні ўсіх маіх ідэй у школе, — смяецца Вольга.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Чэрвеньская сустрэча ўдзельнікаў першага, другога набораў, куратараў і метадыстаў.

## 18 АДВАЖНЫХ

Днямі праграма «Настаўнік для Беларусі» адзначыла старт новага сезона. На святочным мерапрыемстве сустрэліся прадстаўнікі ўсіх трох яе набораў. За два гады праграма вырасла да 38 удзельнікаў і 29 школ-партнёраў з вёсак, аграгарадкоў, раённых цэнтраў з усіх абласцей Беларусі.

Удзельнікі апошняга набору прайшлі чатыры этапы адбору, і са 109 кандыдатаў у новы навучальны год і трэці сезон праграмы (2021—2023 гады) ідуць 18 «настаўнікаў для Беларусі» (чатыры з іх без педагагічнай адукацыі ці без вопыту педагагічнай работы).

У новым навучальным годзе праграма прыходзіць у 17 школ, 12 з якіх — новыя школы-партнёры ў Пружанах, Косаве, Тураве, Фаніпалі, Оршы, Беразіно, аграгарадках Дзівін, Турэц, Сар'я, пасёлках Чысць і вёсцы Грабёнка. Яшчэ раней да праграмы далучыліся школы і гімназіі ў Дзяржынску, вёсцы Спонды, гарадскім пасёлку Глуск, аграгарадках Павіцце і Мікулічы.

На працягу двух гадоў удзельнікі праграмы працуюць у рэгіянальнай ці сельскай школе настаўнікамі. Яны вучаць і натхняюць, рэалізоўваюць праекты, адкрываюць новыя напрамкі і вераць у патэнцыял кожнага дзіцяці, у магчымасці яго росту і развіцця. Праграма аказвае ўдзельнікам куратарскую, метадычную, праектную і фінансавую падтрымку, фарміруе актыўную супольнасць настаўнікаў-лідараў, рэалізоўвае адукацыйныя спецпраекты.

Ініцыятарам, ключавым донарам, стратэгічным партнёрам праграмы і заснавальнікам фонда «Новая школа» стаў БПС-Сбербанк, які заключыў з Міністэрствам адукацыі пагадненне аб супрацоўніцтве. Далучыцца да яго могуць любыя кампаніі-донары, што пажадаюць зрабіць свой унёсак у развіццё якаснай адукацыі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. У новым сезоне да праграмы далучыўся і міжнародны брэнд — глабальная кампанія плацежных тэхналогій Visa, якая аказала фінансавую падтрымку на закупку ноўтбукаў для новаспечаных «настаўнікаў для Беларусі». І не толькі...

## ВУЧЫЦЦА Ў ДЗЯЦЕЙ

У рамках урачыстага старту новага сезона адбыліся прэм'ера і абмеркаванне дакументальнага фільма «Быць настаўнікам». Гэта гісторыя пра свядомы выбар, рашучасць і авантурызм, пра любоў, шчырасць і жаданне зрабіць па-іншаму. Гісторыя пра Варвару і Сяргея, якія, не маючы педагагічнай адукацыі, у верасні мінулага года зноў аказаліся ў школе, але ўжо ў ролі настаўнікаў...

Варвара ў школьныя гады марыла стаць ветэрынарам, актрысай, дальнабойшчыцай і... з'ехаць у Афрыку. У студэнцтве спявала ў хоры, валанцёрыла і падарожнічала. Летам 2016-га вырашыла паехаць у Амерыку, каб пажыць і папрацаваць там па праграме «Work & Travel». Дзяўчына хацела пагрузіцца ў чужы свет і культуру не як турыст, а спазнаючы людзей, іх быт і філасофію жыцця.

Скончыўшы факультэт міжнародных адносін БДУ ў 2017-м з дыпломам перакладчыка і спецыяліста па міжнародных адносінах, яна з галавой акунулася ў валанцёрскую рамантыку. Спачатку адкрыла для сябе кінафестываль «Лістапад». Затым разам з педагагічным атрадам «Імпульс» з'ехала ў лагер, да берага Чорнага мора, каб паспрабаваць сябе ў ролі важатай. Сказаць, што зносіны з дзецьмі і падлеткамі ў такім фармаце яе вельмі ўразілі — нічога не сказаць. А калі Варвара Чарнавец даведалася пра праграму «Настаўнік для Беларусі», у яе з'явіўся шанц атрымаць «атрад» не на адну змену, а на цэлы навучальны год. Ці два!

Прайшоўшы вочны адбор, дзяўчына ні секунды не сумнявалася ў тым, што хоча пераехаць у вёску, далей ад сталіцы і інфраструктуры — для яе гэта быў новы цікавы досвед. Прадметам для выкладання абрала англійскую мову і паступіла ў магістратуру, каб атрымаць веды па педагогіцы і метадыцы выкладання. Цяпер яна працуе ў 2-й школе гарадскога пасёлка Глуск, што ў Магілёўскай вобласці. Як вы думаеце, ці магла такая яркая асоба не зацікавіць вучняў?

У Глуск дзяўчына адправілася не адна. Яе партнёрам па праграме і калегам стаў Сяргей Макарэвіч, выпускнік БДЭУ. Хлопец доўга сумняваўся, падсвядома прымяраў на сябе ролю настаўніка. «А калі напярэдадні дэдлайну мне зноў трапіла на вочы паведамленне пра адбор, то я быў ужо маральна гатовы адважыцца ў ім паўдзельнічаць. Увогуле, для мяне ўдзел у праграме стаў своеасаблівым выклікам, — канстатуе ён. — Так, у мяне былі пэўныя веды, цікавасць і жаданне развівацца, але разам з тым былі і сумненні, ці атрымаецца ажыццявіць свае задумы. Ці здолею я дасягнуць пастаўленых мэт? Безумоўна, удзел у праграме — гэта не толькі гісторыі поспеху, але і пэўныя цяжкасці, якія даводзіцца пераадольваць штодня. Тым не менш, я спрабую ўспрымаць іх не як праблемы, якія абцяжарваюць і прымушаюць апусціць рукі, а як стымул, які дае магчымасць расці і ісці далей, нягледзячы ні на што». У школе Сяргей таксама выкладае англійскую мову.

Цікава, а як адважыўся дырэктар школы прыняць да сябе адразу двух маладых людзей без педагагічнага досведу?

— Пачуўшы пра праграму «Настаўнік для Беларусі», я адразу ўявіла ў нашай школе маладога настаўніка-энтузіяста, крэатыўнага інтэлектуала з новым мысленнем і новым падыходам да адукацыйнага працэсу. Да таго ж, з-за пандэміі са школы сышлі нашы паважаныя і вопытныя педагогі-пенсіянеры. Дзе знайсці настаўнікаў на 40 (!) гадзін па замежнай мове? Падала заяўку ў праграму і... атрымала адразу двух спецыялістаў, — расказвае **дырэктар сярэдняй школы № 2 гарадскога пасёлка Глуск Алена СЛІЧОНАК**. — Ці спраўдзіліся чаканні? Адназначна. Граматныя і старанныя, сучасныя і смелыя, яны любяць дзяцей, а дзеці любяць іх. Вядома, спачатку былі складанасці і нават слёзы. Варвара вельмі перажывала, што штосьці не атрымліваецца, не ведала, як матываваць да вучобы сельскіх дзяцей, якія не разумеюць, навошта ім замежная мова. А я супакойвала: «Рабі так, як рабілі твае любімыя настаўнікі, і не рабі тое, што табе не падабалася». Зразумела, хтосьці скажа, што «ім не хапае вопыту». Але ж ці гэта галоўнае? Сапраўдны педагог — той, хто вучыць і вучыцца разам з дзецьмі. І нашы «настаўнікі для Беларусі» менавіта такія. Мы самі вучымся ў іх па-іншаму рэагаваць на поспехі і няўдачы.

**Новы набор на чацвёрты сезон «Настаўнік для Беларусі» (2022—2024) стартуе восенню. Сачыць за навінамі праграмы можна на сайце http://teach4.by**

Заўважу, што Глуск — дастаткова камфортнае для моладзі месца. Варвара і Сяргей узрадаваліся, калі даведаліся, што ў нас можна наведваць басейн і трэнажорную залу, што ёсць Цэнтр культуры і адпачынку, можна ўзяць напракат і ролікі, і веласіпед, і скейт. Але яны не падазравалі, што ў іх проста не будзе на ўсё гэта часу (*смяецца* — **Аўт.**).

Ведаю, што ў маладых шмат задумак і планаў, мяркую, што ўсё ў іх атрымаецца і па-за межамі праграмы. У дзіцячых сэрцах яны ўжо занялі сваё месца. А мы сваё партнёрства сёлета яшчэ пашыраем: удзельнікам праграмы «Настаўнік для Беларусі» стаў выпускнік нашай школы, а цяпер настаўнік хіміі Віктар Фясько, які зімой вярнуўся дамоў са сталіцы, дзе выкладаў у каледжы. Таксама да нас едзе настаўнік рускай мовы Ганна Алёхна, наша зямлячка, удзельніца другога набору. Таму дзякуй усім, хто столькі сіл аддае гэтаму выдатнаму праекту...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота арганізатараў праекта.**

# У ПОШУКАХ СВАЙГО ПРЫЗНАЧЭННЯ,

## або Дзяцінства як прафарыентацыя

***Спачатку Мішка хацеў быць кіроўцам. Сядзеў на падлозе і катаў машынкі па канапе, стале, крэслах... Прыкладна ў два гады ён заўважыў, што ў яго новага ровара ёсць «вялізныя» колы. Гэта было сапраўднае захапленне, калі ў яго атрымалася паехаць самому. З таго часу сын перасоўваўся па кватэры толькі на сваёй «машыне», балазе яна была трохколавая і зусім невялікая. Яму — задавальненне, а нам з артапедам — шчасце: педалькі ровара ён круціў голымі ножкамі, і гэта стала прафілактыкай плоскаступнёвасці. Вядома, потым былі і паездкі з татам на маршрутным таксі, і «прыліплыя» да кабіны кіроўцы аўтобуса ці тралейбуса далонькі...***

*Міша быў упэўнены, што яго лёс — гэта круціць «абаранак». Але ўжо ў старэйшай групе дзіцячага садка малога зацікавіла жыццё ахоўнікаў правапарадку — з пагонямі, перастрэлкамі, заблытанымі расследаваннямі... Вядома, вельмі стала не хапаць юнаму «міліцыянеру» якога-небудзь Рэкса, які абавязкова павінен быў стаць верным кампаньёнам ва ўсіх хлапечых прыгодах. Так дома ў нас з'явіўся шчанюк Бім, цудоўны дварняк, выратаваны валанцёрамі ад немінучай смерці. Мішка і Бім сталі найлепшымі сябрамі. Яны разам умелі проста за хвіліну развярнуць усю кватэру, ганяліся адзін за адным, «выпадкова» знішчаючы мяккія цацкі сясцёр, і нават прахodзілі «паласу перашкод» з табурэтаў і невялікіх дзіцячых сталоў. Трэшчынку іх сяброўства дало пасля таго, як малады сабака рушыў услед за сваім інстынктам і... загубіў маладога голуба Харві. Птушаня мы падабралі на дарозе, дзе яго ў любы момант магла раздушыць машына. Здавалася, ён вось-вось навучыцца лётаць, толькі трэба трохі падкарміць. Міша як ніколі быў далікатны з новым гадаванцам. Менавіта ён карміў яго, выходжваў і вучыў лётаць па пакоі. Але аднойчы Бім уварваўся ў пакой і... Міша рыдаў, калі вырываў з пашчы здзічэлага сабакі птушачку. Ён спрабаваў выратаваць голуба: грэў яго, тармасіў і абдымаў. Але, на жаль, Харві нерухома ляжаў на яго дзіцячых далонях.*

*У класе другім Мішка выявіў, што гатаваць ежу вельмі цікава. Так у нас дома з'явіўся пах падгарэлых на патэльні яек і дзіўнай формы пячэнек. Хлопец не пакідаў ідэю стаць служыцелем закона, але яго ўсё мацней прыцягвала выпечка. Неўзабаве ў нас дома сталі з'яўляцца цудоўныя водары круасанаў, тварожнікаў і булачак. Поварам Міхаіл вырашыў стаць, калі ўсе дамашнія проста звар'яцелі ад смаку ў торціка «Твікс», які ён прыгатаваў для таты на дзень нараджэння.*

*А потым мы пагадзіліся выхадзіць кацяня. Маленькай кошцы на пэўны час патрэбен быў асаблівы догляд. Трэба было некалькі разоў на дзень прамываць ёй хворыя вочкі і закладваць лекі. Мішка ўзяў на сябе гэты абавязак. Роні, так ён назваў кацяня, проста жудасна драпалася, вырывалася і кусалася, калі яе даставалі з пераноскі і неслі на працэдуры... Але паступова яна прывыкла да Мішкавага паху і рук і ўжо сама выходзіла са свайго доміка адразу, як толькі чула яго голас... Неўзабаве знайшліся новыя гаспадары для Роні, але ў іх кацяня захварэла і памёрла. Для Мішкі гэтая навіна стала ўдарам. Яму здавалася, што калі б ён яшчэ трошкі патрымаў у сябе Роні, то яна б адужала і не захварэла. Так Міша ўсвядоміў, што з яго, напэўна, атрымаецца таленавіты ветэрынар. Сёння сын перайшоў у сёмы клас. Кожная яго раніца пачынаецца з прагулкі з Бімам, якому ён даравáў выпадак з Харві, бо ўжо начытаўся пра інстынкты жывёл. У хлопчыку бачаць свайго абаронцу і карміцеля нашы каты. Ён можа забыцца зрабіць урокі, прыбраць у пакоі, пайграць на гітары, але не забудзе патэлефанаваць разоў сто мне на работу, каб нагадаць, што катам і сабаку трэба падкупіць корму або што прыйшоў час прафілактыкі глістоў. Так і пражываю з сынам яго цікавыя прыгоды ў пошуку сябе і свайго прызвання. А калі раптам у яго з'явіцца новае захапленне, то ўхаплюся за яго і назаву гэта будучай прафесіяй. Так бы мовіць, своечасова накірую бурную энергію ў патрэбнае рэчышча.*

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Сямейная газета

Выпуск № 16 (175)

Дынастыя

## Васіль СУМАРАЎ:

# «ПАЛАТНО НЕ ПАДМАНЕШ»



**Ён умее разглядзець цудоўнае ў штодзённым, захапіцца ўбачаным, размаляваць свет у яркія колеры і навучыў гэтаму звыш тысячы таленавітых дзяцей і абедзвюх дачок.**

**Карціны выдатнага беларускага мастака Васіля Сумарава рэалістычныя і па-майстэрску напісаныя, часам нагадваюць, аднак, лубок або велікоднае яйка. Іранічная інтанацыя, добры гумар і мажорны каларыт на такіх палотнах ператвараюць нават пейзаж або бытавую сцэнку ў святочнае дзейства.**

### «МЯНЕ ЎДАРЫЛА ТОКАМ»

«Мы родам з дзяцінства», — заўважыў вялікі рамантык Антуан дэ Сент-Экзюперы, і гэты афарызм — нібы ключ да разгадкі творчасці Васіля Сумарава. Будучы заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі нарадзіўся ў Мінску ў 1938-м у доме на вуліцы Беларускай, які ператварыўся потым у «чырвоны квадрат», населены суседзямі, роднымі і ім самім у трох абліччах, на яго знакавай карціне «Мой дом».

Бацькі, Фёдар і Марфа Сумаравы, працавалі на чыгунцы. Праз тры гады ў сям'і, услед за старэйшым сынам і дачкой, з'явіўся малодшы, а праз некалькі дзён пачалася Вялікая Айчынная.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

# РЫЗЫКА... НА ЎЛАСНАЙ КУХНІ,

## або Як засцерагчы дзіця ад траўмы?



**Кватэра з небяспечнымі месцамі ў адным пакоі — так выглядаюць мадэльныя цэнтры па прафілактыцы дзіцячага траўматызму ў быце, створаны на базе ўстаноў аховы здароўя ў абласных і некаторых буйных гарадах Беларусі. Малыя ў першыя чатыры гады жыцця атрымліваюць траўмы, проста з дзіцячай непасрэднасцю спазнаючы навакольны свет. Задача дарослых — зрабіць такое вывучэнне максімальна бяспечным. Штогод у краіне траўміруецца больш за 8000 дзяцей, прычым большая частка выпадкаў — траўмы, атрыманыя ў быце.**

# РЫЗЫКА... НА ЎЛАСНАЙ КУХНІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Цэнтры абсталяваны прадметамі хатняга ўжытку і мэблі, якія могуць уяўляць патэнцыяльную рызыку для малых; цацкамі і дзіцячымі прыладамі. У адным пакоі адбудаваны фрагменты жылых памяшканняў: кухні, санвузла, спальні, прыхожай. Кожная з гэтых частак жылля паказвае, дзе малога падсцерагаюць непрыемнасці. У гэткай «міні-кватэры» наглядна дэманструецца, дзе павінны стаяць прас і патэльня, як павінны быць зачыненыя дзверы і вокны, куды пажадана класці дробныя цацкі. Дэманструецца магчымая небяспека ад халадзільніка, пліты, разеткі.

Галоўная мэта цэнтраў — навучыць бацькоў фарміраваць бяспечную прастору вакол дзяцей, каб яны ўмелі бачыць патэнцыяльную небяспеку і папярэджвалі магчымыя здарэнні да таго, як здарыцца няшчасце, адзначаюць спецыялісты. Адна з першых такіх устаноў, што адкрылася ў краіне, знаходзіцца ў сталічным РНПЦ «Маці і дзіця», расказала **Алена УЛЕЗКА, намеснік дырэктара па педыятрыі цэнтра:**

— У нашым цэнтры мы збіраем на інтэрактыўныя заняткі па прафілактыцы дзіцячага траўматызму ўсіх жадаючых: і матуль, і цяжарных. Гэтая методыка карыстаецца поспехам сярод бацькоў, бо дарослыя часта проста не ўмеюць заўважаць рызыку, якая можа прывесці да траўмы ці гібелі малога. А тут яны, апроч усяго, не проста слухаюць пра рызыку, а могуць наглядна бачыць, дзе ў кватэры хаваецца небяспека для дзіцяці.



Пра тое, як бяспечна даглядаць дзяцей, бацькам і бабулям ды дзядулям расказваюць, як правіла, медыцынскія сёстры, якія самі прайшлі навучанне ў цэнтрах. Слухачы даведваюцца пра небяспеку праглынання дробных прадметаў, абварвання кіпенем, атручвання бытавымі хімічнымі рэчывамі ці таблеткамі, падзення з вокнаў ці спавівальных столікаў.

Спецыялісты часта раяць бацькам паглядзець на кватэру вачыма малога: апусціцца на карачкі і ацаніць, да чаго можна дацягнуцца. Так становіцца відаць, напрыклад, што са стала вытыркаюцца забытыя нажніцы або звісае шнур ад праса, пад канапу закацілася батарэйка ці таблетка, каля батарэі хаваюцца скінуты аловак і лісток ад хатняй расліны...

Нават калі «прасунутыя» бацькі пераўтварылі сваё жыллё ў цытадэль бяспекі яшчэ да нараджэння дзіцяці, трэба быць на варце ўвесь час, бо прычыны траўматызму хаваюцца яшчэ і ў свядомасці мам і татаў. Да гібелі могуць прывесці нават такія дробязі, як сумесны сон у ложку з бацькамі, надзетая на час сну шапачка з завязкамі ці моцна зафіксіраваная коўдра, «каб не раскрыўся, бо замерзне». Яшчэ бацькі часта не заўважаюць небяспекі ў новых для дзіцяці месцах (у гасцях у сяброў, бабулі, суседзяў). А бадай што самае фантастычнае апраўданне, калі нешта здараецца: «мы не думалі, што ён ужо гэта ўмее».

Найчасцей трапляюць у непрыемнасці менавіта самыя дасціпныя і цікаўныя малыя. Аднак нельга думаць, што пасля трох гадоў справа наладжваецца і за дзецьмі можна ўжо не сачыць так пільна. Згодна са статыстыкай, траўматызм малых ва ўзросце ад трох да шасці гадоў павялічваецца ў тры-чатыры разы, а ў падлеткаў — проста пік па калецтве сябе.

Дзякуючы шматгадовай рабоце медыцынскіх структур краіны, Беларусь займае 25-ы радок у сусветным рэйтынгу найбольш камфортных для мацярынства краін і ўваходзіць у 50 найлепшых краін свету па арганізацыі і вядзенні: цяжарнасці і родаў, падкрэсліла спецыяліст. Навучанне ў цэнтрах могуць прайсці не толькі будучыя і існуючыя мамы і таты, але і супрацоўнікі паліклінік, дзіцячых садкоў і іншых устаноў, дзе даглядаюць дзетак ранняга ўзросту.

Шчаслівая сям'я

# БЯСПЛАТНЫ ДОМ, РЭПРАДУКТЫЎНАЕ ЗДАРОЎЕ І СТАЛІЧНЫЯ ДАПЛАТЫ

## Што яшчэ трэба зрабіць для стымулявання нараджальнасці?

**Умацаваць дэмаграфічны патэнцыял і інстытут сям'і ў найбліжэйшую пяцігодку збіраюцца ў Беларусі ў межах праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2021—2025 гг. Для гэтага мяркуюць стымуляваць нараджальнасць у сем'ях, дзе няма дзяцей. Уводзіць дадатковыя дыферэнцыраваныя стымулы для нараджэння другіх і наступных малых, а таксама пашырыць праграму сямейнага капіталу.**



### Прэферэнцыі для шматдзетных і сямей з інвалідамі

За апошнія дзесяцігоддзе колькасць шматдзетных сямей у краіне вырасла амаль удвая. Лідары ў гэтым кірунку — Брэсцкая вобласць, Міншчына і сталічны раён (штогод ён прырастае на шэсць-восем тысяч чалавек), расказала **Валянціна КУРСЕВІЧ, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Урад забяспечвае стабільнае функцыянаванне сацыяльнай сферы, практычна ўсе дапамогі і выплаты адбываюцца своечасова. У такі няпросты перыяд нельга дапусціць зніжэння росту дабрабыту насельніцтва. Важным пытаннем з'яўляецца забеспячэнне жыллём шматдзетных — апошнім часам з дзяржпадтрымкай жыллёвыя ўмовы палепшылі каля 34 тысяч такіх сямей.

Надалей дзяржава збіраецца ўдасканальваць дзяржпадтрымку шматдзетных. Прынамсі, бясплатна выдзяляць сем'ям з траімі і больш малымі ўчасткі для будаўніцтва дома. Прадугледжваецца і павелічэнне будаўніцтва арэнднага жылля.

— Наша камісія працавала над законапраектам аб дзяржпадтрымках сямей, якія выхоўваюць дзяцей, дзе прадугледжвалася падтрымка найбольш уразлівых катэгорый насельніцтва і сямей, дзе бацькі ці дзеці — інваліды. Уведзены прэферэнцыі для сямей з малым-інвалідам, каб той з бацькоў, хто даглядае дзіця, мог працаваць на 0,5 стаўкі, — падзялілася дэпутат.

Двухтыднёвы адпачынак, які летась сталі даваць нашым татам для догляду нованароджанага (у першае паўгоддзе жыцця), пакуль не карыстаецца высокай папулярнасцю. Спецыялісты мяркуюць, што жаданне бацькоў стрымліваецца тым, што такі водпуск па законе не аплачваецца, а яго поўная ці частковая аплата або больш падоўжаны тэрмін можа забяспечыць толькі работадавец, што адбываецца рэдка.

### Бясплатнае ЭКА і дынамічнае назіранне

Дэмаграфічнае пытанне вырашаецца праграмай «Здароўе народа і дэмаграфічная бяспека Рэспублікі Беларусь на 2021—2025 гады», дзе шмат увагі ўдзяляецца абароне сямей, якія выхоўваюць дзяцей. Жыццёвыя пытанні важна адлюстраваць і ўмацаваць заканадаўча, каб забяспечвалася рэпрадуктыўнае здароўе сям'і, яе эканамічны стан, выхаваўчая роля, упэўнена **Святлана АДЗІНЦОВА, член Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

— Важна, каб маці і бацька нарадзілі здаровае дзіця. А калі ўзнікаюць праблемы ў гэтым плане, трэба, каб сям'я магла атрымаць дапамогу, незалежна ад таго, дзе яна жыве. Абазначаная праграма аб'ядноўвае ўсе міністэрствы для вырашэння дэмаграфічнага пытання, а яе падпраграма — «Сям'я і дзяцінства» — падкрэслівае важнасць сям'і для дзяржавы. Асноўныя кірункі падпраграмы скіраваны на паляпшэнне і ўдасканальванне інстытута планавання сям'і, умацаванне здароўя маці і дзіцяці, аказанне падтрымкі сям'і.

Прынамсі, гэта экстракарпаральнае апладненне, якое цяпер можна адзін раз зрабіць бясплатна. А таксама ўзроўневая сістэма аказання дапамогі жанчынам, якія плануюць сям'ю, у прыватнасці перынатальная дыягностыка захворванняў і прафілактыка абортаў.

— Сёння, нават калі выяўлена ўнутрыўтробная паталогія, можна скарэкціраваць здароўе. Цэнтр «Маці і дзіця», дзе жанчынам аказваецца дапамога і дынамічны нагляд, стаў больш даступным. Меддапамога для жанчын і дзяцей бясплатная, — дадала Святлана Адзінцова. — А цэнтры, сяброўскія да падлеткаў, адкрыты для тых, хто не можа падзяліцца сваёй праблемай з бацькамі. Спецыялісты тут здольны выраўняць многія фізіялагічныя і псіхалагічныя моманты. Такі чынам, дзяржава стварыла асноўныя кірункі для ўмацавання здароўя.

### Даплаты дзецям-інвалідам, на тройню і выпускнікам інтэрнатаў

У Мінску пражывае больш за 16 тысяч шматдзетных сямей, і сталічны бюджэт знайшоў магчымасць для выплаты асобных відаў сацыяльнай падтрымкі найбольш уразлівым катэгорыям. Гэта сем'і, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід, і шматдзетныя, падкрэсліла **Вольга ВАСІЛЕЎСКАЯ, намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:**

— У прыватнасці, штомесяц да сацыяльных пенсій дзяцей-івалідаў ва ўзросце да 18 гадоў выплачваецца даплата ў 150 % мінімальнай пенсіі па ўзросце (106 рублёў 31 капейка). Выплатамі падтрымліваюцца і сем'і, дзе адначасова нарадзілісе трое і больш дзетак — адна базавая велічыня на кожнага малога да трох гадоў. Цяпер такія даплаты атрымліваюць 45 сталічных сямей. Штогод даплачваюць і выпускнікам інтэрнатаў з ліку дзяцей-сірот і малых, якія засталіся безапячыцельства бацькоў.

Дзейнічаюць у Мінску і паслугі спецыяльнага аўтатранспарту, якімі могуць бясплатна скарыстацца тыя, хто выхоўвае дзяцей-інвалідаў. Для асобных катэгорый прадугледжана даплата да поўнага кошту пуцёўкі ў аздараўленчыя лагеры, а таксама даплата да харчавання (або бясплатнае харчаванне) у школах.

### Здароўе мам, татаў і немаўлят

Беларусь займае 25-ю пазіцыю ў рэйтынгу найбольш камфортных для мацярынства краін свету, і медыцына прыкладае максімум намаганняў, каб сям'я была здаровай, запэўніла **Алена УЛЕЗКА, намеснік дырэктара па педыятрыі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця»:**

— За апошнія 20 гадоў у дзесяць разоў зменшылася мацярынская смяротнасць. Смяротнасць немаўлят — 2,6 на тысячу народжаных. Абсалютна ўсім жанчынам даступны дарodавае і пасляродавае медабслугоўванне. Ультрагукавое даследаванне (УГД) праводзіцца ў 97—98 %.

Наладжана работа па захаванні рэпрадуктыўнага здароўя не толькі жанчыны, але і мужчыны, што таксама паспрыяе нараджэнню больш здаровых дзетак. Удзел бацькі ў выходжванні неданошанага немаўляці, у тым ліку з экстрэмальна нізкай масай цела, вельмі важны, падкрэсліла медык.

Мяркуецца, дарэчы, што ў перадабортнае кансультаванне будуць уключацца і таты, што, як спадзяюцца спецыялісты, дазволіць захаваць больш цяжарнасцяў. А яшчэ сёлета ў РНПЦ, дзе цяпер выжывальнасць неданошаных 88,6 %, увядуць у строй корпус для рэанімацыі немаўлят з экстрэмальна нізкай масай цела.

### Класічныя каштоўнасці

Грамадскія арганізацыі, якія таксама аказваюць у нашай краіне дапамогу жанчынам, асабліва тым, хто апынуўся ў сітуацыі хатняга гвалту, падтрымліваюць класічныя сямейныя каштоўнасці, заўважыла **Вераніка СЯРДЗЮК, кіраўнік Цэнтра падтрымкі сям'і і мацярынства «Матуля»**, і агучыла, што, на яе погляд, варта было б удасканаліць заканадаўча:

— У паслугах сацыяльнай нянькі маюць патрэбу не толькі шматдзетныя, але і маладыя мамы, якія нараджаюць першынца. Прычым гэта асабліва актуальна ў раёнах, бо спрадвечны прынцып дапамогі з гадаваннем бабуль больш не актуальны. Сучасныя бабулі, як правіла, працуюць, ім няма калі дапамагаць.

А яшчэ ў ВНУ варта было б увесці абавязковую дысцыпліну па вядзенні сям'і. Студэнцкіх сямей усё менш, цяпер іх набіраецца хіба 200, а дысцыпліна дапамагла б большай інфармаванасці студэнтаў і, магчыма, нараджэнню першынца, на што беларускі рашаюцца ўсё пазней, арыентуючыся на заходнюю мадэль сям'і, дадала Вераніка Сярдзюк.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірына СІДАРОК.**

# «ПАЛАТНО НЕ ПАДМАНЕШ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Бацьку спачатку на фронт не ўзялі, з «жалезнай» бранёй перакінуўшы ўглыб Расіі, каб у тыле абслугоўваць чыгункі, забяспечваць перамяшчэнне эшалонаў з харчаваннем, зброяй, раненымі. Толькі ў 1944-м, пасля вызвалення Беларусі, Фёдару Васільевічу ўдалося адпрасіцца на фронт і паваяваць у Латвіі, даваялося вызваляць Шаўляй.

А Марфа Васільеўна са свякрухай і дзецьмі ўсю вайну правяла ў акупаваным Мінску. Як большасць хлапчукоў той пары, Вася быў непаседа і свавольнік, дастаўляючы ёй нямала клопатаў і засмучэнняў.

— Чаго я толькі не вычвараў! Лепш за ўсіх страляў з рагаткі. А неяк раз кінуў у вогнішча знойдзены дзесьці снарад, асколкамі моцна параніўшы руку. Ці, скажам, палез па яблыкі цераз агароджу, а дрот аказаўся пад напружаннем. Мяне ўдарыла токам, ды так, што з цяжкасцю «адкачалі». Бацька, вярнуўшыся з вайны, жартаваў: «Ды ў цябе, сынок, ран больш, чым у мяне, франтавіка!»

## ЛЁТАЎ З ТРАМПЛІНА І МАЛЯВАЎ

***— Ваш бацька паказваў вам свае малюнкі, зробленыя на фронце?***



З дочкамі Кацярынай і Дар'яй.

— Так, ён быў выдатным сталяром, вучыў мяне і брата рабіць усё сваімі рукамі і маляваў яшчэ да вайны як аматар. Памятаю, на вертыкальна зрэзаных бярозавых цурках з карой капіраваў работу «Паляванне на тыгра» грузінскага мастака Таідзэ. Я, хлапчук, вельмі захапляўся ім.

На фронце тата быў камандзірам аддзялення армейскай разведкі і сапёрам. Ваяваў па-геройску, пры параўнальна невялікім росце валодаў немалой фізічнай сілай, браў нямецкіх «языкоў», на паўгалавы вышэйшых за сябе, і вярнуўся дадому з двума ордэнамі Славы і медалямі. І, дарэчы, нас з братам прывучаў да спорту. На карціне «Мой дом» бацька стаіць справа з ордэнамі, а я падцягваюся на турніку.

***— Дык вы яшчэ і спортам займаліся?***

— Вядома. Я і сёння кожную раніцу раблю гімнастыку, прагульваюся 2-3 разы на дзень.

А ў юнацтве цудоўна скакаў на лыжах з трампліна. Прычым на першы з іх, яшчэ драўляны, абсталяваны ў велізарным катлаване насупраць «Камунаркі», падняўся, калі вучыўся ў восьмым класе. Там трэніраваліся старэйшыя хлопчыкі, і мне, хлапчаняці, сапраўднаму хулігану, таксама захацелася паспрабаваць. Лёталі з яго недалёка, метраў на 25, затое там мяне запрыкмеціў трэнер, убачыўшы, што я не баюся падаць і інтуітыўна групуюся.

Ён узяў мяне ў секцыю, стала нешта атрымлівацца, даскакаўся да юнацкага разраду. У той час я за зіму ламаў па тры пары лыж. Былі, напрыклад, пасляваенныя ад станковага кулямёта, потым паляўнічыя, кароткія і шырокія, якія мне асабліва падабаліся. А калі дзесьці ў 1960-х гадах пабудавалі трамплін у Раўбічах, мы пачалі скакаць там, я выканаў нарматыў кандыдата ў майстры спорту. Але ў той час ужо вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, ездзіць прыходзілася далёка, і паміж спортам і жывапісам даводзілася выбіраць.

***— Ваш выбар аказаўся і лагічны, і лёсавызначальны, і шчаслівы. А з чаго ўсё пачыналася?***

— Неяк у 1952-м я падняўся на гарышча нашага дома і ўбачыў там хлопцаў, якія малявалі: Кіма Шастоўскага, Кіма Яфрэмава і Аліка Евялеўскага. Яны капіравалі нейкі сюжэт з гісторыі Старажытнага Рыма, і гэта было цудоўна, вельмі падобна! Захацелася нешта намаляваць і мне. Пачаў з алоўка, паступова перайшоў да фарбаў і палатна.

Потым Кім Шастоўскі паступіў у мастацкае вучылішча, і я ўслед за ім. Паказваў яму свае работы, затым мы разам вучыліся ў тэатральна-мастацкім. Гэта быў мой найлепшы сябар, я праводзіў яго ў апошні шлях.

## ШЧАСЛІВЫ ПАЛАЦ

***— Хто быў вашымі настаўнікамі ў тэатральна-мастацкім інстытуце?***

— Іван Стасевіч, Май Данцыг, Іван Ахрэмчык, Пётр Крохалеў. Хтосьці з іх прайшоў вайну, яны прагнулі падзяліцца сваімі ведамі з намі, студэнтамі, ставіліся да нас вельмі цёпла, чалавечна, зямля ім пухам. А я сабе



часам думаю: калі траплю ў іншы свет, дай Бог мне весці дзіцячую студыю, таму што там ужо столькі маіх выхаванцаў...

***— Стварыць дзіцячую студыю выяўленчага мастацтва вы рашылі самі?***

— На апошнім курсе інстытута я ўжо працаваў з дзецьмі, мне гэта вельмі падабалася. Пасля заканчэння ВНУ ў 1965-м узяў накіраванне ў 90-ю школу, год там адпрацаваў і адначасова арганізаваў студыю выяўленчага мастацтва пры Палацы культуры камвольнага камбіната, якой кіраваў больш за 25 гадоў.

Маладосць поўная энергіі. Мне хацелася, каб дзеці займаліся і спортам, і жывапісам. Мы самі рабілі мальберты, я абсталяваў добрае асвятленне, малявалі стоячы, таму ў мяне не было сутулаватых. Часам я браў на заняткі сабаку Ласку, ацэнят ці трусоў, ладзіў конкурс малюнкаў на асфальце перад палацам і ў мікраёне, вучыў дзяцей страляць з лука.

***— Праз вашы рукі за гэты час прайшло больш за 1000 выхаванцаў. Многія сталі вядомымі мастакамі?***

— Не ўсе, вядома. Чацвёра маіх вельмі таленавітых вучняў ужо ў іншым свеце. Хтосьці сапраўды дабіўся поспеху і прызнання, як тыя ж Ігар Бархаткоў, Рома Заслонаў, Андрэй Задорын і іншыя. Я даў ім усё, што ў мяне было, нічога не ўтойваў. Лічу, калі ў цябе ёсць нейкія веды і вопыт, ты павінен іх перадаць дзецям, бо жыццё па-рознаму складваецца ва ўсіх.

***— Вы і з вашай будучай жонкай пазнаёміліся менавіта ў Палацы культуры?***

— У 16 або 17 гадоў, скончыўшы школу, яна працавала білецёрам у нас у палацы, і мне запомнілася мілая чарнавокая дзяўчына ў зялёным світары. А потым прывяла ў маю студыю сваю пляменніцу, мы пазнаёміліся бліжэй, а з часам і пажаніліся, нарадзіліся цудоўныя дочкі.

Наталля Іванаўна была і прыгожай, і разумнай, і таленавітай, і выдатнай мамай, і гаспадыняй. Але вось ужо без малога год, як яе няма... Напэўна, такія людзі і там, на нябёсах, патрэбныя. Псіхалагічна мне вельмі няпроста. Сам займаюся гаспадаркай, прыбіраннем, гатую, мыю, бо ў дачок свае сем'і і сваё жыццё. Хоць мы, вядома, часта бачымся, яны мне дапамагаюць, абмяркоўваем нейкія творчыя пытанні.

## НЕ «ДОМАМ» АДЗІНЫМ

***— Васіль Фёдаравіч, у запасніках Нацыянальнага мастацкага музея шмат вашых карцін?***

— Так, 24 работы. У пастаяннай экспазіцыі знаходзіцца і навагрудскі пейзаж «Зямля маёй маці», і «Мой дом», які і цяпер там.

***— Ніводная прысвечаная вам публікацыя не абыходзіцца без згадвання гэтай знакавай работы. Натхніўшыся яе поспехам, вы маглі б, напэўна, у гэтай тэхніцы працаваць і далей, атрымліваючы заслужаныя лаўры?***

— Яшчэ некалькі работ у падобнай стылістыцы я зрабіў, таму што гэта ўспаміны майго дзяцінства. Напрыклад, «Гарачы дзень. Трэнаж пажарнікаў», яна цяпер дзесьці ў Расіі ў музеі. Дарэчы, як яны самі мне растлумачылі, правільна называць іх «пажарныя», або «агняборцы». У такой жа стылістыцы напісаны «Вяселле», «Хутка 8 Сакавіка», «Свята зімы на Трактарным пасёлку», яшчэ некалькі карцін. У кожнай з іх ёсць элемент дзяцінства, дзіцячага ўспрымання.

***— Усе яны атрымалі прызнанне?***

— Практычна ўсе друкаваліся ў сур'ёзных усесаюзных і замежных часопісах, кнігах па мастацтве, выстаўляліся. Дарэчы, калі я прынёс эскіз «Майго дома» на наш беларускі выстаўкам, некаторыя вядомыя мастакі з яго пасмейваліся: маўляў, гэта ж дзіцячы малюнак, а ты рабіў такія рэчы, гарадскія, індустрыяльныя пейзажы, фігуратыўныя карціны!

***— Але ж хтосьці вас і падтрымаў?***

— Міхаіл Андрэевіч Савіцкі, і я яму ўдзячны па сённяшні дзень. А потым прыехала камісія з Масквы заключаць дагаворы да 100-годдзя з дня нараджэння Леніна. Убачыўшы мой эскіз, прапанавалі мне дагавор, і ў экспазіцыі Усесаюзнай выстаўкі «Мой дом» змясцілі



ва ўводную залу. Толькі тады не прызналі і тут.

## «БЛАКІТНАЯ ВЕРАНДА» Ў КВЕТКАВЫМ РАІ

Па слядах знакамітага бацькі пайшлі яго дочкі, стаўшы самабытнымі і таксама вядомымі мастачкамі, са сваім почыркам і непрывіяльным поглядам на свет. Абедзве скончылі Рэспубліканскую школу-інтэрнат па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Ахрэмчыка, затым Акадэмію мастацтваў, шмат працуюць і выстаўляюцца. Кацярына Сумарава атрымала ў снежні мінулага года за маштабную карціну «Плашчаніца-2020» Гран-пры на першым трыенале жывапісу, графікі і скульптуры, арганізаваным Беларускім саюзам мастакоў.

***— Нарадзіўшыся ў творчай сям'і, вы з Дашай маглі б не стаць мастачкамі?*** — пытаюся ў яе.

— Наўрад ці. Я з дзяцінства ведала, што стану мастаком, не было «плана Б». Гэта наш свядомы выбар, падрыхтаваны самой атмасферай, асяроддзем, у якім мы выхоўваліся. Акрамя прыкладу бацькі, быў і мамін прыклад, якая пастаянна рабіла ўсё магчымае, каб мы развіваліся ў гэтым кірунку, малявалі.

***— Наогул, як вы лічыце, мастацкія гены існуюць, здольнасці перадаюцца ў спадчыну?***

— Вядома, гэта ўсё існуе, — уступае ў размову Дар'я. — Але некаторыя людзі проста пацалаваныя Богам, як наш бацька. У мяне ёсць выкладчыцкі досвед работы з дзецьмі, і я ведаю, што калі ёсць жаданне і мэта, то выдатна развіваюцца нават параўнальна сціплыя здольнасці.

Дарэчы, сястра Кацярыны, Дар'я Сумарава-Копач, знайшла сябе ў больш рэалістычнай, класічнай манеры, піша цудоўныя нацюрморты з кветкамі, пейзажы, партрэты і вельмі любіць творчасць бацькі:

— Мне падабаюцца многія яго работы. Асабліва, напэўна, «Блакітная веранда», напісаная на дачы. Яна натхняе мяне. Дзякуючы маме з яе эстэтычным густам у нас там дзівосны сад. Тата будаваў дачу 30 гадоў, пачынаючы ад падмурка да даху, вокнаў і дзвярэй, а яна дэкарыравала і стварыла цудоўны і ўтульны куточак, свой свет, кветкавы рай.

***— Наталля Іванаўна вучылася на філфаку і іграла ў тэатры БДУ, марыла стаць актрысай. Але і яна ўзялася за пэндзлі...***

— Мама вяла драматычны гурток, — кажа Кацярына, — у якім мы з сястрой таксама ігралі. Яна была эрудзіраваным, нагледжаным чалавекам, які ведаў гісторыю мастацтваў, захапляўся гэтым, і ў адзін цудоўны момант мы сказалі: «Мама, ну давай, дзейнічай, паспрабуй!»

**«Я сабе часам думаю: калі траплю ў іншы свет, дай Бог мне весці дзіцячую студыю, таму што там ужо столькі маіх выхаванцаў...»**

І першы раз яна ўзялася за пэндзлі менавіта на дачы. Спачатку трохі разгубілася, але, паклаўшы на палатно першыя мазкі, нібы адкрыла ў сабе нейкую энергію. І вось тут спыніць яе было немагчыма: усе куточкі свайго саду, любімыя кветкі-расліны, сваіх унукаў — увесь свой свет ёй хацелася змясціць на палатно. А мы проста любаваліся і захапляліся яе бачаннем. Творчасць нашай мамы самабытная, таленавітая! Гэта наіўнае мастацтва, непасрэднае, небанальнае і шчырае.

***— Даша, ваш муж — вядомы скульптар. Вы пазнаёміліся падчас вучобы ў Акадэміі мастацтваў?***

— Ён тады ўжо яе скончыў, а я вучылася на 2-м курсе, мы пазнаёміліся ў агульнай кампаніі... Сёння яго скульптуры, манументальныя работы ўстаноўлены ў 26 краінах, у некаторых нават не па адной. У суаўтарстве з Аляксеем Сарокіным яны зрабілі вялікае пано для станцыі метро Францішка Багушэвіча.

***— А дзеці вашы раўняюцца на вас?***

— Старэйшы сын ужо працуе дызайнерам. Сярэдні вучыцца на 1-м курсе ў Акадэміі мастацтваў на кафедры скульптуры, дачка — у Рэспубліканскай гімназіі-каледжы мастацтваў імя Ахрэмчыка. У яе шчаслівае дзяцінства, малюе ў сваё задавальненне, ёй гэта падабаецца. Штосьці атрымліваецца. Ці працягнецца дынастыя? Час пакажа, але ўсе перадумовы для гэтага ёсць.

**Уладзімір ПАНОЎ.**

# «АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД — ГЭТА І ЁСЦЬ ВЫХАВАННЕ»

**У пачатку новага вучэбнага года гаворым са святаром аб выхаванні дзяцей — аб задачах, якія стаяць перад бацькамі, аб заахвочванні і пакаранні, а таксама аб даверы і павазе да дзіцяці. Што думае царква аб найбольш распаўсюджаных «бацькоўскіх пытаннях», мы дазналіся ў настаяцеля храма свяціцеля Спірыдона Трыміфунцкага ў Мінску, айца Аляксандра Пальчэўскага.**

***— Давайце пачнём з самага, напэўна, няпростага пытання: як правільна заахвочваць дзіця і якім павінна быць пакаранне, каб яно стала дзейсным, але не нанесла псіхалагічную траўму? Што пра гэта кажа царква?***

— Гэта пытанне, хутчэй, да псіхолага. Але і ў мяне як у святара ёсць пазіцыя па гэтым пытанні, таму што яно датычыцца кожнага з бацькоў: і прыхаджан храма, дзе я служу, і мяне самога. Давайце пачнём з заахвочвання. Заахвочванні ў працэсе выхавання дзяцей неабходныя. Але часам яны ў сучасным свеце набываюць тыя формы і тую частату, якія робяць заахвочванне некарысным для дзіцяці. Гэта адбываецца, калі бацькі ператвараюць сваю працу па выхаванні дзяцей з жывога ўзаемадзеяння ў нейкія схемы, каб палегчыць яе і зняць з сябе частку адказнасці.

**«Перш чым караць дзіця, вельмі важна супакоіцца і толькі потым правесці гутарку, растлумачыць прычыны сваёй незадаволенасці і тое, як паступіць у такой сітуацыі дзіцяці было б правільна».**

***— Вы кажаце аб бацькоўскай практыцы плаціць свайму дзіцяці за добрыя ацэнкі або дапамогу ў дамашніх справах?***

— У тым ліку. Калі казаць пра рашэнне некаторых бацькоў плаціць дзецям за добрыя ацэнкі, на мой погляд, гэтую меру можна выкарыстоўваць толькі ў самую апошнюю чаргу. Ёсць значна больш дзейсныя спосабы заахвочвання, якія залежаць ад узросту і асобы вашага дзіцяці. Тым больш што грашовае ўзнагароджанне дастаткова доўга не мае для дзіцяці той каштоўнасці, якую закладваюць у яго дарослыя: усё роўна грошы дзіця ператварае ў нейкія прадметы або забавы. Дык ці не лепш заахвоціць дзіця сваім часам і любоўю — займальна правесці разам вольны час, пагуляць ці кудысьці схадзіць? Гэта будзе значна больш карысна для ўзаемаадносін з уласнымі дзецьмі і фарміравання даверу, такога неабходнага ў кожнай сям'і. Праўда, гэта патрабуе большай разумовай працы і фізічных сіл, чым проста дастаць з кашалька купюру.

Цяпер вернемся да другой часткі пытання — аб пакаранні дзіцяці. Пра гэта сёння шмат спрачаюцца і бацькі, і спецыялісты — педагогі, псіхолагі. Многія кажуць аб тым, што караць дзіця недапушчальна ў прынцыпе. Не магу з гэтым пагадзіцца. Іншая справа, што падыход да самога пакарання павінен быць разумным. Прыгадаем рускае слова «наказание» — яно ад слоў «наказ», «настаўленне». А настаўляць, гэта значыць накіроўваць, выхоўваць, вучыць дзіця, — абавязак бацькоў. Але тут ёсць вельмі важны момант: пакаранне ні ў якім выпадку не павінна ажыццяўляцца ў стане раздражнення, злосці, унутранага напружання.



Рухальнай сілай тут павінна быць бацькоўская любоў. Таму, перш чым караць дзіця, вельмі важна супакоіцца і толькі потым правесці гутарку, растлумачыць прычыны сваёй незадаволенасці і тое, як у такой сітуацыі паступіць дзіцяці было б правільна. Ці дапушчальна фізічнае пакаранне? Я сказаў бы — не. Хоць вельмі рэдка з гэтага правіла могуць быць выключэнні, калі ўчынак дзіцяці быў сапраўды небяспечны для яго. Знаёмы святар распавядаў мне, што ў дзяцінстве ён быў няўрымслівым і вельмі непаслухмяным хлопчыкам. І аднойчы ён здзейсніў крадзеж, за гэта бацька даў яму добрую аплявуху. І гэта стала для яго ўрокам на ўсё жыццё. Успамінаючы той эпізод, мой суразмоўца не адчуваў негатыўных эмоцый — злосці, крыўды. Ён прызнае, што бацька меў рацыю. І яшчэ аб пакаранні. У Свяшчэнным Пісанні гаворыцца пра першасвятара, які меў двух сыноў, што дапамагалі яму служыць у храме. Але сваё служэнне яны здзяйснялі нядбайна. І за тое, што іх бацька не праяўляў належнай строгасці і клопату аб сваіх дзецях, Гасподзь пакараў яго і дзяцей (1 Цар. 11, 2—17, 22—36). Слабахарактарнасць, абыякавасць, папушчальніцтва бацькоў прыводзяць да таго, што дзеці могуць здзяйсняць вялікія памылкі, здольныя адбіцца на ўсім іх жыцці. А гэта не даспадобы Госпаду. Але, звяртаючыся да пакарання, вельмі важна, паўтаруся, суаднесці яго з той правіннасцю, якую здзейсніў малы або падлетак.



## «АДДАВАЦЬ СЯБЕ ДЗЕЦЯМ — ПРАВІЛЬНА»

***— Як сумясціць уласнае жыццё і клопат пра дзіця? Дзе правесці мяжу?***

— Кожны гэтую мяжу вызначае для сябе сам. Але чым больш мы абмяжоўваем сябе дзеля дзяцей, чым больш аддаём ім свайго часу і сіл, тым больш паўнавартасна яны развіваюцца. Аддаваць сябе дзецям — гэта правільна з пункту гледжання царквы. На гэтым прынцыпе пабудавана ўся сістэма хрысціянскай маральнасці: аддаваць нашмат больш каштоўна, чым атрымліваць. Так, у нас ёсць прафесійныя абавязкі, ёсць кар'ера і ўласныя інтарэсы. Але, напрыклад, калі казаць пра святара — як ён будзе выхоўваць паству, калі не ў стане выхаваць уласных дзяцей? У сваёй практыцы мне даводзіцца часам назіраць прыклады, калі бацькі цэлымі днямі працуюць, быццам бы клапоцячыся пра будучыню сваіх дзяцей, а ў выніку дзіця можа тыднямі знаходзіцца з няняй. Яны кажуць: цяпер такі час, трэба зарабляць грошы. Але час сыходзіць незваротна, а дзіця расце без іх. Яны паправяць матэрыяльнае становішча, а давер і любоў сваіх дзяцей страцяць.

***— Ці можна ў прынцыпе кагосьці выхаваць?***

— Словамі — наўрад ці. Дзіця фарміруецца з таго асяроддзя, у якім жыве. Асабісты прыклад — гэта і ёсць выхаванне і той уплыў, які мы аказваем на дзіця. Як мы можам чагосьці патрабаваць ад дзіцяці, калі самі гэтага не выконваем? Ведаю сям'ю, дзе бацькі адпраўляюць дзяцей у храм, а самі не прыходзяць. Яны лічаць, што ёсць царква, і там без іх удзелу з іх дзяцей вырасцяць добрых людзей. Але так гэта, на жаль, не працуе. Адзін пажылы святар неяк параіў маладому: калі будзеш накладваць епітым'ю на кагосьці з духоўных дзяцей, сам ты павінен двойчы выканаць тое, што будзе рабіць гэты чалавек. Той, хто дае настаўленне, сам павінен прайсці гэты шлях, і толькі тады ён мае маральнае права нешта патрабаваць ад іншага. Таму, на мой погляд, вельмі важнае пытанне ўнутранай адпаведнасці — калі бацькі завышаюць планку для свайго дзіцяці, але самі не імкнуцца дацягнуцца да яе. Асабісты прыклад — гэта той шлях, які дазваляе заваяваць бацькоўскі аўтарытэт у дзіцяці (аб дэфіцыце якога сёння прынята смуткаваць). Хочаш, каб твой сын ці дачка шмат чыталі, — чытай сам. Хочаш, каб займаліся спортам, правільна харчаваліся, вывучалі новыя дысцыпліны, — пачні з сябе. Тады і будзе натуральным чынам фарміравацца тое асяроддзе, каштоўнасці якога ўбярэ дзіця. У дачыненні далучэння дзяцей да веры часта чую меркаванне: «Вырасце — сам вырашыць, ці хадзіць яму ў царкву». Але калі ў дзяцінстве мы не падалі юнаму чалавеку прыклад, не паказалі, наколькі гэта важна для нас, дарослых — быць з Богам, наведваць храм, ён, сталеючы, не будзе адчуваць важнасць усяго гэтага.

## «СЯМ'Я ЯК МАЛАЯ ЦАРКВА»

***— Ці трэба быць з дзіцем на роўных?***

— Сям'я ў праваслаўі — гэта малая царква. У царкве існуе прынцып іерархічнасці. Ёсць ступені святарства і нават паняцце нябеснай іерархіі сярод анёлаў. Строй царквы, і зямной, і Нябеснай, іерархічны. І гэта толькі ўмацоўвае яе і напаўняе сэнсам, гармоніяй. Тое ж самае і ў сям'і. Прынцып іерархіі будзе фарміраваць гармонію і паразуменне паміж мужам і жонкай, бацькамі і дзецьмі. Пры гэтым ступень асабістай свабоды дзіцяці паступова будзе расці, і гэта стане залогам яго правільнага развіцця.

***— Ці можна выправіць сітуацыю, калі давер дзіцяці да бацькоў страчаны? Такое часта адбываецца ў падлеткавым узросце...***

— Можна выправіць усё і заўсёды. Давер з'яўляецца з аўтарытэту бацькоў. І гэты аўтарытэт не ўзнікае проста так. Аўтарытэт зарабляецца працай. Ніколі не позна пачаць працаваць у гэтым кірунку. І дзецям, і асабліва бацькам неабходны пастаянны духоўны рост. Так, усе мы памыляемся. У такіх сітуацыях бацькам дарэчы прасіць прабачэння ў сваіх дзяцей — за раздражненне, праявы злосці, адсутнасць вытрымкі. З гэтага і складаецца паразуменне і давер.

***— Як зберагчы падлетка ад памылак?***

— Важна, каб у дзіцяці было дакладнае разуменне таго, што такое дабро і зло, што такое грэх і якую шкоду ён можа нанесці і самому чалавеку, і навакольным. Разам з фізічным і інтэлектуальным удасканаленнем вельмі важна закладваць у свайго дзіцяці і духоўныя асновы. Гэта пастаянны працэс, які не павінен спыняцца. Спосабы могуць быць рознымі. Прасцей за ўсё зрабіць гэта праз добрыя, мудрыя кнігі. І перш за ўсё гэта Евангелле — вечная кніга, якая дае прамыя адказы на складаныя пытанні. Ёсць царкоўны вопыт разумення Свяшчэннага Пісання, які мы даносім да вернікаў праз пропаведзі, таінствы, малітвы. Гэта спосаб фарміравання ў дзіцяці ўнутранага стрыжня, які па меры сталення будзе дапамагаць прымаць правільныя рашэнні і зберажэ ад памылак.

***— З якімі праблемамі часцей за ўсё да святара прыходзяць бацькі?***

— З самымі рознымі. Вось, напрыклад, распаўсюджанае пытанне: што рабіць з дзіцячымі істэрыкамі ў людных месцах — у гандлёвых цэнтрах, дзе дзіця патрабуе купіць яму нешта. Маё меркаванне: ні ў якім выпадку нельга саступаць дзіцяці. Такія формы дзіцячых істэрык — гэта часцей за ўсё маніпуляцыя, спроба дамагчыся свайго. Але разбор сітуацыі трэба перанесці туды, дзе не будзе староніх і спадзе эфект «работы на публіку». Паводзіць сябе ў такой сітуацыі бацька або маці павінны з любоўю і без раздражнення, хоць гэта і складана. Але калі эмацыянальнае напружанне будзе і з боку дарослага, і з боку дзіцяці, ні да чога добрага гэта дакладна не прывядзе. Бацькі з любоўю павінны праяўляць цвёрдасць і стрыманасць. Гэта датычыцца ўсіх складаных

**«Той, хто дае настаўленне, сам павінен прайсці гэты шлях, і толькі тады ён мае маральнае права нешта патрабаваць ад іншага».**

сітуацый з дзецьмі, таму што часам бацькам даводзіцца шкадаваць аб сваіх словах і нават дзеяннях у стане эмацыянальнага напружання — пра гэта, бывае, кажуць людзі, якія прыходзяць у храм. Так, скінуць раздражненне складана. Святыя айцы рэкамендуюць у такой сітуацыі прачытаць пра сябе малітву. Можна звярнуцца да Бога сваімі словамі. Малітва, як паказвае практыка, здольная тварыць цуды. У любой сітуацыі важна памятаць, што ўзаемаадносіны дзяцей і бацькоў — гэта няспынная сумесная праца, пастаянны рух насустрач адзін аднаму. Часам бацькі вырашаюць, што яны заўсёды маюць рацыю, ніколі не памыляюцца, усё ведаюць і разумеюць. Як толькі такая думка закралася ў галаву — гэта знак, што нешта не так. Любому з бацькоў заўсёды ёсць да чаго імкнуцца, што выпраўляць у сваім унутраным свеце. Бацькоўскую працу трэба ўспрымаць як пастаянную духоўную працу. Рабіць яе трэба ў стане ўнутранай сабранасці, каб правільна рэагаваць на любыя сітуацыі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ДАСТУКАЦЦА ДА НЯБЁСАЎ

**Дзіна Іванаўна — дасведчаны клінічны псіхолаг. За 20 гадоў працы дапамагла дзясяткам людзей развітацца з п'янствам, захаваць сям'ю, стаць шчаслівымі. У яе шукаюць падтрымкі, з ёй раяцца, ёй давяраюць. І мала хто з пацыентаў у курсе, што Дзіна Іванаўна ведае ўсё аб алкагалізме не толькі з навуковых манаграфій. Яна сама прайшла ўсе кругі пекла і сваё вылячэнне ад страшнай хваробы называе сапраўдным цудам.**



## КАХАННЕ НА ПАВЫШАНЫХ ТАНАХ

Дзіна вырасла ў сям'і, якая лічылася цалкам шчаслівай. Бацька, інжынер-будаўнік, меў добрую рэпутацыю, яго часта накіроўвалі на новыя аб'екты, сям'я калясіла па розных кутках Савецкага Саюза. Каб жонка і дзве дачкі ні ў чым не мелі патрэбы, Іван Пятровіч шмат працаваў. Гэта быў спакойны, маўклівы, сціплы мужчына. Напэўна, ён часам стамляўся, і яму хацелася расслабіцца.

— У тыя часы ніхто не бачыў праблемы ў тым, што з нагоды любога свята на стале заўсёды стаяла спіртное. Да нас з'язджаліся шматлікія сваякі, выпівалі ўсе — так было прынята, — расказвае Дзіна Іванаўна. — Бацьку ніколі не ставілі дыягназ «алкагалізм», хоць сёння ніякіх сумненняў у яго залежнасці ў мяне няма. Перыядычна ён сыходзіў у запоі. Пры гэтым не дэбашырыў, не ладзіў у доме пагромы. Самыя непрыемныя мае ўспаміны звязаны не з п'яным бацькам, а з мамай. Калі тата вяртаўся дадому нападпітку, яна з парога пачынала крычаць. Калі мы з сястрой у гэты час ужо спалі, магла разбудзіць нас, адправіць да суседзяў, а сама лаялася так, што чулі і ў доме, і на вуліцы. З таго часу я страшна не люблю гучных галасоў і высвятлення адносін.

Сёння Дзіна Іванаўна разумее: мама была істэрычнай, сузалежнай жанчынай. Алена Віктараўна часам абвінавачвала мужа ва ўсіх смяротных грахах, але не ўяўляла без яго жыцця. І калі пасля 20 гадоў шлюбу Іван Пятровіч сышоў да іншай жанчыны, для яе гэта стала страшным ударам. Яна ўпала ў дэпрэсію, абвастрылася хранічнае захворванне, і ва ўзросце 51 года Алена Віктараўна памерла. Дочкі палічылі бацьку вінаватым у смерці мамы.

— Мы нават не паклікалі яго на пахаванне, — успамінае Дзіна Іванаўна. — 20 гадоў я не мела зносін з бацькам, а апошнія 10 гадоў клапацілася пра яго. Незадоўга да яго сыходу спытала, ці крыўдзіцца ён на нас, дачок. Ён адказаў: «Не. Я ганаруся вамі. Асабліва табой».

## АНАТОМІЯ ПАДЗЕННЯ

Дзіна ніколі не вініла бацьку ў тым, што пачала піць. Яго прыклад пераконваў якраз у тым, што п'янства — гэта дрэнна, непрыгожа і нясе гора блізкім. Яна добра вучылася і не дастаўляла дарослым ніякіх турбот. Яе лічылі разумнай, на яе ўскладалі вялікія надзеі. Яна вельмі старалася іх апраўдаць, глыбока перажывала, калі нешта не ўдавалася і яна аказвалася не на вышыні.

— Упершыню я паспрабавала алкаголь падлеткам, у лагеры адпачынку, — дзеліцца жанчына. — І раптам адчула незвычайную лёгкасць, раскаванасць, упэўненасць. Усе трывогі, неспакой, засціснутасць выпарыліся, як лужыны ў спякоту. Гэты стан мне незабыўна спадабаўся.

Пасля школы Дзіна паступіла ў інстытут. У 20 гадоў выйшла замуж за ваеннага і разам з Мікалаем адправілася па месцы яго службы на Камчатку. У 21 нарадзіла сына Алега. Яна вучылася, гадавала дзіця, клапацілася пра сям'ю. Спіртное з'яўлялася на стале толькі з нагоды.

— Калі Алежку споўніўся год, я адвезла яго да бацькоў, у Бабруйск: сыну катэгарычна не падыходзіў камчацкі клімат, — кажа Дзіна. — Сама ж уладкавалася лабаранткай у школу. І ў гэты час у мяне здарыўся першы запой. Аднойчы я прачнулася і не змагла выйсці на работу. Мне ўжо падабалася выпіваць, прыцягвалі тыя кампаніі, дзе на стале стаяў алкаголь. Але я магла яшчэ падоўгу ўстрымлівацца ад яго.

А вось на пахаванні мамы (да таго часу Дзіна з Мікалаем ужо вярнуліся ў Беларусь) яна напілася да страты прытомнасці, падаючы на зямлю, нават выбіла зуб. Прыязджала «хуткая», ёй ставілі кропельніцу. І такія зрывы паступова станавіліся рэгулярнымі. Вяртаючыся з работы, маладая жанчына любіла купіць бутэльку, заехаць у госці ці запрасіць кагосьці да сябе і арганізаваць «свята». У выпадку запою спасылалася на рабоце на дрэннае самаадчуванне і брала адгул.

— Фатальную ролю ў маім падзенні адыграў крызіс, які перажывала краіна ў 1990-х, — лічыць Дзіна. — Калі пачалася перабудова, муж у званні капітана звольніўся з войска. Я працавала інжынерам-канструктарам, але зарплату нам ужо фактычна не плацілі. Мы з цяжкасцю зводзілі канцы з канцамі. Трэба было за нешта жыць. Трывога, неспакой за будучыню, за сына часам проста зашкальвалі, і я супакойвалася адзіным вядомым спосабам — з дапамогай алкаголю. Спіртное стала для мяне апорай — яно дапамагала хоць неяк выстаяць у свеце, які пахіснуўся.

Дзіна з мужам вырашылі купіць кіёск. Дзіна саромелася стаяць на рынку і гандляваць. А ўзімку было яшчэ і холадна. Плюс рэгулярныя праверкі, падатковыя інспекцыі. Усё разам ствdespite пастаянны стрэс. Дадому яна ледзь не кожны дзень прыходзіла п'янай.

Родныя, сябры сям'і, муж бачылі: у жанчыны сур'ёзныя праблемы, яе трэба ратаваць. Мікалай уладкаваўся ў будаўнічую кампанію, купіў дом, і сям'я пераехала за горад. Але гаспадаркай Дзіна займалася без энтузіязму. Роля хатняй гаспадыні яе не прыцягвала. Знайшла месца ў праектным інстытуце. Усё складвалася на рэдкасць удала. Але...

— З-за перапынку ў рабоце па спецыяльнасці адчувала няўпэўненасць, — прызнаецца Дзіна. — Каб дагнаць калег, прыкладала намаганні, затрымлівалася на службе, брала недаробкі дадому. Хацелася выпіць, але я трывала. Ад эмацыянальнага напружання, якое адчувала, у мяне часам дранцвелі пальцы. І ў нейкі момант вырашыла: калі крышку вып'ю, то нічога не здарыцца. Расслабілася — і тут жа імкліва пакацілася ўніз. Дайшло да таго, што месяц не з'яўлялася на рабоце: тры дні піла, тры прыходзіла ў сябе і зноў цягнулася да бутэлькі. Калі вярнулася ў інстытут, мяне папрасілі напісаць заяву. Напісала, прыйшла дадому і працягнула піць.

Тры з паловай месяца таго жыцця — з кастрычніка да студзеня — Дзіна ўспамінае як суцэльны жах. Прачнуцца, з цяжкасцю падняцца з ложка, паглядзецца ў люстэрка, зненавідзець сябе, накінуць халат на начную кашулю і... адправіцца шукаць спіртное, каб зноў забыцца. Усё жыццё звялося да гэтага прымітыўнага сцэнарыя.

Аднойчы яна выбіла шкло ў акне ўласнага дома і ўвайшла праз яго, цудам не парэзаўшыся. А колькі разоў ладзіла скандалы, сварылася з суседзямі. Разумела, што дэградуе, разумела, што з-за яе пакутуюць муж і сын. Часам у адчаі набірала нумар тэлефона даверу, каб спытаць: «Што рабіць, калі жанчына п'е?» Яе прасілі ператэлефанаваць пазней, яна апускала трубку і адпраўлялася шукаць сабутэльнікаў.

У студзені 2001 года сын сказаў: «Мама, я сыходжу ў войска. Рабі, што хочаш, толькі не пі». Яна сабралася з сіламі, тыдзень пратрымалася цвярозай, праводзіла сына служыць. А потым — гэты дзень яна лічыць пачаткам новага жыцця — сабрала рэчы і папрасіла мужа адвезці яе ў РНПЦ псіхічнага здароўя.

## ВЫСКАЧЫЦЬ З ПАШЧЫ КРАКАДЗІЛА

— Калі мяне прымалі ў аддзяленні, я спытала ўрача: «Вы думаеце, я алкагалічка?» — «Я не думаю, а ведаю», — пачула ў адказ. Гэта быў момант ісціны, — успамінае Дзіна. — Я ўсвядоміла: у мяне невылечная хвароба, мне падалося, што я асуджаная». Але мне пашанцавала. Мяне натхнялі медыкі. А яшчэ ў цэнтр прыйшлі валанцёры, якія былі жанчын, якія пакутуюць на алкагалізм, каб паўдзельнічаць у праграме «Дай руку, сястра». Каля года наведвала псіхатэрапеўтычную групу, хадзіла на сустрэчы АА (ананімных алкаголікаў. — **В. П.**). І патроху стала здаравець. Калега кажа, што я «выскачыла з пашчы кракадзіла».

Паўтара першых года аказаліся для Дзіны вельмі цяжкімі. Але яна трывала. Сама занялася валанцёрствам, паступіла ў БДПУ імя М. Танка, каб вывучаць псіхалогію. Пасля трох гадоў цвярозасці, адчуўшы ўпэўненасць, парвала і з нікацінавай залежнасцю. Сёння Дзіна Іванаўна перакананая: любы чалавек можа выйграць барацьбу за сябе, трэба толькі вельмі захацець.

— Людзі перастаюць піць не таму, што баяцца смерці, а таму, што яны любяць жыццё, родных, свабоду, — упэўнена Дзіна. — Яны хочуць вярнуць шчасце, якое страцілі з-за згубнай звычкі. У мяне была велізарная матывацыя. Я разумела: калі пры сваёй цяжкай спадчыннасці я не спынюся, будзе піць і мой сын. Спраўлюся я, і Алег абярэ цвярозасць. У самыя цяжкія моманты казала сабе: «Піць ты не будзеш, лепш памрэш». А аднойчы сын нават прызнаўся: «Мама, калі б не ты, не твой прыклад пераадолення, я б у жыцці нічога не дамогся». Гэта стала для мяне самай вялікай узнагародай.

...Часам Дзіне Іванаўне сніцца, што ёй прапаноўваюць бутэльку, яна налівае спіртное ў шклянку і пачынае піць. Ад такіх кашмараў яна прачынаецца ў халодным поце, падымаецца і глыбока дыхае. Прыходзячы ў сябе, разумее: гэта проста сон. А насамрэч у яе ўсё добра.

Ёсць муж, ёсць выдатны сын-рэжысёр. Ёй падабаецца, як яна выглядае. Яна задаволеная сваёй работай, тым, што можа падарожнічаць, будаваць планы, марыць. Яна ўсё гэта заслужыла. Захацела і дастукалася да нябёсаў. І яе пачулі!

**Вольга ПАКЛОНСКАЯ.**

*Па этычных меркаваннях імя гераіні зменена.*

# КАЛІ СУТЫКНЕННЯ НЕ ПАЗБЕГНУЦЬ

## Нават канфлікт можа быць... карысны

**Кожны чалавек час ад часу аказваецца ў канфліктнай сітуацыі. Бывае, што ад яе канца можа залежаць будучыня як аднаго, так і некалькіх апанентаў. Пра тое, як варта дзейнічаць у спрэчцы, нам расказала Наталля РАДНЁНАК — псіхолаг, экзістэнцыяльны тэрапеўт.**

Калі канфлікт усё ж здарыўся, варта выразна разумець, з кім вядзецца спрэчка. У дадзенай сітуацыі сапернік можа быць упэўнены або няўпэўнены. У першым выпадку гэта шматслоўны чалавек, які не пазбягае высвятлення адносін, у другім — той, хто не раскрывае ўласных мэт, але пры гэтым можа ўпарта настойваць на сваім, хаваючы пад «прынцыповасцю» слабасць.

Псіхолаг распавяла пра тое, якіх правілаў неабходна прытрымлівацца падчас канфлікту.

— Самае першае і найлепшае, што можа зрабіць чалавек для спакойнага вырашэння, — адключыць эмоцыі і ўключыць розум. Тут добра дапамагае пытанне «для чаго я гэта раблю?». Варта выразна абазначыць для сябе, а таксама прыкладна агучыць іншаму мэту сутыкнення. Вельмі важна не дапусціць, каб эмоцыі бралі верх.

Акрамя таго, пры вырашэнні канфлікту неабходна выконваць шэраг іншых правілаў. Па-першае, не варта адразу аспрэчваць меркаванне, якое не супадае з вашым, капіраваць тон, рэзкасць і агрэсіўнасць правакатара ці адказваць на атаку тым жа.

Па-другое, важна праяўляць увагу да суразмоўніка, памяркоўнасць да яго асаблівасцяў. Не варта перарываць чалавека, калі ён агучвае тое, што вам ужо вядома. Замест гэтага найлепшым дзеяннем будзе прамы паўтор, інтэрпрэтацыя або абагульненне падчутага — такім чынам апанент зразумее, што яго словы дайшлі да супрацьлеглага боку.

Па-трэцяе, у момант, калі сапернік завершыць выказванне, неабходна спакойна агучыць думку пра тое, што яго пазіцыя «вельмі цікавая і яе можна было б прыняць».

Па-чацвёртае, важна пазбягаць сутыкненняў асабістага характару. Не варта прымаць ненарматыўную лексіку і абразы на свой кошт. Трэба разглядаць апанента такім, якім ён сябе паказвае, не спрабаваць заклікаць да захавання прыстойнасці.

Па-пятае, неабходна гаварыць з суразмоўнікам на зразумелай яму мове, пазбягаючы слоў-паразітаў. Не дэманстраваць сваю інтэлектуальную перавагу.

У дапаўненне да гэтага, у канфлікце не трэба спяшацца са зваротнай рэакцыяй, лепш за ўсё вытрымліваць невялікія паўзы. Мэтазгодна казаць суразмоўніку пра свае пачуцці і эмоцыі, выкліканыя яго словамі. Таксама важна пазбягаць закрытых поз (напрыклад, не складваць рукі на грудзях), не глядзець апаненту прама ў вочы — гэтае дзеянне можа выклікаць агрэсію.

— Канфлікт — гэта не дрэнна і не добра. Ён проста быў, ёсць і будзе. Усе людзі розныя, іх каштоўнасці таксама, у кожнага ёсць права не згаджацца. І гэта трэба прыняць. Таму сутыкненняў не варта баяцца і пазбягаць.

Наталля расказвае, што канфлікт у любым выпадку непазбежны, і неабходна навучыцца здабываць з яго карысць.

— Калі мы з чымсьці нязгодныя, мы сябе абмяжоўваем. Канфлікт дае выдатны шанц паглядзець на сітуацыю з розных бакоў, «пачуць», разгледзець свае каштоўнасці і каштоўнасці іншага. Разбіраючы спрэчныя сітуацыі, мы маем шмат магчымасцяў: акрэсліць сваю пазіцыю, даведацца межы іншага, умацаваць веру ў нешта, змяніць свае каштоўнасці, аб'яднацца і гэтак далей.

Па словах псіхолага, галоўнае — памятаць мэту і не забываць пра максімальную павагу да апанента.

— У любым канфлікце мы ўсведамляем і прымаем уласныя змены і змены іншага, — тлумачыць Наталля.

**Лізавета МАЛЬЧУК, студэнтка III курса факультэта журналістыкі БДУ.**

# А Я ЛЮБЛЮ ЖАНАТАГА...

## Адносіны з мужчынам, у якога ёсць жонка, выгадныя толькі самому мужчыну

**Раман з жанатым мужчынам асуджаецца ва ўсіх культурах і ва ўсе часы, як бы ні мяняўся свет. Тым не менш гэты шлях абдумана ці не задумваючыся выбіраюць многія жанчыны. І ўсе яны спадзяюцца на асабістае шчасце. Але ці ёсць будучыня ў адносін з жанатым мужчынам?**



Прычын, па якіх мужчыны ўступаюць у блізкія адносіны з іншай жанчынай, захоўваючы шлюб, можа быць некалькі, і ўсе яны відавочныя, адзначае **сямейны псіхолаг Сяргей ЯРАВЕЦ.** Мужчына прыходзіць да гэтага ў пошуках новых уражанняў і эмацыянальных перажыванняў, шукае пацвярджэнне сваёй значнасці, хоча даказаць, што «не здаецца ў палон узросту» або лічыць, што палюбоўніца «патрэбна яму па статусе».

> **«Знаходзіцца ў становішчы палюбоўніцы весела і прыемна толькі ў анекдотах. У рэальным жыцці гэта азначае пастаянную ўнутраную барацьбу, неадступныя думкі пра тое, што ў каханага ёсць іншая, якая мае больш праваў быць з ім побач».**

— У любым выпадку мужчына ў дадзенай сітуацыі знаходзіцца ў выйгрышнай пазіцыі. Ён на вяршыні любоўнага трохкутніка, а каля падножжа «пірамiды» за яго змагаюцца дзве жанчыны. Вось, дарэчы, і адказ на пытанне, ці варта палюбоўніцы спадзявацца на шчаслівыя для яе перамены. У 90 % выпадкаў, нягледзячы на неабходнасць канспірацыі ды іншыя нязручнасці (сцэны рэўнасці жонкі, патрабаванні палюбоўніцы развесціся) яму выгадна захоўваць усё як ёсць, — расказвае суразмоўца.

## КАМУ ГЭТА ПАДЫХОДЗІЦЬ

Зрэшты, ёсць жанчыны, якіх цалкам задавальняе роля палюбоўніцы, адзначае псіхолаг. Гэта людзі асаблівага псіхалагічнага складу. Жанчыны, якім падсвядома падабаецца «змагацца за каханне»: адсутнасць перашкод для іх азначае страту цікавасці да прадмета сваіх пачуццяў. І калі мужчына ўсё ж сыдзе з сям'і і звяжа лёс з такой жанчынай, вельмі хутка яна пакіне яго і адправіцца на пошукі новых «няпростых адносін». Або «моцныя і самадастатковыя» паненкі, якія аддаюць перавагу сувязі без абавязацельстваў. Бо, у адрозненне ад жонкі, палюбоўніца пазбаўленая бытавых праблем, на яе долю застаюцца толькі радасці: падарожжы, падарункі і «кожная сустрэча як свята».

Але ў большасці выпадкаў, кажа Сяргей Яравец, адносіны «жанаты мужчына — палюбоўніца», якія доўжацца гадамі, а часам і дзесяцігоддзямі, выгадныя не палюбоўніцы, а мужчыну і, як ні парадаксальна, яго жонцы.

— Многія сучасныя сем'і ствараюцца па адным сцэнарыі і маюць у агульных рысах падобную гісторыю. Пазнаёміліся ў 18—22 гады, пажаніліся ў 23—25, гадоў у 26—27 нарадзілі першае дзіця, і праз год-два любоўная лодка разбілася аб побыт. Пачуцці прайшлі, а сям'я засталася: бацькоўскія абавязкі, выплаты па крэдытах і іншае, і іншае. На развод рашаюцца далёка не ўсе. Але прычына захавання сям'і — ужо не пачуцці.

Развод — гэта сур'ёзны крок і кардынальныя перамены ў жыцці. Для мужчыны гэта можа азначаць расстанне з дзецьмі (роля «нядзельнага таты», што прыходзіць па выхадных, задавальняе далёка не кожнага) і страту ранейшага ўтульнага побыту. Для жанчыны гэта змена статусу з замужняй дамы на «развядзёнку», і хоць грамадства ставіцца сёння да разведзеных жанчын лаяльна, усё ж у гэтым прыемнага мала. Плюс неабходнасць дзяліць жылплошчу і сумесна нажытую маёмасць. І вельмі часта муж і жонка вырашаюць жыць разам, але кожны — сваім уласным жыццём. Ён заводзіць палюбоўніцу, яна зміраецца або таксама шукае адносін па-за межамі сям'і. Вядома, жонка здагадваецца пра «трэцюю лішнюю», але альбо хавае праблему ад самой сябе, займаючыся самападманам, альбо заплюшчвае на гэта вочы — калі муж вытрымлівае правілы прыстойнасці і канспірацыю. І такі «трохкутнік» — вельмі ўстойлівая фігура, кажа спецыяліст. Так людзі часам жывуць дзесяцігоддзямі.

Такім чынам, вельмі часта адзіным незадаволеным бокам аказваецца менавіта палюбоўніца, якую мужчына заклікае абяцаннямі. Падтрымлівае ў ёй надзею, што сыдзе з сям'і і ажэніцца з ёй — вось толькі трэба пачакаць, пакуль дзеці падрастуць/вырашацца праблемы на працы/яго бізнес устане на ногі/выздаравеюць бацькі (якім цяпер нельга расказаць пра яго новае каханне) і гэтак далей. Варыянтаў маса.

— На самай справе, палюбоўніца можа чакаць і спадзявацца, але статыстыка няўмольная: як паказвае практыка, калі мужчына не сышоў з сям'і пад уздзеяннем бурных пачуццяў у першыя два месяцы новых адносін, хутчэй за ўсё, ён не скасуе свой шлюб ніколі, — адзначае псіхолаг.

Для большасці жанчын (якія не адносяцца да двух вышэйапісаных тыпаў) пачуцці да несвабоднага мужчыны — гэта імкненне запоўніць пустэчу, і з часам такая любоў рызыкуе ператварыцца ў залежнасць, падкрэслівае суразмоўнік. Спадарожнікі гэтай залежнасці — нізкая самаацэнка, страта самапавагі, адчуванне адзіноты, балючая рэўнасць да жонкі выбранніка. І ўсё гэта, відавочна, не спрыяе магчымасці адчуць сябе шчаслівай.

## ПАСПАЧУВАЕМ ПАЛЮБОЎНІЦЫ

Наўрад ці нехта калі-небудзь добраахвотна імкнуўся ў залежныя адносіны. Уяўляючы ў дзяцінстве сваё дарослае жыццё, наўрад ці дзяўчынка плануе растварацца ў некім, забыўшыся на ўласныя інтарэсы, пакутаваць і бясконца чакаць. Усім дзяўчатам і жанчынам з ранняга юнацтва вядома, што каханне да жанатага мужчыны асуджаецца грамадствам — так выхоўвалі дзяўчат 50 гадоў таму, так выхоўваюць і сёння. Палюбоўніца — гэта разлучніца, разбуральніца сямейнага шчасця. Але... жыццё можа распарадзіцца інакш.

— Жанчыну, якая доўгія гады знаходзіцца ў статусе палюбоўніцы і чакае, што мужчына абярэ, нарэшце, яе, псіхолагі называюць «вечнай палюбоўніцай», — кажа спецыяліст.

«Вечныя палюбоўніцы», уцягнутыя ў гэтую сітуацыю супраць волі, спрабуюць пратэставаць, час ад часу ладзяць свайму мужчыну сцэны, але не адмаўляюцца ад адносін са сваім жанатым выбраннікам і не імкнуцца вызваліцца ад знясільваючага статусу, каб стварыць уласную сям'ю. Уся справа ў тым, што такіх жанчын палохае нявызначанасць, яны не гатовыя паспрабаваць жыць па-іншаму. І калі мужчына і пакіне сям'ю, то наўрад ці дзеля «вечнай палюбоўніцы».

— Знаходзіцца ў становішчы палюбоўніцы весела і прыемна толькі ў анекдотах. У рэальным жыцці гэта азначае пастаянную ўнутраную барацьбу, неадступныя думкі пра тое, што ў каханага ёсць іншая, якая мае больш праваў быць з ім побач. Быць палюбоўніцай — значыць адчуваць, што вашы адносіны з самага пачатку, хутчэй за ўсё, не маюць будучыні, згаджацца на «другую ролю», вытрымліваць канспірацыю і наступаць на ўласную самапавагу. Выбіраюць статус «вечнай палюбоўніцы» або раз за разам уступаюць у адносіны з жанатымі мужчынамі, як правіла, жанчыны з сур'ёзнымі псіхалагічнымі праблемамі. Тыя, хто згодны не пісаць і не тэлефанаваць любімаму, заставацца ў адзіноце на святы і выхадныя (якія мужчына праводзіць з сям'ёй), не карыстацца парфумам падчас спатканняў і г. д. А таксама пастаянна весці ўнутраны маналог, апраўдваючы свайго мужчыну, шукаць шляхі вырашэння яго праблем (шляхі, якія ён ніколі не прыме) і верыць ва ўсе яго адгаворкі пра тое, што перашкаджае яму сысці з сям'і.

Прывіднасць і нявызначанасць статусу палюбоўніцы не дае ёй ніякіх правоў, кажа псіхолаг. Калі ж яна прыпрэ яго да сценкі: «Або я, або яна!», нішто не перашкаджае яму пакінуць дакучлівую палюбоўніцу і знайсці іншую, больш стрыманую.

## АБ ГАДЗІННІЧКУ, ЯКІ ЦІКАЕ

А цяпер успомнім аб тым самым «біялагічным гадзінніку», які, як вядома, цікае. Маладосць жанчыны, на жаль, карацейшая за мужчынскую, і адносіны з жанатым — гэта страта часу ў першую чаргу для «трэцяй лішняй». Выдаткаваўшы яго на бесперспектыўныя адносіны, прачакаўшы гады, верачы абяцанням, жанчына не паспявае стварыць уласную сям'ю і стаць маці. Час сыходзіць незваротна ў чаканні кароткіх сустрэч: гадзіны складаюцца ў месяцы, а месяцы — у гады. І ўсе гэтыя гады галоўны спадарожнік «вечнай палюбоўніцы» — адзінота. Быццам, любімы ёсць, але яго ніколі няма побач. Большая частка часу вашага каханага належыць сям'і і дзецям. А ёсць яшчэ яго праца, бацькі, сябры, хобі... Ён — гаспадар сітуацыі: вы сустракаецеся з ім, калі ён гэтага хоча, жаданне ж палюбоўніцы тут ролі не адыгрывае. Дададзім неабходнасць памятаць яўкі і паролі, тэлефанаваць у дакладна абумоўлены час, не мець зносіны ў месенджарах (раптам ён забудзе выдаліць паведамленне?) і хавацца ад яго знаёмых, калі вы разам. Іншае імя такой канспірацыі — прыніжэнне, і яно атручвае жыццё. Дык ці варта марнаваць маладосць на чаканне прывіднага шчасця?

> **Вядома, жонка здагадваецца пра «трэцюю лішнюю», але альбо хавае праблему ад самой сябе, займаючыся самападманам, альбо заплюшчвае на гэта вочы — калі муж вытрымлівае правілы прыстойнасці і канспірацыю.**

— Зразумела, з любога правіла бываюць выключэнні: здараецца, у палюбоўніцы ўсё ж атрымліваецца звесці мужчыну з сям'і. Бываюць нават гісторыі са шчаслівым канцом: жылі доўга і шчасліва, ён стаў сапраўдным сем'янінам. Але значна часцей у такіх гісторый сумны фінал — сумны менавіта для палюбоўніцы. І нават калі вы стварылі сям'ю з мужчынам, якога адабралі ў першай жонкі, ці будзеце вы задаволены? Напэўна, жыццё вам будуць атручваць падазрэнні («Здраджваў першай жонцы са мной — чаму б яму не здрадзіць цяпер і мне?»), рэўнасць да былой жонкі («Хоча да яе вярнуцца!»), непражытыя крыўды («Як доўга ён вырашаў!»). І вельмі хутка ваша бясхмарнае шчасце перастане быць бясхмарным. Задайце сабе пытанне: ці згодны вы прытрымлівацца гэтага сцэнарыя? Ці сапраўды вартая вас тая мэта, якую вы перад сабой ставіце? І ці добра вы разумееце, што будзеце рабіць са сваім «прызам»?

**Дзіяна РОНІНА.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ АУКЦИОНА
(в процедуре банкротства)

**Дата, время, место проведения торгов: 06.10.2021 11.00 г. Борисов, ул. Толстикова, 2**

| Лот | Сведения о предмете торгов | Земельный участок (кадастровый номер) | Начальная цена, руб. | Сумма шага аукциона, руб. |
|---|---|---|---|---|
| № 1 | здание складов (растворный узел), инв. № 610/С-29955<br>здание склада РСУ, инв. № 610/С-30011<br>здание склада РСЦ, инв. № 610/С-29943 | № 620850100010001937 | **61 100,00** | 3 055,00 |
| № 2 | здание склада серной кислоты, инв. № 610/С-30101<br>здание гаража легковых автомобилей, инв. № 610/С-30098<br>здание «Теплопункт», инв. № 610/С-29890<br>здание пожарного поста и склада, инв. № 610/С-30089 | № 620850100010001938 | **294 200,00** | 14 710,00 |
| | здание станции нейтрализации кислот, инв. № 610/С-30039 | № 620850100010001923 | | |
| № 3 | здание энергоцеха, инв. № 610/С-29987<br>здание насосной станции, инв. № 610/С-30507<br>отстойник шлама, инв. № 610/С-60043 | № 620850100010001936 | **294 300,00** | 14 715,00 |
| № 4 | здание компрессорной, инв. № 610/С-29880<br>здание насосной станции, инв. № 610/С-29915 | № 620850100010001935 | **113 300,00** | 5 665,00 |

**Местонахождение предмета торгов:** Республика Беларусь, г. Борисов, ул. Толстикова, 2. Ознакомиться с предметом торгов можно по месту его нахождения, по согласованию с продавцом.

**Продавец:** ПРУП «Борисовский хрустальный завод имени Ф. Э. Дзержинского», тел. +375447612337.

**Организатор торгов:** ООО «Консалтинговый центр МБА», г. Минск, ул. Мясникова, 39, комн. 331, тел. +375291070012.

**Заявления принимаются с 01.09.2021 9.00 по 05.10.2021 16.00 г. Борисов, ул. Толстикова, 2.**

*Претенденты вносят задаток в размере 10 % от начальной цены в срок не позднее даты окончания приема заявлений на р/с ПРУП «Борисовский хрустальный завод имени Ф. Э. Дзержинского» № BY14BAPB30123193800100000000 ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, БИК BAPBBY2X, УНП 600012031.*

Срок возможного отказа от проведения торгов – не менее чем за 5 дней до даты их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) возмещает затраты, связанные с организацией и проведением торгов в размере, установленном сметой расходов на проведение аукциона. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов заявление с приложением необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах. Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. В случае признания аукциона несостоявшимся предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %. Договор купли-продажи предмета торгов подписывается с победителем аукциона в срок не позднее 20 дней от даты подписания протокола о результатах аукциона. Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет продавца, копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица, легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Ограничения: кроме размещения деревообрабатывающих производств.

---

Торги, назначенные на 20.09.21 г. – отменены

## ТОРГИ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор торгов** | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| **Продавец** | **СООО «Бивер Трейд», 211260, Витебская область, г. п. Шумилино, ул. Северная, 9** |

**Предмет торгов**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена |
|---|---|---|
| 793 | Прицеп лесовоза, IN.PROIZV ЕР24М3РВ, гос. № А5545А | 9 747,24 |
| 794 | Прицеп лесовоза СМТ РТ12-20, гос. № 5282А-2 | 14 498,71 |
| 795 | Оцилиндровочный «Мастер ОЦ-550» | 15 591,43 |
| 796 | Набор шкафов и стол темно-коричневого цвета | 3 849,11 |
| 797 | Набор мебели «Консул» 3+1+1 – красный цвет | 2 232,98 |

**расположенные по адресу:**
Витебская обл., Шумилинский р-н, г. п. Шумилино

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **1 250,00 бел. руб.**

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: www.torgi24.by.

Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: info@torgi24.by.

Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 02.09.2021 по 01.10.2021 до 17.00.**

Дополнительную информацию о проведении торгов можно получить по тел.: +37529-6077681, +37529-6703084.

**Дата и место проведения торгов 05.10.2021 г. в 11.00, г. Минск, ул. Антоновская, 2, каб. 17**

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by.**

---

### Могилевский филиал
## РУП «Институт недвижимости и оценки»
### информирует о проведении 17.09.2021 повторного аукциона по продаже имущества ЗАО Банк ВТБ (Беларусь)

**Лот № 1: изолированное помещение с инв. № 700/D-85447 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл. 1478,4 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85854 – изолированное помещение образовательного, воспитательного и научного назначения**, общ. пл. 744,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3-2. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85857 – бомбоубежище**, общ. пл. 184,9 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. **Изолированное помещение с инв. № 700/D-85450 – нежилое изолированное помещение**, общ. пл 42,3 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Белинского, 3. Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 740100000002000531 (площадь – 1,0722 га, право постоянного пользования, доля в праве 197/1000). Отдельный земельный участок для обслуживания лота № 1 не выделен. Обременение: аренда.

***Начальная цена продажи: 705 832,44 бел. руб. с учетом НДС.***

**Аукцион состоится 17 сентября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона ino.by.

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»,** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.

Доп. информацию можно получить по тел.: **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, +37529-550-09-56** и на сайте **ino.by**

---

## ООО «Фикс Прайс Запад»
### УВЕДОМЛЯЕТ О ВЫЯВЛЕНИИ НЕДОБРОКАЧЕСТВЕННОЙ ПРОДУКЦИИ

**Изделия трикотажные бельевые женские торговой марки Lady Collection: трусы женские.**

Арт. UDWA, импортер: ООО «Бэст Прайс», РФ, 141401, Московская обл., г. Химки, ул. Победы, д. 11; производитель: Union Source CO LTD Юнион Соурс Ко., ЛТД, Эт.20, № 1, Билдинг Нинбо Рисёч Девелопмент Парк, 399 Цзюсянь Роуд Нэшнл Хай-Тэк Зоун, Нинбо, 315103, КНР. Состав: 94 % хлопок, 6 % эластан; ш.к. 55031875, дата производства 10.2020, срок годности не ограничен – продукция не соответствует Приложению 2 Технического регламента таможенного Союза 017/2011 "О безопасности легкой промышленности» по показателю «гигроскопичность».

Продукция была снята с реализации и изъята из обращения во всех торговых объектах ООО «Фикс Прайс Запад». Изъятая из обращения продукция утилизирована.

Для недопущения поступления в обращение вышеуказанной продукции ООО «Фикс Прайс Запад» заблокировало ее к поставкам в Республику Беларусь, а также уведомило поставщиков о выявлении недоброкачественной продукции. Аналогичной продукции, принадлежащей ООО «Фикс Прайс Запад» на складах РУП «Белтаможсервис» нет.

УНП 193351144

---

07.09.2021 г. в 14.00. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект».

Повестка дня

1. О совершении сделок общества.
2. О составе наблюдательного совета Общества.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Кирова, 17.

Время регистрации в день проведения собрания – с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 02.09.2021 г. (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Дата сбора реестра акционеров – 02.09.2021 г.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

---

Печать, свидетельство и штампы ООО «Лестака Инвест» (УНП 193273530; г. Минск, пр-д Бетонный, д. 19А, пом. 5) **считать недействительными.**

---

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ»
## ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**

Продавец: **ОАО «Житковичлес»** (УНП400049968), 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80, в лице ликвидатора Лахвича Василия Адамовича, тел. 8 (02353) 2-18-74.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **21 сентября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС | Задаток (10 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6086 ЕК-3, 2018 г. в. | 28 428,75 | 2842,88 |
| 2 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ 5-11, гос. № 6089 ЕК-3, 2010 г. в. | 23 028,00 | 2302,80 |
| 3 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 4548-3 ЕК, 2018 г. в. | 23 392,80 | 2339,28 |
| 4 | Автомобиль МАЗ 6303-А8, гос. № АЕ 7921-3, с манипулятором гидравлическим М-75-04, 2010 г. в. | 26 316,90 | 2631,69 |
| 5 | Прицеп МАЗ 837810 (022), гос. № А 4816 А-3, 2010 г. в. | 7310,25 | 731,03 |
| 6 | МАЗ-5551 Самосвал, гос. № АВ 33-55-3, 1991 г. в. | 6170,40 | 617,04 |
| 7 | Автомастерская ЗИЛ 131 ПРМ, гос. № АІ 3858-3, 1990 г. в. | 4166,70 | 416,67 |
| 8 | Автомашина «Урал 4320-3», гос. № ЕМ 6265, 1996 г. в. (без постановки на учет) с гидроманипулятором ПЛ 70-02, 2002 г. в. | 8974,80 | 897,48 |
| 9 | Автомобиль УАЗ*390945*330 № двиг. 409100*В3044904, № шасси 330360В0459912, гос. № АІ 1144-3, 2010 г. в. | 5049,00 | 504,90 |
| 10 | Легковой автомобиль «Фольксваген Пассат», гос. № 2054 ВС-3, 1998 г. в. | 4487,40 | 448,74 |
| 11 | Полуприцеп УПП1212, 1993 г. в. (без постановки на учет) | 1994,40 | 199,44 |
| 12 | Газ 53 Автоцистерна АЦ-4.2, гос. № АА 9628-3, 1983 г. в. | 8476,20 | 847,62 |
| 13 | Автомобиль УАЗ-452, гос. № 7844-3 АО, 1980 г. в. | 3553,00 | 355,30 |
| 14 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04, гос. № 1663-3 АМ, двиг. № 409110*Н3036855, VIN: ХТТ 390995J202995, 2017 г. в. | 12 427,90 | 1242,79 |
| 15 | МАЗ-53336 (бортовая), гос. № АК 21-49, 1991 г. в. | 7479,00 | 747,90 |
| 16 | Прицеп бортовой МАЗ 8926, гос. № 3785 АА, 1993 г. в. | 2243,70 | 224,37 |
| 17 | Автопогрузчик (львовский), 1990 г. в., инв. № 000260 | 3926,70 | 392,67 |
| 18 | Грузовой бортовой ГАЗ-66-12, гос. № 4033-3 АМ, ш. 0456045, дв. 109082, 1986 г. в. | 6856,20 | 685,62 |
| 19 | Автомобиль «Урал-375», гос. № 0813-3 АМ, 1980 г. в., (без постановки на учет) | 5624,95 | 562,50 |
| 21 | Брусующий станок TS 52-2R, инв. № 231 | 11 219,50 | 1121,95 |
| 22 | Многопильный станок DS-55-IR, инв. № 233 | 10 658,05 | 1065,81 |
| 23 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 с дв. 30/1500 люб. вращения ХВ, инв. № 238 | 1776,50 | 177,65 |
| 24 | Вентилятор ВЦП6-45 № 8 без электродвигателя ХВ, инв. № 318 | 177,65 | 17,77 |
| 25 | Пилорама РПМ -02-К б/у, инв. № 397 | 4144,85 | 414,49 |
| 26 | Станок строгальный 4х сторон, инв. № 45 Т | 5921,35 | 592,14 |
| 27 | Станок Ц-6-2, инв. № 54 Т | 710,60 | 71,06 |
| 28 | Станок ШЛД-6, инв. № 56 Т | 1184,65 | 118,47 |
| 29 | Лесопильная рама ЛРВ-1 № 6951, инв. № 514 | 5624,95 | 562,50 |
| 30 | Станок брусовочный двухвальный | 11 219,40 | 1121,94 |
| 31 | Вентилятор ВЦП 7-40 № 8 без эл. дв., инв. № 565 | 1184,65 | 118,47 |
| 39 | Молот пневматический, инв. № 000885 | 2804,40 | 280,44 |
| 40 | Станок сверлильный 2Н 135, инв. № 001310 | 727,00 | 72,70 |
| 41 | Станок вертикально-фрезерный, инв. № 001311 | 1385,00 | 138,50 |
| 42 | Мотопомпа, инв. № 001427 | 1402,20 | 140,22 |
| 43 | Гидроманипулятор ОМТЛ-97, инв. № 262 | 3366,00 | 336,60 |
| 44 | Станок мод. В3-367 точильно-шлифовальный, металлореж, инв. № 36 | 394,25 | 39,43 |
| 45 | Заточной станок Б/У, инв. № 68 | 132,05 | 13,21 |
| 46 | Пост для ремонта легковых автомобилей, инв. № 001666 | 1402,20 | 140,22 |
| 48 | Кондиционер GREE GWH07AAA-K3NNA2A, инв. № 503 | 355,30 | 35,53 |
| 49 | Кондиционер GREE GWH12AAB-K3NNB2A, инв. № 504 | 414,20 | 41,42 |
| 50 | Кондиционер GREE GWH12NA-K3NNB3A/2, инв. № 487 | 414,20 | 41,42 |
| 51 | Кондиционер GREE GWH07NA-K3NNB3A, инв. № 488 | 355,30 | 35,53 |
| 52 | Автомобиль УАЗ 390995-460-04 № 0407-3 АМ, 2017 г. в. | 11 626,20 | 1162,62 |
| 54 | Станок многопильный деревообрабатывающий ЦМР-3 с рольгангами неприводными 3.000 (2 шт.), инв. № 563 | 5540,40 | 554,04 |
| 55 | Машина транспортно-погрузочная лесная МТПЛ-5-11, гос. № 5460-3 ЕК | 29 925,00 | 2992,50 |
| 57 | Бензопила MS361 № 183864091 | 414,50 | 41,45 |
| 58 | Бензопила MS361 № 172157104 | 414,50 | 41,45 |

**Местонахождение:**
**1 – Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Комсомольская, 45а,**
**2 – Гомельская обл., Житковичский р-н, п. Хвоенск.**
**Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-18.**

**Для участия в торгах необходимо в срок** с 02.09.2021 г. 09.00 по 20.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 10.08.2021, 16.07.2021 г.

Гісторыя з канверта

# Як Сцяпанавіча жанілі

Кот Фёдар з вышыні сёмага паверха з цікаўнасцю назіраў за вераб'ямі. Яго гаспадыня Кацярына смажыла катлеты і складвала ў рондальчык — збіралася да сяброўкі на лецішча з катом, хай па траўцы пагуляе.

Сення Кацярына будзе знаёміць сяброўку са Сцяпанавічам. Чалавек ён добры, хоць і празмерна педантычны. Стаміўся ад адзіноты, а з Любай яны будуць добрай парай. Абодва хударлявыя, працавітыя, адзінокія.

Люба папрасіла дапамагчы ў падвязцы кустоў у агародзе, і Каця паклікала з сабой Сцяпанавіча. Ведаючы яго ахайнасць і насцярожанае стаўленне да катоў, прыкідвала, як сказаць, што Фёдар паедзе з імі.

Ужо дзесяць гадоў Сцяпанавіч трывае нервовае напружанне на агульнай кухні з былой жонкай. Ён рэгулярна прыбірае пыл, а яна на злосць смеціць. Ад гэтага Сцяпанавіч перажывае, худнее і сохне, а былая пераможна рагоча і таўсцее. Вярнуўшыся з санаторыя, Сцяпанавіч знайшоў свой посуд, які старанна мыў і дэзынфіцыраваў, у павуціне пад ваннай.

Чаша цярпення перапоўнілася, і Сцяпанавіч прыняў цвёрдае рашэнне змяніць жыццё. Ён пагадзіўся пазнаёміцца з Кацінай сяброўкай. Люба жыла адна ў двухпакаёвай кватэры, мела лецішча і дванцаць сотак чарназёму.

Раніцай Сцяпанавіч прыехаў на сваёй машыне. Кацярына памахала яму з балкона. Мужчына зразумеў гэта як знак запрашэння і праз хвіліну ўжо стаяў каля парога. Каця ўздыхнула і, прадбачліва зачыніўшы дзверы ў пакоі, запрасіла ўвайсці. Госць акінуў уважлівым позіркам памяшканне і зняў начышчаныя чаравікі. Пах туалетнай вады запоўніў пярэдні пакой.

— Аладкі будзеце?

— Мабыць. Даўно іх не еў.

Сцяпанавіч смакаваў аладкі. Ён яшчэ не здагадваўся, што кот едзе з імі. А Фёдар прыглядаўся і прынюхваўся да госця.



Праз некалькі хвілін спускаліся да машыны.

Катоў Сцяпанавіч на дух не пераносіў, але на гэты раз вырашаўся яго лёс, і ён, пераадольваючы непрыязнасць, нават пагладзіў жывёлінку. Убачыўшы вымытую да бляску машыну, Каця зразумела, што ідзя ўзяць Фёдара была дрэнная.

Сцяпанавіч галантна адкрыў дзверцы, і Каця з Фёдарам на руках села на аксамітавае сядзенне. Сцяпанавіч дастаў белую сурвэтку і працёр бездакорна чыстае шкло. У Каці ўзнікла падазрэнне: ён дэзынфіцыруе ўсе свае рэчы.

Машына кранулася. Кот напружыўся ў Каці на каленях і спалохана паглядзеў у акно.

Раптам ён вырваўся і пачаў даследаваць машыну па перыметры, у тым ліку пад нагамі кіроўцы. Сцяпанавіч мужна выносіў гэтае свавольства, але твар яго выказваў пакуты. Каця, злавіўшы Фёдара, міралюбна паабяцала:

— На лецішчы пачышчу машыну.

Сцяпанавіч ветліва рыпнуў зубамі: «Пачышчу сам».

...Люба ў шортах і майцы сустрэла іх каля брамы. Яна трымала вядро з разведзеным курыным памётам. Пах уразіў гарадскіх жыхароў.

— Я ж памідоры падкормліваю! — патлумачыла гаспадыня.

Госцю даручылі падрыхтаваць усё каля вогнішча ў садзе. Сцяпанавіч адкрыў багажнік, у якім выявіўся цэлы склад. Дастаў акуратна складзены выпрасаваны камбінезон і працоўныя туфлі, пайшоў пераапранацца. Куды падзецца, калі ўжо прыехаў.

Потым яны насілі з калонкі ваду і налівалі ў кадку. Сумесная праца неяк зблізіла — жартавалі, смяяліся. Пасля Каця памыла рукі ў кадцы і прапанавала памыцца Сцяпанавічу.

— Я зараз, — ён кідаўся ад кадкі як чорт ад ладану, дастаў з багажніка бутэльку з вадой і чыстыя сурвэткі. Рукі мыў доўга і старанна. Селі за стол, выпілі па чарцы і схапіліся за лыжкі. Госць затармазіў, разглядаючы алюмініевую лыжку пад рознымі вугламі. Яна была ў дробных увагнутасцях і чорных кропачках. Каця падала іншую, папераджальна апаласнуўшы яе кіпенем, і падумала: «Як ён тут, пры такой ахайнасці, прыжывецца?» Перасіліўшы гідлівасць, Сцяпанавіч закусіў.

Пасля абеду падвязалі кусты. А ўвечары ў кампаніі суседзяў гатавалі шашлыкі ў садзе. Гарэла вогнішча, весела патрэскваючы і адганяючы камароў.

Суседка прынесла гітару, і над пасёлкам паплыў высокі чысты голас. Песня расказвала пра каханне. Кот Фёдар ляжаў на бервяне каля вогнішча, ён таксама марыў у гэтую зорную ноч. Віно саграваля і кружыла галаву, песня будзіла пачуцці. Люба падлівала Сцяпанавічу напой, сэрца стукала, і рука неспадзявана дакранулася да яго рукі.

Сцяпанавіч дзякаваў і збянтэжана адсоўваў келіх:

— Не люблю спіртное, люблю салодкае!

Летнія ночы кароткія. Каця шапнула Любе:

— Ні пуху ні пер'я, — і пайшла з катом начаваць да суседкі, што для Сцяпанавіча стала нечаканасцю.

— Не пакідайце мяне аднаго, — прашаптаў ён, схапіўшы Кацю за руку, з-за чаго кот ірвануўся і знік у траве. — Я некалькі гадоў не быў блізкі з жанчынай... Прабачце, я адчуваю, што магу быць з вамі адкрытым, — збянтэжана прызнаўся ён.

— Не турбуйцеся, Люба вас не кране, — супакоіла яго Каця і пабегла лавіць ката.

Сцяпанавіч адчуваў няёмкасць. Адпраўляючыся на дачу, ён быў гатовы да перамен, але цяпер панічна баяўся абняславіцца і выглядаць смешным. Яго кінула ў холад. Хударлявае цела сціснулася, лапаткі завастрыліся, касцістыя рукі неспакойна абтрасалі пінжак. Па-здрадніцку падціскаліся і без таго тонкія вусны. Ён сапраўды даўно не сустракаўся з жанчынамі.

Сцяпанавіч разумеў, што ў такім стане не варта нават рыпацца. Разам з тым не выклікала сумненняў, што жанчына вызначана чакае ад яго дзеянняў. З-за напліву эмоцый у яго падняўся ціск, забалела галава. Ён выпіў таблетку.

Люба паслала сабе на іншай канапе. Пакой цьмяна асвятляў ліхтар за акном.

— Вам зручна? — спытала гаспадыня.

— Так, дзякуй, — пахаладзеў Сцяпанавіч.

Яна паднялася папіць.

— Можа, вады падаць?

— Не, дзякуй.

Люба вярнулася на канапу, Сцяпанавіч уздыхнуў. Ён не спаў, думаў пра Любу. Яна таксама не спала, думала пра Сцяпанавіча. Было ясна: Сцяпаныч не арол.

Абодва гэта адчувалі, абодвум было нязручна. Пакруціўшыся ў ложку, Люба зрабіла адчайны крок:

— Вы не спіце?

Сцяпанавіч маўчаў. Люба, пачакала:

— Я чую, не спіце! Можа, дапамагчы заснуць? — і... нырнула да яго пад коўдру...

Цяпер Люба і Сцяпаныч жывуць разам. Лецішча стала проста казкай. Сцяпаныч даводзіць усё да ідэальнага стану. А Каця радуецца за сяброўку, у якой усё добра.

**Валянціна БЫСТРЫМОВІЧ.**

## ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

### З ЗЯЛЁНЫХ ПАМІДОРАЎ

**Рэзкі джэм**



***Спатрэбіцца:*** *зялёныя памідоры — 1,5 кг, цукар — 2 шклянкі, сок аднаго лімона, 1 палачка карыцы, 0,5 ч. л. духмянага перцу, кавалачак свежага імбіру.*

Памідоры разрэжце і выдаліце насенне. Нарэжце мякаць кубікамі. Імбір надзярыце на тарцы, змяшайце з памідорамі, дадайце цукар і сок лімона, размяшайце і пакіньце сумесь на ноч. На наступны дзень выліце масу ў рондаль, пакладзіце палачку карыцы і 0,5 ч. л. духмянага перцу. Давядзіце да кіпення і варыце на слабым агні на працягу 10 хвілін і зноў пакіньце на ноч. На наступны дзень давядзіце сумесь да кіпення яшчэ раз, пракіпяціце 15 хвілін, разліце па стэрылізаваных слоіках і закруціце.

**Зялёны кетчуп**



***Спатрэбіцца:*** *зялёныя памідоры — 3 кг, цыбуля рэпчатая — 1,5 кг, молаты чорны перац — 2 ч. л., сухая гарчыца — 1 ст. л., сушаныя травы (арэгана, базілік, чабор) — 2 ч. л., яблычны воцат — 1 шклянка, цукар — 0,5-1 шклянка.*

Памідоры і цыбулю нарэжце кубікамі, пакладзіце ў вялікі рондаль, дадайце перац і гарчыцу. Травы загарніце ў мяшочак з марлі і пакладзіце яго ў таматную сумесь. Выліце сюды ж воцат. Варыце кетчуп на працягу 4-6 гадзін на вельмі павольным агні, перыядычна памешваючы.

Прыбярыце мяшочак з травой, здрабніце масу блендэрам, працадзіце праз сіта і выліце ў рондаль. Давядзіце кетчуп да кіпення, дадайце 0,5 шклянкі цукру, размяшайце да растварэння. Пакаштуйце кетчуп чыстай лыжкай — калі несалодка, дадайце яшчэ цукру. Калі слодыч дастатковая, разліце кетчуп па стэрыльных слоіках і закруціце. Такі кетчуп можна захоўваць у склепе да года.

**Варэнне**



***Спатрэбіцца:*** *зялёныя памідоры — 1 кг, цукар — 2 шклянкі, лімонны сок — 0,5 шклянкі, соль — 1 ч. л., ванілін — 1 ч. л., свежая лімонная цэдра.*

Памідоры нарэжце і змясціце ў рондаль. Дадайце соль, цукар і лімонны сок. На сярэднім агні давядзіце сумесь да кіпення, памешваючы. Затым паменшыце агонь і варыце 35-40 хвілін, рэгулярна памешваючы, каб варэнне не прыгарэла. За 5 хвілін да заканчэння варкі дадайце ванілін і лімонную цэдру, добра размяшайце. Працадзіце варэнне праз сіта, выдаліце насенне і цэдру. Слоік з варэннем захоўвайце ў халадзільніку.

**Смажаныя зялёныя памідоры**



***Спатрэбіцца:*** *вялікія зялёныя памідоры — 3 шт., мука — 0,5 шклянкі, яйка — 2 шт., паніровачныя сухары — 1 шклянка, сушаныя травы — 0,5 ч. л., молаты чырвоны перац — 1/4 ч. л., алей, соль і чорны перац.*

Памідоры нарэжце лустачкамі і з абодвух бакоў злёгку пасыпце соллю і перцам. Пакіньце на 20 хвілін, а затым зліце сок, які ўтварыўся. У адну міску насыпце муку, у другой узбіце яйкі, у трэцяй місцы змяшайце сухары, травы і чырвоны перац. Кожную лустачку памідора абмакніце спачатку ў муку, затым у яйкі і ў паніровачныя сухары. Абсмажце ў разагрэтым алеі з двух бакоў да залацістага колеру, выкладзіце на папяровы ручнік, трохі астудзіце і падавайце з любімым соусам.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

### ЛАВАЧКА З БЕРВЯНА

**Часта хочацца паставіць на лецішчы натуральную драўляную садовую мэблю, але ўсё, як той казаў, не купіш, ды штосьці можна і сваімі рукамі зрабіць.**

Бяром два бярвенцы: першае — на падстаўку, другое — на сядзенне. Лепш, калі бярвены будуць больш-менш роўныя і не надта сукаватыя. Даўжыня кожнага не павінна перавышаць метр-паўтара. Канкрэтныя памеры выбірайце на свой густ. Для спінкі спатрэбяцца два абрэзкі бруска, жэрдкі ці сука. Акрамя таго, спатрэбіцца тоўстая дошка або аполак — ён, дарэчы, па стылі падыдзе не горш.

Спачатку нам трэба будзе распілаваць адно з бярвён на два плашчакі. Калі бензапіла ў вас добрая, гэта робіцца лёгка. Пры вялікім жаданні распілаваць бервяно ўздоўж можна і пілой-двухручкай. Для зручнасці фіксуем бервяно з дапамогай падставак, чэрцім лінію разьбы пасярэдзіне з кожнага з бакоў бервяна. Пачынаць пілаваць трэба канчыкам бензапілы. Каб прапіл далей ішоў роўны, лепш зрабіць канаўку ўздоўж усяго бервяна — так вы не пойдзеце ўбок, бо разметку з-за пілавіння бывае не відаць.

Пасля бяром адну з распілаваных плашак і апрацоўваем паверхню, прызначаную для сядзення. Гэта можна зрабіць з дапамогай гэбля, балгаркі ці плоскашліфавальнай машыны.

Для падстаўкі лавачкі пілуем два цурбакі ў паўтара раза шырэй за дыяметр бервяна і на кожным выбіраем бензапілой або вычэсваем сякерай паўкруглы паз пад сядзенне. Наша задача — дамагчыся, каб сядзенне шчыльна і ўстойліва ляжала на падстаўках.

Далей — спінка, дакладней, апоры для яе. Іх можна зрабіць з кавалка жэрдкі, тоўстага сука ці нават бруска. Гэтыя апоры трэба прыкруціць да падставак і да сядзення з дапамогай доўгіх шруб. Калі апора для спінкі круглая, на ёй давядзецца залысціць плоскасць на месцы пасадкі спінкі. Калі падгонка будзе скончана, спінку дастаткова прыцягнуць двума шрубамі да кожнай з апор.

Пастаўце апоры лаўкі на гідраізаляцыю або падніміце на камяні. Без кантакту з глебай яны пражывуць даўжэй, а афарбаванне ахоўным саставам падоўжыць тэрмін службы лавачкі.

*ДЗЯЦЕЙ ГАДАВАЦЬ — ВЕК ГАРАВАЦЬ (Беларуская народная прымаўка).*

Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ:




# «Таленты па-ранейшаму нараджаюцца ў вёсцы...»

**У сучаснай Беларусі — шмат традыцый. На нашай зямлі праходзяць урачыстасці, прысвечаныя памяці асветнікаў, дзяржаўных і рэлігійных дзеячаў, найбольш значных асоб, якія праславіліся не столькі на палях бітваў, дзяржаўнай службе, колькі сваім падзвіжніцтвам на духоўнай ніве. Шмат традыцый закладзена на Гомельшчыне — малой радзіме многіх выдатных асоб — менавіта творцамі, яркімі прапагандыстамі роднага краю. Пра актыўную дзейнасць абласной творчай суполкі па папулярызацыі кнігі і чытання, пра літаратурна-асветніцкі фестывальны рух як агульнабеларускага, так і агульнаславянскага гучання, пра малую радзіму, яе мінулы і сённяшні дзень, пра ўласны творчы лёс сёння мы гутарым з вядомым беларускім празаікам і публіцыстам, старшынёй Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімірам Гаўрыловічам.**



***— Уладзімір Мікалаевіч, сёлета ў межах Года народнага адзінства абласная пісьменніцкая арганізацыя аб'явіла Год класічнай кнігі і чытання на Гомельшчыне, прысвечаны 100-годдзю народных пісьменнікаў Беларусі Івана Мележа і Івана Шамякіна. Гэта ўжо традыцыя — кожны літаратурны год праводзіцца на Гомельшчыне пад знакам вядомых асоб, якія клапаціліся аб духоўнасці народа...***

— Папулярызацыя кнігі і чытання — адна з асноўных задач нашай творчай арганізацыі. На працягу многіх гадоў мы арганізоўваем творчыя мерапрыемствы, прысвечаныя знакавым для вобласці і краіны літаратарам, а таксама важным падзеям у жыцці беларускага народа. На Гомельшчыне праходзілі Гады пісьменнікаў Івана Мележа, Івана Шамякіна, Івана Навуменкі і Андрэя Макаёнка, прысвечаныя вядомым выхадцам з палескага краю — Анатолю Грачанікаву, Івану Сяркову і Дзмітрыю Кавалёву, Леаніду Гаўрылаву... Як даніна павагі ў іх гонар ладзіліся дзясяткі мерапрыемстваў у дзіцячых садках і школах, у каледжах і ВНУ, бібліятэках, на прадпрыемствах рэгіёна. У рамках гэтых падзей абласная пісьменніцкая арганізацыя штогод ажыццяўляе падрыхтоўку і выпуск рэгіянальных і міжнародных альманахаў, калектыўных зборнікаў паэзіі і прозы, а таксама рэалізоўвае шэраг памятных праектаў, накіраваных на ўвекавечанне памяці пісьменнікаў-землякоў. А на працягу апошніх трох гадоў у рамках Года малой радзімы ладзіліся маштабныя мерапрыемствы, звязаныя з дзіцячай літаратурай. Найперш яны былі скіраваны на папулярызацыю творчасці сучасных пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей і падлеткаў. Дарэчы, менавіта ў гэты перыяд многія нашы палескія літаратары актыўна пачалі пісаць творы спецыяльна для дзіцячай аўдыторыі, выйшлі дзясяткі займальных кніг для дашкольнікаў і школьнікаў-падлеткаў, прэзентацыі якіх ладзіліся ў самых розных аўдыторыях. Бясспрэчна, яны запомніліся не толькі маленькім чытачам, але і дарослым.

І сёлета мы вырашылі не адмаўляцца ад добрай традыцыі. У рамках Года класічнай літаратуры і чытання пісьменнікі рэгіёна скіроўваюць увагу чытачоў да творчай спадчыны народных пісьменнікаў Беларусі Івана Шамякіна і Івана Мележа, мы запрашаем чытаць (ці перачытваць) яркія мастацкія творы мастакоў слова.

***— Наколькі мне вядома, асаблівая ўвага пісьменніцкай арганізацыі скіравана на падтрымку юных талентаў. Якія цікавыя і дзейсныя, на ваш погляд, метады заахвочвання «работы са словам» сярод маладых людзей, студэнтаў, школьнікаў?***

— Без маладосці няма будучыні, таму мы актыўна працуем з пачаткоўцамі. Падтрымку ім найперш ажыццяўляем шляхам правядзення літаратурных конкурсаў і творчых кансультацый. Прывяду лічбы: толькі сёлета мы наладзілі сем літаратурных конкурсаў, у якіх узяло ўдзел звыш 2,5 тысячы ўдзельнікаў, і 60 % з іх — дзеці, навучэнцы, студэнцкая моладзь. Так, найбольшую колькасць паэтычных і празаічных спроб атрымалі на адкрытыя літаратурныя конкурсы «Сям'я — аснова шчасця і кахання» і «Белыя вішні і яблыні», прысвечаныя 100-годдзю І. Шамякіна і І. Мележа, а таксама на конкурсы «Незабыўны подзвіг. Міша Мароз» і «Памяці Міколы Гамолкі». Для нас гэта няпростая работа: усё трэба было прачытаць, прааналізаваць, адзначыць станоўчае і недахопы, каб потым параіць нешта юнаму аўтару. У маі звыш 120 фіналістаў і лаўрэатаў чатырох конкурсаў было запрошана ў Гомель, дзе ім праводзіліся майстар-класы, аналізаваліся дасланыя на конкурсы творы пачаткоўцаў — і гэта рабілі нашы актывісты, пісьменнікі-метадысты. З мэтай падтрымкі самых таленавітых канкурсантаў мы выдалі невялікі зборнік іх твораў з назвай «Матчын хлеб». Вядзецца велізарная работа з творчай моладдзю, у тым ліку і на міжнародным узроўні, у межах перакладчыцкага беларуска-расійскага праекта і фестывалю «Берагі дружбы» (з'яўляецца пабрацімам штогодняга Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі»)...

Падчас конкурсаў і творчых мерапрыемстваў з удзелам моладзі можна пераканацца: таленты па-ранейшаму нараджаюцца ў вёсцы! Нас асабліва радуюць палескія раёны Гомельшчыны. Увогуле, дзякуючы нашай падтрымцы праз конкурсы, фестывалі, творчыя акцыі, першыя публікацыі мы выраслі нямала аўтараў, якія падаюць надзеі, многіх з іх рэкамендавалі да прыёму ў Саюз пісьменнікаў.

***— А колькі сяброў у вашай абласной творчай суполцы? Хто з іх стварыў цікавыя мастацкія творы апошнім часам, што карыстаюцца найбольшай увагай чытача?***

— За 15 гадоў членамі абласной пісьменніцкай арганізацыі былі 82 пісьменнікі, сёння на ўліку 65 творцаў. За апошнія гады членамі СПБ сталі 12 літаратараў — гэта і таленавітая моладзь, і творцы сярэдняга ўзросту. Прыемна, што і ў пачатку 2021-га нашу творчую сям'ю папоўнілі маладая паэтэса з Добруша (не раз удзельнічала і перамагала ў творчых конкурсах) Вольга Астапенка і гомельскі празаік, публіцыст Мікалай Дзямчыхін.

У аддзяленні працуе шмат аўтараў, вядомых не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Напрыклад, плённа шчыруюць на творчай ніве драматург Васіль Ткачоў, паэты Ізяслаў Катляроў і Софія Шах, паэты Міхась Болсун, Ніна Шклярава, Тамара Кручэнка, Лілія Вялічка, Лідзія Долбікава, Святаслаў Крупенька, Ганна Атрошчанка, празаікі Міхась Сліва і Валянціна Кадзетава-Арэстава, дзіцячыя пісьменнікі Яўген Калашнікаў, Вера Квяткоўская, Людміла Яськова, Іна Зарэцкая, перакладчыца Вольга Раўчанка і многія іншыя.

Апошнім часам моцныя па мастацкай вартасці і значнасці выйшлі кнігі ў Васіля Ткачова, Тамары Кручэнкі, Івана Бісева, Галіны Рагавой, Алены Матвіенкі, Лідзіі Долбікавай і іншых гомельскіх пісьменнікаў. Дарэчы, толькі за мінулы год літаратарамі выдадзена звыш 50 кніг паэзіі, прозы, публіцыстыкі, драматургіі, а за 8 месяцаў бягучага — каля 30. Нягледзячы на пандэмію, праводзяцца прэзентацыі новых кніг — як ужывую, так і ў фармаце анлайн. Чытачы адклікаюцца на творчыя сустрэчы, удзельнічаюць у абмеркаванні кніг.

***— Ці адлюстроўваецца ў творчасці гомельскіх паэтаў і пісьменнікаў дзень сённяшні?***

— Нядаўна адбылася «Вялікая размова з Прэзідэнтам». Пераканаены: нельга сёння не падзяляць пункты гледжання Аляксандра Лукашэнкі: каб нешта мець, трэба старанна працаваць. Дармовага нічога не было і не будзе. Берагчы сваю краіну, яе незалежнасць ад знешніх нападкаў і ад унутраных канфліктаў. Умацоўваць сваю эканоміку. Цесна супрацоўнічаць з Расіяй, Кітаем, з тымі краінамі, якія нас падтрымліваюць словам і справай. Мы — дружалюбная краіна, якая імкнецца адраджаць славянскае братэрства, наколькі рэальнасць дае такія магчымасці. Але ўсё гэта будзе непатрэбнае, калі мы не зможам дастойна выхоўваць сваіх дзяцей як патрыётаў сваёй зямлі. Найпершую ўвагу — ім, нашай будучыні. Не магу не пагадзіцца з нашым Прэзідэнтам: «Памойму, пакаленне сучаснай моладзі многае не бачыць і не разумее. Ім патрэбна даносіць, растлумачваць, каб яны раслі з разуменнем, на якой зямлі жывуць, якія каштоўнасці ім імкнуцца прывіць у інтэрнэце...»

Так, не вырашым праблемы ў адукацыйнай прасторы — не адолеем ніводнай грамадскай праблемы. На мой погляд, выхаваўчы аспект з шырокім прыцягненнем найперш сям'і павінен быць пастаўлены вышэй, чым толькі «аказанне адукацыйных паслуг», што мы маем сёння.

***— Дзеля гэтага вы і ініцыюеце правядзенне традыцыйнага Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі»? Ды і новая традыцыя закладзена — рэгіянальны фестываль літаратуры, культуры, народных традыцый «На зямлі Кірылы Тураўскага». Калі і як яны пройдуць сёлета?***

— Фестываль пройдзе 9—11 верасня ў новым фармаце. У ліку мерапрыемстваў запланавана, напрыклад, канферэнцыя літаратараў Беларусі, Расіі і Украіны «Захаванне гістарычнай памяці сродкамі літаратуры і мастацтва — наш абавязак перад загінулымі, перад гісторыяй і наш абавязак перад сённяшнімі і заўтрашнімі пакаленнямі», на якой выступяць з паведамленнямі вядомыя славянскія літаратары, якіх мы чакаем у госці. Мы будзем прэзентаваць новыя нумары міжнароднага альманаха «Літара», беларуска-ўкраінскага зборніка «Тічія», альманахаў «Літаратурная Гомельшчына» і «Літаратурны Краснадар», новыя кнігі сучасных аўтараў. У час фестывалю будзе працаваць форум маладых літаратараў, адкрыта памятная дошка да 80-годдзя пачатку вайны і 80-годдзя выхаду ў Гомелі агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну!».

***— Нешараговая падзея, на мой погляд, аб'яднала гомельскіх і растоўскіх літаратараў — у Растоўскай вобласці адчыніў дзверы літаратурна-этнаграфічны пакой імя Івана Мележа. Як тое атрымалася зрабіць?***

— Гэта вынік плённага супрацоўніцтва з растоўскімі і краснадарскімі літаратарамі. Чатыры гады таму кіраўніцтва Растоўскай вобласці і Няклінаўскага раёна падтрымала нашу ініцыятыву — маю і растоўскага паэта Леаніда Севера: Пятрушынскаму аддзелу цэнтральнай міжпасялковай бібліятэкі было прысвоена імя народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа. Тым часам актыўна развіваўся міжнародны праект маладзёжнай паэзіі і перакладаў «Берагі дружбы», што вырас з Міжнароднага фестывалю-свята «Славянскія літаратурныя дажынкі». У межах сумесных літаратурных мерапрыемстваў актыўна ішоў культурны абмен паміж краінамі. Цікавасць да творчасці класіка беларускай літаратуры ў расійскім рэгіёне з кожным годам узрастала. І праз нейкі час было прынята рашэнне аб далейшай папулярызацыі творчасці Мележа і стварэнні да яго 100-годдзя ў імянной бібліятэцы літаратурна-этнаграфічнага пакоя. Мы ўрачыста адкрылі яго ў дзень 100-годдзя, пастараліся ўзнавіць атмасферу рабочага кабінета палескага творцы, напоўнішы яе сталізаваным сталом, лямпай, прадметамі быту.

***— А ці хапае ў вас часу на ўласную творчасць? Да Дня беларускага пісьменства ў Капылі, напэўна, будзеце прадстаўляць не толькі новыя кнігі калег, але і свае?***

— Ночы, скажам так, ніхто не адмяняў, зразумела, таму калі карціць нешта напісаць, то знойдзеш час. Менавіта так і з'явілася адна з новых аповесцяў — «Святая Параскева».

Дарэчы, за год гэты твор паўдзельнічаў у двух конкурсах і ў абодвух быў адзначаны — абласной літаратурнай прэміяй імя Кірылы Тураўскага і атрымаў перамогу ў міжнародным конкурсе «Залатое пяро Русі». На беларускай мове твор выйшаў у асобнікy прозы «Не сварыся з нябёсамі» ў жніўні, а на рускай чакаецца выхад у верасні ў выдавецтве «Чатыры чвэрці». Шырокаму чытачу ўжо даступнае і новае выданне трох раманаў «Сэрца сваё не падманеш...» (выдавецтва «Беларусь», 2021). Гэтыя творы — знакавыя ў маёй творчасці, у іх я імкнуўся адлюстраваць не толькі гісторыю на працягу цэлага стагоддзя, але і спадзяванні майго народа.

**Гутарыла Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

***(Цалкам інтэрв'ю — на www.zviazda.by)***

## Напярэдадні падзеі

# Пачатак — з круглага стала ў Мінску

**Своеасаблівым адкрыццём XXVIII Дня беларускага пісьменства ў Капылі стане Міжнародны круглы стол «Пісьменнік і адзіная гуманітарная прастора», які пройдзе 3 верасня ў Мінску.**

Фармат круглага стала, удзельнікі якога будуць весці дыскусіі на пляцоўцы канферэнц-залы Палаца Рэспублікі, прадугледжвае работу ў экспертным асяроддзі вочна з анлайн-падключэннем знакамітых пісьменнікаў, а таксама вядомых шырокаму колу грамадскасці паліталагаў, аналітыкаў, аглядальнікаў.

— У традыцыйным успрыманні пісьменнік — гэта чалавек, які стварае мастацкія творы, — каментуе састаў удзельнікаў сёлетняга круглага стала **намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар БУЗОЎСКІ**. — У шырокім сэнсе пісьменнік з'яўляецца асветнікам, мысляром, які фарміруе прафесійнае, культурнае і інтэлектуальнае асяроддзе. Пісьменнікі, што застаюцца прафесіяналамі як мастакі слова, адначасова выдаюць свае творы, якія закранаюць самыя шырокія бакі жыцця грамадства.

Удзел у круглым стале, які пачне сваю работу 3 верасня а 12-й гадзіне, бяруць намеснік міністра інфармацыі Ігар БУЗОЎСКІ, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», член Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК.

**Сяргей ШЫЧКО.**

# УРАДЖАЙНАЯ ПАРА

## Што будзем есці ўзімку?

**Патрэба ў агародніне для продажу насельніцтву ў Беларусі складае каля 300 тысяч тон на год. Гэта менш за 50 % ад аб'ёму вытворчасці ў сельскагаспадарчых арганізацыях і фермерскіх гаспадарках, расказаў начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь Міхаіл ЖЫГАЛА.**

### СКЛАДАНЫ РЫНАК

— Мы спажываем на ўнутраным рынку значна менш, чым выпрацоўваем, — падкрэсліў спецыяліст.

Ён адзначыў, што вырасла доля рэалізацыі прадукцыі айчыннай вытворчасці, а гэта спрыяльна ўздзейнічае на паказчыкі харчовай бяспекі.

— Калі казаць аб цанавых фактарах, рынак сельскагаспадарчай прадукцыі складаны — тут назіраецца вялікая валатыльнасць (зменлівасць цэн. — **Зв.**), якая залежыць ад многіх фактараў: як унутраных, так і знешніх, — падкрэсліў спецыяліст.

Таму на працягу шэрага гадоў МАРГам прымаліся пэўныя меры. Сёння плодаагароднінная прадукцыя падлягае цанавому рэгуляванню, функцыянуе механізм фарміравання стабілізацыйных фондаў. Таксама на бягучы год запланавана рэалізацыя праекта па заключэнні доўгатэрміновых дагавораў паміж буйнымі гандлёвымі сеткамі і вытворцамі плодаагароднінай прадукцыі.

**«Мы прыступілі да нарыхтоўкі яблыкаў. Ужо бачым, што ўраджайнасць і валавы збор у прыватным сектары значна ніжэйшы ў параўнанні з мінулым годам. Але ў нас ёсць рэзерв — фермерскія гаспадаркі».**

— Асноўны вынік накіраваны на гарантаванае забеспячэнне спажывецкага рынку свежай плодаагароднінай прадукцыяй менавіта айчыннай вытворчасці. Таксама гэта механізм нівеліравання валатыльнасці цэн, якая перыядычна ўзнікае на працягу каляндарнага года.

Спецыяліст расказаў, што Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю ўжо сфарміравала пералік буйных гандлёвых сетак, якія маюць 10 і больш гандлёвых аб'ектаў, прадаюць свежую плодаагародніную прадукцыю і гатовыя да доўгатэрміновага супрацоўніцтва з айчыннымі вытворцамі. А Міністэрства сельскай гаспадаркі, са свайго боку, склала пералік сельскагаспадарчых арганізацый і фермерскіх гаспадарак, гатовых да такога супрацоўніцтва (каля 140 суб'ектаў).

### ВІТАМІНЫ — БЕЗ ПЕРАПЫНКУ

Сёлета ў Беларусі плануецца ўраджай бульбы на ўзроўні 5,8 млн тон, гародніны будзе сабрана, паводле ацэнак спецыялістаў, 1,8 млн тон, расказала **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення раслінаводства — начальнік упраўлення бульбаводства, плодаагародніцтва, аграхіміі і абароны раслін Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Таццяна КАРБАНОВІЧ.** Ураджай пладоў і ягад чакаецца на ўзроўні 720 тыс. тон. У сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках плануюць атрымаць 960 тыс. тон бульбы (105 % да ўзроўню папярэдняга года), 631 тыс. тон гародніны адкрытага і ахаванага грунту (112 %), а таксама каля 170 тыс. тон пладоў і ягад (на ўзроўні мінулага года), з іх 160 тыс. тон яблыкаў.

— У апошнія гады істотна памяняліся суадносіны вытворчасці прадукцыі ў грамадскім сектары, сельгасарганізацыях і фермерскіх гаспадарках, — падкрэсліла яна. — Калі ў 2010 годзе ўдзельная вага бульбы, якая прыходзілася на сельгасарганізацыі, складала 85 % і 15 % — на фермерскія гаспадаркі, то цяпер на фермерскія гаспадаркі прыпадае 63 %.

Па гародніне на фермерскія гаспадаркі цяпер прыпадае 63 %. І больш за 50 % пладоў і ягад сёння вырошчваецца фермерамі.

Штогадовая вытворчасць бульбы і агародніны дазваляе ў поўнай меры забяспечыць унутраныя патрэбы і мець рэсурсы для паставак на экспарт, падкрэсліла спецыяліст.

— Сёння ў Дзяржаўны рэестр сартоў для прамысловага вырошчвання ўключаны 184 сарты бульбы, у тым ліку 53 сарты айчыннай селекцыі рознага мэтавага прызначэння. Больш за 2,6 тыс. сартоў і гібрыдаў агароднінных і бахчавых культур, з іх 260 айчыннай селекцыі. 432 сарты пладовых і ягадных культур, з іх 319 айчыннай селекцыі. Рэестр пастаянна папаўняецца і абнаўляецца.



Вытворчасць садавіны, у першую чаргу яблыкаў, для насычэння ўнутранага рынку айчыннай прадукцыяй — адзін з прыярытэтных кірункаў работы галіны раслінаводства. Штогод ажыццяўляецца закладка садоў на плошчы не менш за 500 га.

### ...І Ў МІЖСЕЗОННЕ — ТАКСАМА

— Ва ўмовах ахаванага грунту вядзецца значная работа па вытворчасці прадукцыі ў міжсезонны перыяд года.

**Штогадовая вытворчасць бульбы і агародніны дазваляе ў поўнай меры забяспечыць унутраныя патрэбы і мець рэсурсы для паставак на экспарт.**

Спецыяліст распавяла, што агульная плошча цяплічных комплексаў сёння складае больш за 260 га. Гэтая галіна — найбольш энергаёмістая. Цана на прыродны газ для вытворчасці гародніны ахаванага грунту пачынаючы з 2017 года дыферэнцыруецца.

— У ахаваным грунце вырошчваецца дастаткова агуркоў і таматаў, дзфіцыт адчуваецца менавіта ў перыяды тэхналагічных перапынкаў, — падкрэсліла яна. — Для агуркоў гэта студзень-люты і кастрычнік-снежань, для таматаў — студзень-сакавік і лістапад-снежань. У мэтах імпартазамяшчэння ва ўмовах ахаванага грунту выкарыстоўваем тэхналогіі, якія дазваляюць вырошчваць агуркі, зялёную і кветкавую прадукцыю, часткова пакрываючы імпартазамяшчэнне і ў зімовы перыяд. У цэлым у ахаваным грунце, як і ў адкрытым, досыць шырокі асартымент — каля 15 найменняў зялёных культур, а таксама агуркі, таматы, баклажаны, перац.

Для гарантаванага забеспячэння насельніцтва плодаагароднінай прадукцыяй у міжсезонны перыяд ажыццяўляецца закладка стабілізацыйных фондаў.

Яшчэ адзін прыярытэтны кірунак работы — бахчавыя і арэхаплодныя культуры. Ураджай бахчавых у нашай краіне чакаецца каля 700 тон. Пад бахчавыя культуры сёння занятая плошча больш за 50 га, кавуны вырошчваюцца ў асноўным на поўдні краіны — у Драгічынскім, Мастоўскім, Гомельскім раёнах.

Арэхаплодныя культуры таксама сёння ў прыярытэце. Пад фундук занятая плошча 109,5 га. Большая частка плантацый размешчана ў Маладзечанскім раёне — 60 га. Плантацыі грэцкага арэха (26 га) размешчаны ў асноўным у Брэсцкай вобласці.

Таксама ў нашай краіне 89 га вінаграднікаў. Летась было сабрана каля 200 тон беларускага вінаграду. Такая работа будзе працягнутая, заўпэўніла спецыяліст.

### АБ ЗАКУПАЧНЫХ ЦЭНАХ

За сем месяцаў гэтага года «Белкаапсаюз» закупіў сельгаспрадукцыі на суму больш за 280 млн рублёў, распавяла **начальнік упраўлення нарыхтовак «Белкаапсаюза» Аксана СКІНДЭР.**

— Дынаміка росту аб'ёмаў закупак захоўваецца штогод: не маючы аднаго віду прадукцыі з-за ўмоў надвор'я альбо іншых прычын, мы замяшчаем яе іншымі відамі нарыхтовак.

Сёлета насельніцтву выплачана 200 млн рублёў за здадзеную прадукцыю, паведаміла Аксана Скіндэр.

— Мы прыступілі да нарыхтоўкі яблыкаў. Ужо бачым, што ўраджайнасць і валавы збор у прыватным сектары значна ніжэйшыя ў параўнанні з мінулым годам. Але ў нас ёсць рэзерв — фермерскія гаспадаркі, дзе вырошчваюцца сарты пазнейшых тэрмінаў паспявання, якія можна рэалізоўваць у міжсезонне, закласці на захоўванне. Ужо закуплена 8 тыс. тон. Пакуль дынаміка станоўчая.

Дзікарослых пладоў і ягад «Белкаапсаюзам» закуплена каля 800 тон. Спецыяліст расказала, што арганізацыі спажывецкай кааперацыі ў апошнія гады актыўна працуюць з насельніцтвам па закупцы збожжа.

— Гэта перспектыўная пазіцыя, — адзначыла Аксана Скіндэр. — Шэраг фермерскіх гаспадарак вырабляе збожжа, і цяпер яно стала запатрабаванае ў рознічнай сетцы.

У цэлым сёлета нарыхтоўшчыкі плануюць закупіць каля 27-30 тыс. тон бульбы, каля 40-45 тыс. тон гародніны і не менш за 70 тыс. тон садавіны.

**«У спажыўцоў часам узнікаюць сумненні, ці сапраўды гэта беларускія кавуны? Звяртаем увагу пакупнікоў: беларускія кавуны нічым не саступаюць па смакавых якасцях імпартным».**

— Закупачныя цэны залежаць ад якасці прадукцыі і ад рэгіёна. Апад яблыкаў для перапрацоўкі закупляецца па 18-23 капейкі за 1 кг, яблыкі таварныя ручнога здымання — ад 80 капеек да 1,6 рубля, алыча і слівы — ад рубля да двух, часнок — ад трох да пяці рублёў, чарнаплодныя рабіны — 25-90 капеек, брусніцы — ад 2,5 да 4 рублёў.

Закупачныя цэны на бульбу — ад 60 капеек да рубля (тая ж цана на агуркі), ад 80 капеек да рубля на капусту, на буракі — ад 80 капеек да 1,2 рубля. Лісічкі і баравікі нарыхтоўшчыкі купляюць у насельніцтва па кошце ад 6 да 10 рублёў, іншыя віды грыбоў — ад 2 да 5 рублёў.

Што датычыцца беларускага кавуна, арганізацыі спажыўкааперацыі штогод закупляюць ад 800 да 1000 тон гэтай ягады. Айчынныя кавуны ўжо прадстаўлены ў гандлёвай сетцы.

— У спажыўцоў часам узнікаюць сумненні, ці сапраўды гэта беларускія кавуны? Звяртаем увагу пакупнікоў: беларускія кавуны нічым не саступаюць па смакавых якасцях імпартным, — падкрэсліла начальнік упраўлення нарыхтовак «Белкаапсаюза».

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Добрая навіна

# Дапамога стала больш якаснай

### У Дзяржынску адкрыўся новы тэрытарыяльны цэнтр сацабслугоўвання насельніцтва



**Раней тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва размяшчаўся ў старым будынку — 1927 года пабудовы. Некалькі гадоў таму ён быў прызнаны аварыйным. Новы будынак пачалі ўзводзіць у 2020 годзе. На будаўніцтва аб'екта агульнай плошчай 2500 кв. м выдаткавалі Br5,5 млн, перадае карэспандэнт БелТА.**

«Гісторыя тэрытарыяльнага цэнтра ў Дзяржынску багатая. У хуткім часе стары будынак святкаваў бы цэлае стагоддзе, але сёння ў нас не менш выдатная падзея — адкрыццё абсалютна новага, прыгожага і сучаснага аб'екта. Тут будуць працаваць людзі ад Бога. Яны паспяхова прайшлі выпрабаванні мінулага года, калі, нягледзячы на вірус, працягвалі разносіць прадукты і лекі пажылым людзям. За гэта ім нізкі паклон. Спадзяюся, што працаваць супрацоўнікам і атрымліваць наведвальнікам дапамогу ў цэнтры будзе камфортна», — сказала на адкрыцці **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ.**

У новым тэрытарыяльным цэнтры размясціліся актавая і спартыўная залы з трэнажорамі, канферэнц-памяшканне, камп'ютарны клас, а таксама аддзяленні дзённага знаходжання пажылых грамадзян і інвалідаў, крызісны пакой, памяшканні для індывідуальнай работы з грамадзянамі, кабінет псіхолага, інжынера па ахове працы, грамадскіх арганізацый. Абсталяваны салон «Міласэрнасць» і пункт пракату тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі.

З улікам існуючых плошчаў плануюць адкрыць аддзяленне суправаджальнага пражывання.

У новым будынку прадугледжана безбар'ернае асяроддзе для фізічна аслабленых асоб. Ёсць пандусы, ліфт, поручні ў калідорах і санітарных вузлах, таблічкі са шрыфтам Брайля, тактыльныя прылады, сістэма «Крокі на гукі», тэлефон.

Сёння на ўліку ў тэрытарыяльным цэнтры ў Дзяржынску знаходзіцца больш за 19,1 тысячы грамадзян, якія адносяцца да сацыяльна неабароненых катэгорый. Арганізацыя работы цэнтра ў новым будынку палепшыць якасць аказання дапамогі, дазволіць павялічыць ахоп людзей, якія маюць патрэбу ў сацыяльных паслугах.

Сёння на базе аб'екта функцыянуе 18 клубаў, 5 школ, 18 гурткоў, 5 студый, 3 майстэрні, лекторый «Экалогія думкі».

Чулі?!

# НОВЫЯ ПАШПАРТЫ — З 1 ВЕРАСНЯ

**З учарашняга дня ў краіне пачалі выдаваць біяметрычныя дакументы, праінфармавала ў сваім Telegram-канале прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА, паведамляе БелТА.**



«З'явіцца 8 новых відаў дакументаў, якія змяшчаюць біяметрычныя даныя, у тым ліку ідэнтыфікацыйная картка грамадзяніна (ID-картка) і біяметрычны пашпарт. ID-карткі прызначаны для засведчання асобы ўладальніка толькі на тэрыторыі нашай краіны. Біяметрычныя пашпарты спатрэбяцца выключна для выезду за мяжу. Калі ж грамадзянін не збіраецца выязджаць, атрымліваць такі дакумент неабавязкова. Выраб біяметрычнага пашпарта магчымы толькі пры наяўнасці ў заяўніка ID-карткі», — гаворыцца ў паведамленні.

Таксама пашырыцца функцыянал дакументаў, якія засведчваюць асобу. «Дзякуючы наяўнаму ў ID-картцы асабістаму электроннаму лічбаваму подпісу можна праводзіць дзеянні праз партал Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг. Выдача ID-карткі будзе каштаваць 1,5 БВ, біяметрычнага пашпарта — 2 БВ. Для грамадзян, якія дасягнулі пенсійнага ўзросту, а таксама інвалідаў I і II груп — 1 і 1,5 БВ адпаведна», — адзначылі ў МУС.

Для атрымання біяметрычных дакументаў неабходна звярнуцца ў падраздзяленне па грамадзянстве і міграцыі па месцы рэгістрацыі пры першасным атрыманні, а пры іх абмене — у любое падраздзяленне па грамадзянстве і міграцыі.

Мяняць цяпер дзеючыя пашпарты на новыя біяметрычныя дакументы неабавязкова. Акрамя таго, прадоўжыцца выдача пашпартоў старога ўзору на ранейшых умовах, паралельна з новымі. Грамадзяне самастойна вырашаюць, які від дакумента яны хочуць атрымаць. Кошт дзеючых пашпартоў не зменіцца, па іх можна выязджаць за мяжу.

Для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, замена дакументаў, што засведчваюць асобу, і дакументаў для выезду з краіны і (або) уезду ў Беларусь на біяметрычныя будзе праходзіць паступова. Да заканчэння тэрміна свайго дзеяння яны застануцца раўназначнымі ў выкарыстанні з біяметрычнымі дакументамі. З 1 верасня замежныя грамадзяне змогуць атрымаць толькі біяметрычныя дакументы.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Пуцін пра 20-гадовую прысутнасць ЗША ў Афганістане: адны трагедыі і страты



**Вашынгтон 20 гадоў спрабаваў укараняць свае стандарты ў Афганістане, але вынікам сталі толькі трагедыі і страты. Пра гэта заявіў прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін, паведамляе ТАСС.**

«Дваццаць гадоў амерыканскія войскі прысутнічалі на гэтай тэрыторыі і 20 гадоў спрабавалі, можна сказаць, нікога не крыўдзячы, «цывілізоўваць» людзей, якія жывуць там. А па сутнасці, укараняць свае нормы і стандарты жыцця ў самым шырокім сэнсе гэтага слова, у тым ліку і палітычную арганізацыю грамадства. Вынік — адны трагедыі, адны страты. І для тых, хто гэта зрабіў, і для Злучаных Штатаў, і тым больш — для тых людзей, якія жывуць на тэрыторыі Афганістана», — канстатаваў кіраўнік расійскай дзяржавы.

Дзяржавы павінны цывілізавана аказваць дапамогу іншым краінам, навязаць звонку нічога нельга, дадаў Уладзімір Пуцін.

«Калі хтосьці ў дачыненні да каго-небудзь нешта робіць, то ён павінен зыходзіць з гісторыі, культуры, філасофіі — у самым шырокім сэнсе — жыцця гэтых людзей. Павінен падыходзіць з павагай да іх традыцыі. Трэба разумець, што звонку навязаць нельга нічога», — падкрэсліў прэзідэнт РФ, кажучы пра прычыны таго, што адбылося.

## У паветры кватэр знайшлі рэчывы, што выклікаюць рак

**Вучоныя з ЗША выявілі шкодныя хімікаты ў паветры кватэр, дзіцячых садкоў і школ.**

Паветра, якім людзі дыхаюць дома і на рабоце, можа быць забруджанае шкоднымі хімічнымі рэчывамі, якія выклікаюць анкалагічныя захворванні. Пра гэта паведаміла група даследчыкаў з Род-Айлендскага ўніверсітэта ў ЗША.

У ходзе даследаванняў вучоныя прааналізавалі паветра ў некалькіх пакоях дзіцячага садка, адным доме, на складзе магазіна адзення, у двух магазінах па продажы дываноў, пяці офісах, адным класным пакоі, адным складскім памяшканні і ліфце.

Шкодныя хімічныя рэчывы — ПФАС — былі знойдзены амаль ва ўсіх абследаваных месцах. Самыя высокія канцэнтрацыі зафіксавалі ў магазінах дываноў.

ПФАС выкарыстоўваюць у розных галінах па ўсім свеце з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Злучэнні выкарыстоўваюцца ў вытворчасці ўпаковачных матэрыялаў, воданепранікальных тканін для вопраткі, зубной ніткі, памад, ценяў для павекаў, сродкаў для чысткі дываноў. Яны выклікаюць шырокі спектр сур'ёзных праблем са здароўем, ад раку да бясплоднасці і праблем з імуннай сістэмай.

## У Краснадары вучні пайшлі ў першы «Ы» клас

**Наплыў вучняў у краснадарскую школу № 94 прывёў да фарміравання 28 першых класаў, паведаміў тэлеканал «Россия. Кубань».**

Удакладняецца, што пры абазначэнні выкарыстоўвалі ўсе літары рускага алфавіта, акрамя «Ь», «Ъ», «Й», «Ё» і «Щ». Такім чынам, некаторыя дзеці сталі вучнямі класаў «Ы», «Я» і «Ю».

Усяго сёлета навучальная ўстанова прыме 840 першакласнікаў.

Раней паведамлялася, што расійскія школьнікі прыйдуць 1 верасня на традыцыйныя лінейкі, а таксама вернуцца за парты там, дзе гэта дазваляе эпідэмічная сітуацыя.

# КАЛЯНДАР СТРЫЖАК НА ВЕРАСЕНЬ

**2 верасня, чацвер.** Абразанне валасоў у гэты дзень можа мець згубны ўплыў на псіхіку. Прыгнечанасць, беспадстаўная трывога — самае малое, што можа з'явіцца пасля паходу ў цырульню, а ў тых, хто мае дэпрэсію, пагоршыцца стан.

**3 верасня, пятніца.** Добры дзень для стварэння новай прычоскі і афарбоўвання ў любыя адценні. Спрыяльныя салонны догляд і дамашнія працэдуры для аздараўлення валасоў.

**4 верасня, субота.** Добры дзень для новай прычоскі, але варта ўлічыць, што пасля стрыжкі валасы растуць больш павольна, чым звычайна, паколькі Месяц цяпер меншае.

**5 верасня, нядзеля.** Выдатны дзень для наведвання салона прыгажосці. Стрыжка надасць сіл і здароўя валасам: яны стануць гусцейшыя і мацнейшыя, выпадзенне значна скароціцца.

**6 верасня, панядзелак.** Месяц у Дзеве спрыяльна ўплывае на валасы, але 29-ы Месячны дзень вельмі адмоўна адбіваецца на эмоцыях, лепш стрыжку адкласці.

**7 верасня, аўторак.** Магічна ўдалы дзень па гараскопе стрыжкі. Кароткая стрыжка прыцягне ўдачу на рабоце і павышэнне ў кар'еры, прычоска на доўгіх валасах дасць шчасце ў асабістым жыцці, новы колер валасоў прынясе здароўе і дабрабыт.

**8 верасня, серада.** Новая прычоска акажа дапамогу тым, хто жадае ўзмацніць асабістае абаянне, і прынясе поспех у людзей супрацьлеглага полу.

**9 верасня, чацвер.** Укладваем кучары буйнымі хвалямі, ствараючы класічны вобраз прыроднай прывабнасці. Калі вы хворыя, стрыжка можа адвесці хваробу, падымецца агульны імунітэт арганізма.

**10 верасня, пятніца.** Дзень нейтральны для паходу ў салон прыгажосці, стрыжкі і афарбоўвання валасоў.

**11 верасня, субота.** Стрыжка ў гэты дзень павялічыць матэрыяльнае багацце, а Месяц забяспечыць добры рост валасоў.

**12 верасня, нядзеля.** Добры дзень для тых, хто жадае стаць больш актыўным, пазітыўным і жыццярадасным. Стрыжка прыцягне ўдачу, новыя сустрэчы і знаёмствы.

**13 верасня, панядзелак.** Сённяшняя стрыжка падорыць энергію здароўя і абароніць ад бед. Калі ёсць нейкія праблемы на рабоце ці ў бізнесе, пафарбуйце валасы натуральнай фарбай у цёмнае адценне.

**14 верасня, аўторак.** Астролагі рэкамендуюць стрыжку тым, хто хоча павысіць упэўненасць у сабе і статус у вачах навакольных. Стрыжка надасць валасам сілу і здароўе.

**15 верасня, серада.** Сёння новая стрыжка надасць творчы імпульс, жыццё зайграе новымі фарбамі. Для афарбоўвання або таніравання варта выбраць фарбавальнікі з натуральным саставам.

**16 верасня, чацвер.** Крэатыўныя натуры могуць смела запісвацца да майстра. Прычоска будзе смелая і незвычайная, дапаможа энергетыцы не застойвацца, прыцягне перамены і прыемныя весткі.

**17 верасня, пятніца.** Сённяшні паход да цырульніка дабратворна паўплывае на ўсе абменныя працэсы ў арганізме, падыме настрой на ўвесь месяц.

**18 верасня, субота.** Сёння варта ўстрымацца ад стрыжкі і завіўкі валасоў. Рэкамендуецца выпрастваць пасмы, каб прыцягнуць пазітыўную энергію. Афарбоўванне ў цёмны колер у гэты дзень дапаможа пазбегнуць непрыемнасцяў.

**19 верасня, нядзеля.** Афарбуйце шавялюру ў ваш любімы колер, пасляховыя справы стануць залогам будучага шанцавання. Згодна з гараскопам, пра нажніцы не ўспамінаем пад знакам Рыб.

**20 верасня, панядзелак.** Неверагодна складаны панядзелак, поспеху не даможацеся ні ў якіх мерапрыемствах, не кажучы пра стрыжкі і ўкладкі.



**21 верасня, аўторак.** Лепш адкласці паход да цырульніка. Сёння варта зрабіць працэдуры догляду для валасоў, якія ўмацуюць і адновяць структуру. Стрыжка можа зрабіць валасы непаслухмянымі і ломкімі.

**22 верасня, серада.** Любыя маніпуляцыі з даўжынёй і колерам валасоў рэкамендуецца перанесці на больш удалы дзень. Інакш валасы могуць стаць непаслухмяныя, пачаць выпадаць больш за норму.

**23 верасня, чацвер.** Выдатны дзень для стрыжкі, афарбоўкі валасоў, можна смела адпраўляцца ў цырульню.

**24 верасня пятніца.** Сёння дастаткова спрыяльны дзень для новай стрыжкі, калі ёсць праблемы са здароўем. Яна таксама прыцягне грошы.

**25 верасня, субота.** Удалы час для змен у даўжыні валасоў. Можна не абмяжоўвацца карэкціроўкай кончыкаў, таму што нават смелая стрыжка пройдзе выдатна.

**26 верасня, нядзеля.** Удалы дзень для поўнай змены іміджу. Стрыжка ў гэты дзень цягне за сабой ачышчэнне арганізма, пазбаўленне ад негатыўных эмоцый. Для афарбоўкі валасоў рэкамендуецца выбраць менавіта гэты дзень.

**27 верасня, панядзелак.** Выдатны час для стрыжкі валасоў, асабліва ўдалымі будуць паветраныя стрыжкі, афарбоўванне валасоў у светлыя і русыя адценні.

**28 верасня, аўторак.** Няўдалы дзень для наведвання цырульні: прычоска атрымаецца зусім не такая, як вы сабе ўяўляеце, і можа вас сур'ёзна знерваваць. Не варта фарбаваць валасы, бо атрыманы колер можа расчараваць.

**29 верасня, серада.** Не рэкамендуецца наведваць майстра, пасля стрыжкі прычоска хутка страціць форму.

**30 верасня, чацвер.** Стрыгчыся ў гэты дзень непажадана. У плане прыгажосці стрыжка вас хутка расчаруе, а з эзатэрычнага пункту гледжання яна яшчэ можа запусціць чараду няўдач.


**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении**
**открытого аукциона по продаже имущества,**
**принадлежащего РУП «Гомельавтодор»**
**на праве хозяйственного ведения**

**Лот № 1:** Склад с инв. № 322/D-16116, 172,5 кв. м.

**Адрес:** Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Якова Зайцева, 1А-2. **Начальная цена без НДС** – 20 630,58 руб.

**Аукцион состоится 05.10.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**Брестский филиал извещает о проведении повторного открытого аукциона**

| Предметы торгов | Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| **ЛОТ: ГРУЗОПАССАЖИРСКИЙ АВТОМОБИЛЬ VOLKSWAGEN CRAFTER 50 LR, год выпуска 2008 г., регистрационный знак 1 IP 9801** | 14 200,00 | 710,00 |

**Продавец:** унитарное предприятие «БВТМ-маркет», УНП 291290075, тел./факс 80162 50 46 88. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245. **Срок заключения договора купли-продажи:** не позднее 20 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Условия продажи:** без условий. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает вознаграждение Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней с даты подписания протокола аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 17 сентября 2021 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 16 сентября 2021 г. до 17.00**

Кніжны гасцінец

# Шчырасць апошняга кляновага ліста

**Мелодыі роднай зямлі. Капыльшчына літаратурная. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.**



*«Мы, капыляне, —*
*усе паэты,*
*Такая наша ўжо зямля.*
*І паважаюць нас за гэта —*
*Шчаслівы той,*
*хто з Капыля».*

Што ж, хоць на Капыльшчыне, можа, і не ўсе пішуць вершы, як сцвярджаў паэт Мікола Хведаровіч, але некалькі дзясяткаў слынных літаратараў гэтая зямля нарадзіла... Невыпадкова сёлетні Дзень беларускага пісьменства адбываецца ў Капылі. Зборнік, выдадзены да гэтай падзеі, пазнаёміць з літаратурнай гісторыяй і сучаснасцю краю. А гісторыя даўняя: яшчэ ў XVI стагоддзі тут жыў аўтар хронік Мацей Стрыйкоўскі, працаваў перакладчык, доктар медыцыны Даніла Набароўскі, які ў Падуі вучыўся ў Галілея. І Уладзіслаў Сыракомля ствараў на Капыльшчыне, і класік яўрэйскай літаратуры Мендэле Мойхер-Сфорым... А пачынаецца зборнік з твора Алеся Адамовіча, народжанага таксама на гэтай зямлі. Як і слынны крытычны часоў «Узвышша» Адам Бабарэка... Пасля ўдалага празаічнага дэбюту Бабарэка адмовіўся ад прозы, каб цалкам прысвяціць сябе крытыцы. А ў зборніку прадстаўлена яго апавяданне «Як красназорцы зямлі сцураліся» — вобразная, багатая мова... Ці не пагарачыўся Бабарэка, абмежаваўшы сябе адным жанрам? Судзіце самі: «Будынкі, быццам апенькі, каля пня-царкаўкі паскучваліся-паскручваліся. Пасярэдзіне — вуліца. Сям-там, як тыя тычкі ці пужалы на агародах, тарчалі старэнькія бярэзіны ды кляны. Як буслы на адной назе, гуськом, пазіраючы ўніз вочапамі, папрытульваліся «бабы» з «жураўлямі» і нудна скрыгіталі, п'ючы ранішнюю ваду са студняў».

«Не шукай ты мяне каля жытніх палёў», «Ой, бярозы ды сосны — партызанскія сёстры», «Бывайце здаровы, жывіце багата» — аўтар тэкстаў гэтых неўміручых песень Адам Русак таксама натхняўся роднай Капыльшчынай... Як і Кузьма Чорны, Цішка Гартны, Леў Клейнбарт, Ян Скрыган, Алесь Гурло...

Не забылі складальнікі зборніка і пра адну з традыцый Дня беларускага пісьменства — уручэнне Нацыянальнай літаратурнай прэміі. У зборніку прадстаўлены творы некаторых яе лаўрэатаў, а таксама прэтэндэнтаў на сёлетнюю ўзнагароду. А для кантэксту — цікавыя факты пра пісьменнікаў-юбіляраў 2021-га — Максіма Багдановіча, Івана Шамякіна, Івана Мележа і Кандрата Крапіву.

Застаецца дадаць, што аўтар грунтоўнай прадмовы, слынны літаратуразнавец і пісьменнік Алесь Бельскі, таксама з Капыльшчыны.

**Павел Санаеў. Пахавайце мяне за плінтусам. Выдавецтва «АСТ», 2021.**



Гэтая кніга, якая з'явілася ў 1990-х, умомант праславіла аўтара.

«Меня зовут Савельев Саша. Я учусь во втором классе и живу у бабушки с дедушкой. Мама променяла меня на карлика-кровопийцу и повесила на бабушкину шею тяжкой крестягой. Так я с четырёх лет и вишу».

Гісторыя хлопчыка, якога ўладная, не зусім псіхічна здаровая бабуля адабрала ў маці, сваёй дачкі, не прostа кранала, але і мела скандальны рэзананс. Бо сюжэт быў аўтабіяграфічны і датычыўся таямніц вядомай сям'і. Дзядуля героя быў народны артыст СССР Усевалад Санаеў, маці — актрыса Алена Санаева, а айчым, «карлік-крывапівец» — акцёр і рэжысёр Ралан Быкаў.

Дзядуля, які на экране іграў ролі мужных герояў, не мог зладзіць з уласнай жонкай. Маленькаму Паўлу забаранялася называць сваю маму мамай, таму ён марыў жыць пад плінтусам і мець магчымасць бачыць яе хоць праз шчылінку. З-за гіперапекі бабулі хлопчык бясконца хварэе. І толькі айчым, разумны і добры, дапамагае выправіць сітуацыю, і маці знаходзіць у сабе сілы забраць свайго сына, вытрываўшы напады бацькоў. Дарэчы, кніга нагадвае пранізлівыя фільмы Ралана Быкава накшталт «Пудзіла». Аўтар прызнаваўся, што стварыў для сябе «псіхатэрапію». Аповесць стала п'есай, яна была пастаўлена і ў беларускіх тэатрах, ператварылася ў фільм... А пасля займела працяг. Але калі вы ўбачыце назву «Хроники Раздолбая. Похороните меня за плинтусом — 2», не спяшайцеся радавацца сустрэчы са знаёмымі героямі. Як прызнаваўся сам Павел Санаеў, назва — гэта толькі маркетынгавы ход. Герой гэтага рамана — зусім не Саша Савельеў. Дзевятнаццацігадовы разбэшчаны юнак шукае сваё месца ў часы перабудовы. Прастытуткі, бізнесмены, наменклатуршчыкі, рэкеціры, прапаведнікі... Калі б аўтар напісаў толькі гэтую кнігу, яна не прыцягнула б столькі ўвагі, як першая.

**Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.19 | 19.57 | 13.38 |
| Віцебск — | 6.07 | 19.49 | 13.42 |
| Магілёў — | 6.10 | 19.48 | 13.38 |
| Гомель — | 6.09 | 19.42 | 13.33 |
| Гродна — | 6.35 | 20.12 | 13.37 |
| Брэст — | 6.38 | 20.10 | 13.32 |

## Месяц

*Апошняя квадра 30 жніўня. Месяц у сузор'і Рака.*

## Імяніны

*Пр. Самуіла. К. Саламона, Сцяпана, Юльяна.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## Даты Падзеі Людзі

### 2 ВЕРАСНЯ

**У краіне**

**1893** год — беларускім этнографам, фалькларыстам і археолагам Е. Р. Раманавым і гісторыкам А. П. Сапуновым заснаваны Віцебскі царкоўна-археалагічны музей. Першыя экспанаты сабраны ў Віцебску. Папаўняўся знойдзенымі прадметамі і матэрыяламі археалагічных раскопак на Віцебшчыне. Найбольш каштоўнымі экспанатамі былі рукапісныя кнігі і дакументы, а таксама ўнікальная калекцыя твораў беларускіх мастакоў XVII—XVIII стст., узоры народнай разьбы па косці і дрэве, царкоўныя рэчы. Існаваў да 1919 г. Большасць экспанатаў была перададзена Віцебскаму губернскаму музею; сёння — Віцебскі абласны краязнаўчы музей.

**1945** год — у Беларусі пачалі дзейнічаць 22 адноўленыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, у якіх вучылася 5 тысяч студэнтаў, працавала больш за 600 выкладчыкаў.

**1946** год — нарадзіўся Рыгор Васілевіч Сакалоўскі, паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1989—1999 гг. быў галоўным рэдактарам газеты «Во славу Родины». Аўтар шэрага паэтычных зборнікаў.

**У свеце**

**911** год — князем Алегам падпісаны мірны дагавор паміж Візантыяй і Кіеўскай Руссю.



**1918** год — утвораны Рэўваенсавет Рэспублікі на чале з Л. Д. Троцкім. У той жа дзень галоўнакамандуючым усімі ўзброенымі сіламі РСФСР прызначаны Іакім Вацэціс.

**1926** год — нарадзіўся Яўген Лявонаў, савецкі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. З 1948 года выступаў на сцэнах Маскоўскага драматычнага тэатра імя К. Станіслаўскага і тэатра імя У. Маякоўскага, з 1972-га — у Маскоўскім тэатры імя Ленінскага камсамола (пазней — «Ленкам»). Праявіў сябе як драматычны і як камедыйны акцёр, па-майстэрску валодаў сродкамі гумару і сатыры. Сярод роляў: «Беларускі вакзал», «Джэнтльмены ўдачы», «Афоня», «Восеньскі марафон» і іншыя. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

**1935** год — нарадзіўся Валянцін Гафт, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, акцёр маскоўскага тэатра «Сучаснік», народны артыст РСФСР. Здымаўся ў фільмах: «Гараж», «Забойства на вуліцы Дантэ», «Злодзеі ў законе» і многіх іншых. Аўтар вершаў і эпіграм.

**1945** год — у Такійскай бухце на борце амерыканскага лінкара «Місуры» прадстаўнікі Японіі падпісалі афіцыйны акт аб безумоўнай капітуляцыі японскіх узброеных сіл. Дзень заканчэння Другой сусветнай вайны.

**Так гаварыў...**

**ГЕЛЬВЕЦЫЙ:**
*«Людзі не нараджаюцца, а становяцца тымі, хто яны ёсць».*

## УСМІХНЕМСЯ

Калі прыношу грыбы з лесу, заўсёды паказваю іх чайнаму грыбу ў слоіку, каб ён ведаў, які быў і да чаго лянота даводзіць!

**Калі вы стаіце побач з мангалам і кажаце чалавеку: «Перавярні!», «Палі вадой!», «Гэта не тое адцяне, смаж яшчэ!», «Колер павінен быць цямнейшы, яшчэ больш цёмны!» — вы арт-дырэктар шашлыку.**

Многія людзі ганарацца сваімі вельмі прыгожымі насамі.

Яны спецыяльна носяць маскі пад носам, каб не пазбаўляць навакольных магчымасці бачыць гэткую прыгажосць.

**Жанчына, пакутуючы, выношвае дзіця 9 месяцаў. Кожны год, усё дзяцінства, дзіця пакутуе ў школе 9 месяцаў. Выпадкова? Што гэта, калі не помста?**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр‑сп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2342.
Нумар падпісаны ў 19.30 1 верасня 2021 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12